№ 17 (423) 4 траўня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



**Хто пераможа ў год Сабакі**
2006-ты год спрыяе Каням і Сабакам. Астролягі: будзе год пераменаў.
старонка 12

**Справа Рыбакова**
Засакрэчаныя матэрыялы.
старонка 2

**Скарбы Відзібору**
Іван Кірчук адкрыў унікальныя сьпевы.
старонка 9

ЛЮСТРА ДЗЁН
**Пахаваньні ў Чалюскінцах**
Знойдзеныя парэшткі закапалі, каб не зрываць плянаў добраўпарадкаваньня. **Старонка 5.**

БІБЛІЯТЭКА
**Салодкая помста Югасі К.**
Францішак N. пра дэбютную кніжку Югасі Каляды «Галоўная памылка Афанасія». **Старонка 20.**

ПАЛІТЫКА
**Дэмакратычныя цнатліўцы**
Да апошняга часу каралевай Брытаніі магла стаць толькі жанчына, якая захавала цнатлівасьць да шлюбу... Юры Хадыка палемізуе з «Народнай воляй». **Старонка 16.**

З УСІХ СТАРОН
**Як гэта было ў Эквадоры**
Дэманстрацыі прымусілі прэзыдэнта пакінуць краіну. Якая роля ЗША ў падзеях? Аналіз Імануіла Валерстайна. **Старонка 10.**

СПОРТ
**«Віталюр» — чэмпіён**
Зьмена варты ў беларускім баскетболе. **Старонка 21.**

КУЛЬТУРА
**Залатыя часы трэшу**
Наша краіна — запаведнік адборнага сьмецьця. Трэш сёньня — ключавы беларускі стыль. **Старонка 8.**

# Пакрадзенае сьвята

«Савецкія войскі ўратавалі нас ад вынішчэньня, але прынесьлі нам несвабоду», — такая ацэнка 1945 году здаецца справядлівай Войцеху Ярузэльскаму. «Савецкая армія вызваліла Эстонію ад нацысцкай акупацыі, але пачалася новая акупацыя, наступствы якой — трагічныя для эстонскага народу», — кажа іншы вэтэран, прэзыдэнт Эстоніі Арнольд Руйтэль. 60-годзьдзе Перамогі — нагода для ўзіраньня ў гісторыю. Народы Цэнтральнай Эўропы выкарыстоўваюць яе, каб нагадаць: яны былі разьменнымі манэтамі ў гульні магутных суседзяў. Але гэта не павінна больш паўтарыцца. Акупацыі, войны, няволя — ніколі болей. І яны дабіліся ад ЗША і Эўропы павагі да свайго бачаньня гісторыі. Пуцін і Лукашэнка выкарыстоўваюць юбілей у прыватных палітычных мэтах. Адзін — для апраўданьня імпэрскіх прэтэнзій. Другі — каб узмацніць дыктатуру. А людзі ж не за дыктатуру ваявалі. Спэкулюючы Перамогай, палітыканы крадуць яе сэнс. Беларусь была кінутая Сталіным у пашчу нацыстам. У Расеі жыцьцё салдата не каштавала нічога. Той, хто хавае гэтую нязручную гістарычную праўду, нічога не навучыўся і нічога ня памятае.


PHOTO.BYMEDIA.NET

## РГА «Таварыства беларускай школы»

**запрашае бацькоў вучняў 8-х—10-х клясаў 12-гадовай сярэдняй школы (альбо 7-х—9-х клясаў 11-гадовае школы)** на цыкл канфэрэнцый і сустрэч з адміністрацыяй, выкладчыкамі, вучнямі й бацькамі вучняў зачыненага **Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю імя Якуба Коласа**, прысьвечаных наступным тэмам:

«Што дае й чаго не дае цяперашняя рэформа школы», «Як эфэктыўна падрыхтавацца й паступіць на вучобу ў беларускія і замежныя ўнівэрсытэты», «Як вучыцца й пасьпяхова здаваць іспыты па-беларуску», «Беларуская ліцэйская адукацыя ў мінулым і цяпер».

Сустрэчы будуць адбывацца ў **суботы** (7, 14, 21 і 28 траўня) — пачатак а 12-й, а таксама ў **чацьвяргі** 5 і 19 траўня — пачатак у 18.30 — у памяшканьні РГА «ТБМ імя Ф.Скарыны» (г.Менск, вул. Румянцава, 13, ст. мэтро «Плошча Перамогі»). Удзел у сустрэчах і канфэрэнцыях бясплатны. Расклад і тэматыка канфэрэнцый будуць пададзены асобна.

Кантактныя тэлефоны: (8-0172) 99-10-45 (увечары і ў выхадныя), мабільны: 704-62-10.

# «Жджом сыночкаў, усё жджом»

У пакоі Ўльляны Рыгораўны два ложкі. Адзін яе, другі — пусты. На ім — фота сына ва ўніформе. Чорнай стужкі няма, толькі бел-чырвона-белы сьцяжок намаляваны ў правым ніжнім кутку. 7 траўня спаўняецца шэсьць год з дня выкраданьня Юр'я Захаранкі. Рэпартаж з Васілевіч **Алеся Кудрыцкага**.

Васілевічы. Невялічкае палескае мястэчка — лічы, вёска. Драўляная хата ў канцы ціхай вуліцы. Шэры плот. На дрэвах ужо зьявіліся пырскі зялёнага лісьця.

У парослы травой дворык выходзіць маці Юр'я Захаранкі ў блакітным фартуху, у барвовай кофце, у чорнай хустцы з малюнкам ліловых лістоў. «Дзякуй, што вы прыехалі», — увесь час паўтарае яна невялічкай групе журналістаў, юрыстаў ды сваякоў іншых зьніклых, якія, як і штогод, прыехалі яе наведаць на праваслаўны Вялікдзень. «Вось, старая стала, з кіёчкам хаджу», — кажа 81-гадовая Ўльляна Рыгораўна, павольна падымаючыся па прыступках, і плача-плача. Ульляна Рыгораўна дагэтуль чакае сына.

Працяг на старонцы 3.

АД РЭДАКЦЫІ

# Прынцыповая спрэчка па антыбеларускім пытаньні

«Беларусы чытаюць на старонках «НН» такіх вось лёлікаў, у якіх публіцыстычны талент нават не начаваў, і разумеюць, што гэта ўжо даўно — ня наша, а «Іхняя Ніва» — газэтка салёных самазамілаваных асобаў, якія пасьлядоўна вядуць антыбеларускую справу пад брудным сьцягам блюзьнерства». Такі пасаж мог бы ўпрыгожыць шпальты газэты «Рэспубліка» ці «Ісьцінна праваслаўнай праўды». А зьявіўся ён у нью-ёрскім «Беларусе». Моцна гучыць рупар дыяспары, калі праз яго прамаўляе намесьнік старшыні Кансэрватыўна-хрысьціянскае партыі — БНФ Юры Беленькі!

«Становіцца ўсё больш відавочна, чаму антыбеларускі рэжым, задушыўшы значна больш ляяльныя да яго расейскамоўныя выданьні, дазваляе існаваць нібыта беларускай, нібыта апазыцыйнай газэце пад гістарычнай назвай «Наша Ніва», — падсумоўвае свой разлогі допіс намесьнік старшыні КХП-БНФ.

Так і ўяўляеш сабе, як кансэрватары ў патаемных купэ цягніка Менск—Варшава прабіраюцца да свайго лідэра, каб там паўшэптам спытацца: ну чаму ж, чаму гэты кляты рэжым дазваляе існаваць беларускай незалежнай газэце, калі ўвесь сьвет аплялі ўжо гэбоўскія шчупальцы?

Ю.Беленькі мог бы адтачыць свой аўтарскі мэтад дэдукцыі на наступным пытаньні: чаму антыбеларускі рэжым, закрыўшы сотню арганізацый і пару партый, што належаць да «псэўдаапазыцыі» (тэрмін ягоны), церпіць існаваньне КХП-БНФ? Пералік магчымых варыянтаў прашу прэзэнтаваць увазе дыяспарнага чытача ў 15-дзённы тэрмін.

Безнадзейны той палітык, які не разумее гумару. Не разумее Лёлікавых фэльетонаў.

Плыткі той палітык, які прэтэндуе на патрыятычную нішу, а пры тым слаба ведае нацыянальную гісторыю. «Як вядома, супраць слуцкіх паўстанцаў ніякія «чырвоныя беларусы» не ваявалі, такіх і ў прыродзе на той час не існавала, бальшавіцкі пераварот у нас рабілі чужаніцы», — піша Беленькі. Ігнаруючы Чарвякова з Кудзелькам і, мусіць, ня ведаючы, што й сам баранёны ім Балаховіч пэўны час ваяваў за чырвоных.

Ушкіну за ягоныя фэльетоны «могуць абарваць ня толькі вушы», — пагражае Ю.Беленькі. Слушная тактыка. Хто вязе, таго і сьцябай — далей даедзеш.

Ёсьць у нас кандыдаты на абрываньне «ня толькі вушэй» і больш заслужаныя за публіцыста «НН», і многія ведаюць гэтых правакатараў, зладзеяў, карумпаваных элемэнтаў. Але сілы КХП-БНФ ня досыць, каб дастаць іх, ну то бі сваіх, каб чужыя бачылі. Хто ня з намі, той супраць нас. Тлей, вайна беларусаў між сабою.

У «Нашай Ніве» друкуюцца анархіст Ушкін, сацыял-дэмакрат Сідарэвіч, хрысьціянскі дэмакрат Севярынец, я ўжо не кажу пра пераканаўчых дзьвюх соцень інтэлектуалаў без партыйнай прыналежнасьці. Іх яднаюць ідэалы свабоды, справядлівасьці, салідарнасьці. Ніхто з іх не прэтэндуе на манаполію на праўду. Яны розных думак, але суіснуюць у прасторы грамадзка-культурнага штотыднёвіка. І гэтая талерантнасьць мае свае карані ў культурнай традыцыі. Мне казаў неяк жывы клясык беларускае літаратуры, унук якога вучыцца ў Італіі: «Моцна спрачаемся мы з унукам наконт Ушкіна. Ён захапляецца, а я не магу прыняць такога. Пытаньне густу…»

Ю.Беленькі дэманструе іншы стыль спрэчкі — з напісаньнем імёнаў з малых літар і дадумкамі замест фактаў.

Затхласьць, якая непазьбежна ўзьнікае ў вузкай і замкнёнай групе — ці то эміграцкай суполцы, ці то ізаляваным палітычным коле, правакуе псыхапатычныя праявы. Іх узмацняе адчайнае жаданьне ўтрымацца ў публічным жыцьці. Нават калі дзеля гэтага прыходзіцца тапіць калегаў.

«Беларус» (Bielarus.org) засьведчыў сваю пазыцыю, друкуючы допіс Ю.Беленькага. Будзе расчараваньнем, калі ніхто з чытачоў гэтага знакамітага выданьня не адгукнецца на такі факт на старонках яго наступных нумароў.

А вось Рада БНР — яна адчувае маральны клопат і калектыўную волю, каб заўважаць такія выпады? Здатная яна адсочваць зьменлівую рэчаіснасьць ці ад яе чакаць выключна рытуальных віншаваньняў зь вялікімі сьвятамі?

Пытаньне не пра гонар «Нашай Нівы» і не пра пазнавальны стыль Ушкіна. Ушкін — гэта зьява сучаснага пісьменства, што б ні трызьніў Ю.Беленькі. Я пра большае — на такіх выпадках правяраецца стан беларускамоўнае супольнасьці. Ці ёсьць кантакт з рэчаіснасьцю, ці ёсьць крытычны працэс? Ці ўсё застыла ў зімовым сьне да лепшых часоў? Няма ж нічога больш шкоднага для бацькаўшчыны, чым абсурд, прыкрываны патрыятычнай дэмагогіяй.

Не вагаюся ставіць пытаньне менавіта так, не вагаюся страціць пару чытачоў тут ці там. Нават калі цаною гэтага будзе крыўда безумоўна адданага Беларусі кола кансэрватараў.

Ня толькі ў апазыцыі да лукашэнкаўцаў — здаецца, тупіковай лініі ў беларускай палітычнай традыцыі, — але і ў апазыцыі да той ксэнафобнай, эксклюзіўнай, інтэлектуальна лысай беларускасьці, прыклад якой даў у «Беларусе» лідэр кансэрватыўнага крыла БНФ, бачыцца адзіная пэрспэктыўная лінія развіцьця беларускага палітыкуму і соцыюму.

Мы ніколі не дасягнём палітычных зьменаў і пагатоў не даможамся гістарычнай справядлівасьці ў дачыненьні да беларускай мовы, пакуль беларускасьць будзе асацыявацца з бышцам бы арыстакратычнымі, а на справе — псыхапатычнымі схемамі, якія выявіла «крытыка Ушкіна».

Адкрытая, інклюзіўная беларуская культура біз комплексаў і табу прываблівае моладзь. Яна падабаецца сярэдняй клясе, што нараджаецца. Яна ж выклікае зацікаўленьне сьвету. І такая самая палітыка. Гэта натуральны выбар.

**Андрэй Дынько**

# Справа Рыбакова

Чаму матэрыялы крымінальнай справы Ягора Рыбакова былі засакрэчаныя, а іх разгляд у Вярхоўным судзе адбываўся за зачыненымі дзьвярамі? Адказ — у зьмесьце гэтых матэрыялаў. Журналісту Сяргею Сацуку ўдалося пазнаёміцца зь імі. Яны выяўляюць мэханізмы ўзбагачэньня вышэйшага кола чыноўнікаў. Норавы, якія пануюць сярод іх. А таксама мэханізмы фінансаваньня рупараў улады. Мы перадрукоўваем гэты артыкул з «БДГ. Для служебного пользования».

## Пачатак

Пра тое, што Рыбакоў бярэ «адкаты» са зьдзелак, ведалі многія. Галоўны тэлевізіёншчык краіны нават не спрабаваў гэтага ўтойваць. Рыбакоў пачаў свой «бізнэс», яшчэ не абжыўшыся як сьлед у новым крэсьле, калі быў в.а. старшыні НДТРК, 15 чэрвеня 2001 г. У той дзень у кампаніі адбывалася пасяджэньне тэндэрнай камісіі на пастаўку абсталяваньня для нелінейнага мантажу для карэспандэнцкага пункту БТ у Маскве. Напярэдадні пасяджэньня Рыбакоў сустрэўся з дырэктарам ВПУП «Валідыя» Сяргеем Ганчаровым і адкрыта прапанаваў яму выйграць конкурс пры ўмове 10% «адкату» ад кошту зьдзелкі. Умовы джэнтэльмэнскага пагадненьня былі прынятыя, і тэндэр выйграла фірма «Валідыя», якая абавязалася прадаць патрэбнае абсталяваньне за 62 973 даляры на ўмовах аплаты па факце пастаўкі. Рыбакоў асабіста ўзяў удзел у пасяджэньні камісіі, забясьпечыўшы патрэбны вынік для прыватнага прадпрыемства і камісійныя для сябе.

Ганчароў таксама ня лыкам быў шыты. Каб ня траціць грошы на 10-працэнтным «адкаце», ён уключыў яго у кошт абсталяваньня і крыху прыбавіў. Такім чынам, праз дзесяць дзён пасьля элегантнай перамогі прадпрыемства «Валідыя» на тэндэры в.а. старшыні НДТРК падпісаў зь фірмай дагавор №127, паводле ўмоў якога абсталяваньне пастаўлялася ўжо па цане 128 263 740 рублёў (93 283 даляры).

Працяг на старонцы 11.

ІНІЦЫЯТЫВА

## 14 мая — Дзень роднай культуры

Кожная нацыя шануе сваю культуру, мову, гісторыю. А беларусаў суседзі акупавалі і ўводзілі ім сваю мову, насаджалі сваю культуру. І менавіта праз гэта мы дайшлі да занядбаньня сваёй мовы і нават перапісваем гісторыю. Колькі гэта будзе працягвацца?

Ня ў нашых сілах прымаць законы, але ў нашых сілах сказаць «Так» роднай культуры й мове.

Мы ня кажам, што трэба нешта зачыняць ці зьнішчаць, а карыстаемся прынцыпам: «Любіш сваё, зразумей і чужое. Любіш чужое, шануй і сваё» (Л.Вольскі).

14 мая пройдзе Рэспубліканскі дзень роднай культуры. У гэты дзень мы просім вас размаўляць на беларускай мове, няважна якой якасьці будзе гутарка — нават трасянка. Галоўнае, што Вы паспрабуеце. Таксама просім у гэты дзень наведаць які-небудзь беларускі тэатар, канцэрт ці вечарыну.

**Віталь Дабранач**

Кантакты: www.voka.tk voka@date.by, Моладзевая ініцыятыва «Вока» (Менск), ЗТМН «Замкавая гара» (Наваградак), моладзевы цэнтар «Гарт» (Гомель), моладзевы цэнтар «Дзедзіч» (Берасьце).

## Падпіска на «Arche»

Самы дэфіцытны беларускі часопіс, якога няма ў ніводнай дзяржаўнай кнігарні, можна гарантавана атрымліваць поштай. Падпісны індэкс 00345. Кошт падпіскі на месяц 3440 рублёў для прыватных асобаў і 12 271 рублёў для арганізацыяў.

## «Наша Ніва» шукае

**вярстальніка** (-цу) для працы на поўную стаўку. Зьвесткі пра сябе падаваць на e-mail: nn@promedia.by.

ГАЗЭТНЫ ШАПІК

## Новае эсэ Федарэнкі


ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Новым эсэ выбухнуў Андрэй Федарэнка. Яно апавядае пра ягонае трансэўрапейскае падарожжа. Твор — рэдкі выпадак для холдынгу — унікнуў, здаецца, цэнзуры. Праз гэта слаба адрэдагаване, але памылкі ў імёнах і назвах даруеш дзеля асалоды ад вольнасьці думкі і вастрыні пераживаньня рэчаіснасьці. «Terra incognita» — у «ЛіМе» ад 29 красавіка.

# Газэта беларускага сэрца


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

«Рэгіянальная газета» адсьвяткавала дзесяцігодзьдзе. Гэта адно з найтыражнейшых выданьняў, што яднае ў адзіную інфармацыйную прастору колішнюю Віленшчыну — самае сэрца краіны. Рэгіён, што крыху вышэй ды ўлева ад страўніка-Менску. «Да выхаду нашай газеты не было выданьня, якое б лічыў сваім смургонец і мядзелец, астраўчанін і маладзечанец аднолькава», — кажа галоўны рэдактар Аляксандар Манцэвіч **(на фота)**. Наклад «РГ» сягае дзесяці тысячаў. Газэта цалкам самаакупная. Гэта адзінае беларускамоўнае выданьне, якое стала прадаюць у электрычках.

«РГ» крыху старэйшая за рэфэрэндум 1995 году. Яе першы нумар выйшаў пры канцы красавіка. Але госьці, запрошаныя на дзень народзінаў, віталі калектыў «Рэгіяналкі» з... трыццацігодзьдзем: «цяпер як на вайне — год ідзе за тры». Асабліва летась, калі «РГ» зазнала выкраданьне кампутараў і прыпыненьне выхаду на тры месяцы. Але чытачы і падпісчыкі ня кінулі сваю газэту. «Нікому з калегаў не жадаю ўдаць у такі спосаб пераконвацца ў чытацкай любові», — усьміхаецца А.Манцэвіч.

Калектыў «НН» шчыра вітае калегаў з «Рэгіянальнай газэты» са сьвятам і жадае газэце беларускага сэрца ня знаць хваробаў і стомы.

**АС**

# «Жджом сыночкаў, усё жджом»

Працяг са старонкі 1.

У хаце падлога ды мэбля засланая стракатымі кілімчыкамі, паўсюль безьліч чырвоных ды аранжавых штучных кветак. «У нас жа сем магілаў, на кожную трэба адвезьці», — кажа яна і запрашае да стала. «Стулікі стаўляйтэ, а на бухвеце чарачкі». Цярэбіць рукамі чыстую насовачку, ды прыкладае яе да губ. «Жыву я адным днём. Перажываньне такое — вось паспрабуй. Адзін сын ляжыць у магіле, другога няма. Я ж іх глядзела, расьціла, памагала ім усю жызьнь, колькі жыла. Жджом сыночкаў, усё жджом».

«Калі Юра — на парог і я гляну, у мяне сэрца адразу разарвецца, — гаворыць яна. — Колькі я выплакала… Ён заўсёды пастукае ў акно, і я ведаю, што гэта Юраў стук. А цяпер ня стукае… Гляджу на фатаграфіі ды плачу. У кожнай сям'і сваё гора. Трэба жыць як набяжыць».

Пакой Юр'я Захаранкі зусім маленечкі — ложак стаіць акурат ад сьцяны да сьцяны, толькі аднаму чалавеку і легчы. Партрэты, фота, паштоўкі, юбілейныя міліцэйскія вымпэлы, яшчэ бел-чырвона-белыя. «Юра прыяжджае — кажа: я ў мамы аддыхаю. Яна мне і зварыць, і пасьцельку пасьцеле».

У пакоі Ўльляны Рыгораўны два ложкі. Адзін яе, другі — пусты. На ім — фота сына ва ўніформе. Чорнай стужкі няма, толькі бел-чырвона-белы сьцяжок намаляваны ў правым ніжнім кутку.

## Пра вайну

Хустачка Ўльляны Рыгораўны зьбіваецца назад, а пад ёй — белая каса, закручаная вакол галавы. Ульляна Рыгораўна сьпешна папраўляецца. «У мяне косы былі чорныя, як галка, віліся!» Цяпер яны ўжо зусім сівыя зрабіліся.

Муж Ульляны Рыгораўны ўжо 27 год як памёр. Таксама быў у Нямеччыне, у канцлягеры. Зусім хворы дадому вярнуўся. На сьцяне — фота брата Ўльляны Рыгораўны, Васіля Рыгоравіча Лазарэнкі, з залатой зоркай на грудзях. «Прыйшоў з хронту, сільна ранены, героя атрымаў на вайне пад Ленінградам. Танкістам працаваў, ногі перабітыя. Ехаў на матацыкле — сэрца спынілася. Два вякі ніхто не жыве, усе паміраюць».

Саму Ўльляну Рыгораўну на пачатку 1942 г. угналі ў Нямеччыну. Там яна працавала ў рэстаране ў Кёльне. «Гора і страху хапіла. Ну, рабілі, а што зробіш?» Бязьдзетная гаспадыня казала маладой Ульляне: «Вось вайна скончыцца, мы з табой паедзем да цябе дадому, а потым вернемся, ты будзеш у мяне наследніца». А тая кажа: «Не, я тут жыць ня буду. Толькі дамоў».

А потым у часе авіяналёту на Кёльн бомбамі забіла і гаспадыню, і гаспадара, і афіцыянта, і ўкраінку, якая таксама там працавала. Ульляна Рыгораўна выжыла, бо пайшла па ваду. «Пачалі шукаць. Хазяйку я пазнала — у клетачку паліто сьветлае, а ў Марыйкі было цёмна-сіняе з хлясьцікам. На трупы нельга было паглядаць. Галава расплескана, як достачка. Столькі там нэрваў вытрацілі, столькі выплакалі…»

А потым Ульляна Рыгораўна трапіла ў лягер, дзе выраблялі дрот. Там яна і пазнаёмілася з будучым мужам. «Мы езьдзілі зь Юрам туды ў 1991 гаду, былі ў тых мясьцінах, немцы запрасілі, — апавядае яна. — Там былі яшчэ палякі, украінцы — 60 чалавек, што ўгналі».

## Пра надзею

Вольга Завадзкая, маці Дзьмітрыя, кажа: «Матчына сэрца хоць і плача, і баліць, але яно самае надзейнае ў чаканьні ды пакутах». «Я думаю, што яны



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**«Я ДУМАЮ, ЯНЫ ЖЫВЫЯ».** Ульляна Захаранка.

жывыя. Людзі мне без канца так кажуць», — уздыхае Ўльляна Рыгораўна. «А я таксама так думаю, — ківае Зінаіда Ганчар. — Трэба ж камусьці так думаць. А то журналісты пішуць ужо пра іх як пра памерлых».

«Я надзеюся, што я Юры дажду. Можа, іх куды пазвозілі. Я ўсё думаю, што ён жывы. Ну і ва Ўкраіне дачка сястры езьдзіла да варажэянкі. Іншая жанчына варажыла, і ёй сказалі: ты прыедзеш дамоў, а твой сын будзе мёртвы. І так было. А на Юру — «жывы-жывы», сказалі. А праўда гэта ці крыўда…» — апускае галаву Ўльляна Рыгораўна.

## Пра сяброў ды ўладу

Яўген Захаранка, хрэсьнік Ульляны Рыгораўны, кажа: «Хто быў тады сябрам, тыя і цяпер сябры. А хто прышвартаваўся да генэральскіх лямпасаў…» «Сюды часта былыя прыяжджаюць, ваенныя, кажуць, мы зь Юрам вельмі знаёмыя, Юра вельмі харошы, — расказвае Ўльляна Рыгораўна. — Нікога ня ўбіў, ні ў кога ня ўкраў, такі быў трудзяшчы, ён і за плугам ходзе, ён і дровы коле, ён і двор падмятае, і грубку ўмее паліць, усё ўмее… Яны прастыя хлопцы, гэта не гарадзкія».

Віншавальная капэрта-трохкутнік з копіяй прэзыдэнцкага подпісу да Ўльляны Рыгораўны яшчэ не дайшла. «А клопату? Мне іх паздраўленьні… Галоўнае, каб сказалі, куды дзелі сыночка».

«Пабачце — анучкамі папрыкрывала стулікі старыя, так і жыву. Юра кажа: «Мама, я абшыю дом, а потым прыедуць, праверуць, скажуць: міністар накраў. Не хачу я. Буду бедны, як усе». А той выступаў першы раз: «Абакраў МВД!» Штоб над табой вароны каркалі…»

Аднак іншага разу Ўльляне Рыгораўне думаецца: «Здаецца, як паехаць бы ў той Крэмль, расказаць яму ўсё, так ён і памякчэў бы».

На сьцяне ў пакоі — чорнабелы фотапартрэт Юр'я Захаранкі. Знаёмыя рысы твару, тая ж лёгкая ўсьмешка, якая на здымках Юр'я схаваная ў вусах. Пад партрэтам — гадзіньнік. Сэкундная стрэлка паволі паўзе па крузе, рух мінутнай незаўважны, а гадзінная, здаецца, нерухома стаіць на месцы. Хаця з моманту зьнікненьня Юр'я Захаранкі яна прагарнулася ўжо больш за чатыры тысячы разоў.

## СЬЦІСЛА

### Віялянчэль Гварнэры ў Горадні

У Горадні знойдзена віялянчэль «Сьвятая Тэрэза» работы прадстаўніка знакамітай італьянскай сям'і. Лічылася, што віялянчэль згубілася ў XIX ст. Экспэрт аўстрыйскага аўкцыённага дому *Dorotheum* Янаш Барбароса па фатаздымках пацьвердзіў, што віялянчэль, якой карыстаўся адзін з удзельнікаў гарадзенскага музычнага калектыву, належала Джавані Гварнэры. На корпусе ёсьць адпаведны надпіс і год вырабу, 1730.

### Помнік Ворліку ў Касуце

27 красавіка ў Вялейцы з нагоды 295-х угодкаў украінскай Канстытуцыі (1710) прайшлі гістарычныя чытаньні «Вялейская зямля — калыска аўтара першай украінскай Канстытуцыі гетмана Піліпа Ворліка». На чытаньнях слухалі даклады айчынных і ўкраінскіх гісторыкаў. Зь вітаньнем выступіў дарадца пасла Ўкраіны сп.Казлоўскі. У часе чытаньняў паведамілі, што да 2007 г. у Касуце (Вялейшчына), на Ворлікавай радзіме, паставяць помнік.

### Свае расстрэльвалі сваіх

У гады Другой сусьветнай вайны 954 тыс. савецкіх вайскоўцаў былі расстраляныя сваімі па абвінавачаньні ў баязьлівасьці й за розныя праступкі — заявіў прэзыдэнт Міжнароднага фонду «Дэмакратыя», акадэмік Аляксандар Якаўлеў. Расстрэлы былі зьвыклай рэччу. «Я прыехаў на фронт, а там камісар батальёну інструктуе: калі вы кажаце «ў атаку», а яны не ўстаюць — выстралі ў любога, забі — і тут жа падымуцца».

### А.Руйтэль: мяне павінны зразумець

Прэзыдэнты Эстоніі і Літвы адмовіліся ехаць на 60-годзьдзе Перамогі ў Маскву. Кіраўнік Эстоніі Арнольд Руйтэль у інтэрвію BBC патлумачыў пазыцыю: «Так, савецкая армія вызваліла Эстонію ад нацысцкай акупацыі, але пачалася новая акупацыя, наступствы якой — вельмі трагічныя для эстонскага народу. Мы страцілі кожнага пятага-шостага». «Калі расейскі народ будзе ведаць усю гістарычную праўду, ён мяне зразумее», — мяркуе прэзыдэнт краіны. Эўракамісар Гюнтэр Фэргойген таксама заклікаў Маскву папрасіць прабачэньня за акупацыю Балтыі.

### Юшчанка супраць двайных стандартаў

8 траўня падчас сустрэчы ў Маскве на саміце СНД з прэзыдэнтам Беларусі Віктар Юшчанка абмяркуе інцыдэнт з затрыманымі 26 красавіка ў Менску грамадзянамі Ўкраіны. Пра гэта ён заявіў у сераду ў Сімфэрополі. «Я не хацеў бы, каб інцыдэнт зьмяніў нашы стасункі з братнім беларускім народам», — зазначыў В.Юшчанка, але зьвярнуў увагу на факт двайных стандартаў у дачыненьні да затрыманых грамадзян Расеі і Ўкраіны. Тым часам Адміністрацыя беларускага прэзыдэнта заявіла, што ніякай сустрэчы Юшчанкі і Лукашэнкі 8 траўня «пакуль не плянуецца».

### Другая ліквідацыя «філяматаў»

4 траўня Вярхоўны суд прыняў рашэньне аб закрыцьці «Таварыства філяматаў». Пазоў падаў Міністэрства юстыцыі. «Філяматам» паставілі ў віну тое, што летась і залетась яны бралі ўдзел у міжнародных канфэрэнцыях, прысьвечаных працэсу эўраінтэграцыі і пэрспэктывам Беларусі ў аб'яднанай Эўропе. Гэта выходзіць за межы гістарычнай навукі і таму «супярэчыць статуту арганізацыі». Першых філяматаў разагналі ў 1823 г. цар.

### Паспрачаемся з Канадай

За права выхаду ў Сусьветную групу тэнісната Кубку Дэвіса супернікам зборнай Беларусі будзе каманда Канады. Матчы пройдуць 23—25 верасьня за акіянам. Усе патэнцыйныя супернікі беларусаў маюць славянскія прозьвішчы: Фрэнк Данцэвіч, Эндру Пятроўскі, Дэніэл Нестар, Пітэр Палянскі, Эрык Хвойка, П'ер Дзюкло-Людовіч.

### Стаўка паніжана

З 5 траўня на адзін працэнтны пункт панізілася стаўка рэфінансаваньня Нацбанку, да 14% гадавых. З пачатку году гэта трэцяе паніжэньне стаўкі.

**АГ, СМ; proua.com, interfax.by**

# «Рэвалюцыя — гэта вельмі простая рэч»

Адзін з былых лідэраў польскай «Салідарнасьці» даў беларускім журналістам урок на тэму палітычнага аптымізму. Піша **Віталь Тарас**.



Вышэйшая школа гуманітарных навук і журналістыкі ў Познані — адзін з найлепшых сымбаляў зьмен, што адбываюцца ў Польшчы. Па далучэньні да Эўразьвязу польская эканоміка пачуваецца ўсё больш упэўнена. Засьцярогі, што тутэйшая сельская гаспадарка ня вытрымае канкурэнцыі з Эўропай, засталіся марныя — якасьць прадукцыі польскіх фэрмэраў зрабіла многія мясныя прадукты папулярнымі ва ўсёй новай Эўропе.

Колькасьць вельмі багатых людзей, якая імкліва расла ў апошнія 10—15 гадоў, пачала ператварацца ў якасьць. У Познані, славутай на ўвесь сьвет ашчаднасьцю і нямецкай прагматычнасьцю, знайшоўся мэцэнат, які вылучыў немалыя грошы на пабудову школы гуманітарных навук.

Дарэчы, наведнікі зь Беларусі адразу зьвярнулі ўвагу на росьпіс інтэр’ераў у школе — у выглядзе характэрных палос, знаёмы стыль... Сапраўды, інтэр’ер расьпісваў Лёнік Тарасэвіч — адзін з найбольш папулярных мастакоў сучаснай Польшчы.

Школа прыватная, і таму за навучаньне трэба плаціць. Аднак прафэсія журналіста карыстаецца попытам, а значыць, гарантуе кавалак хлеба тым, хто ёй сёньня навучаецца. Нягледзячы на тое што журналістыка выкладаецца і ў дзяржаўных унівэрсытэтах — у тым ліку ў Познанскім імя Міцкевіча, — «крызісу перавытворчасьці» журналістаў у Польшчы няма.

## Помнікі стагодзьдзя

І яшчэ некалькі слоў пра сымбалі. Усяго за нейкую сотню мэтраў ад школы журналістаў — Цытадэль, дзе пахаваныя жаўнеры дзьвюх сусьветных войнаў: польскія, брытанскія, савецкія, а таксама мірныя жыхары — ахвяры гітлераўскага генацыду. Пахаваныя тут і некалькі юнакоў-пазнанякаў, якія са зброяй у руках выступілі супраць савецкіх акупантаў у 1946-м… Усе магілы, у тым ліку і зь пяціканцовымі зоркамі на помніках, аднолькава добра дагледжаны.

А прыкладна за кілямэтар стаіць помнік змагарам з камунізмам. У самым цэнтры гораду высяцца манумэнтальныя крыжы ў памяць аб выступленьні рабочых Познані ў 1956-м — адным зь першых падобных пратэстаў пасьля вайны. Пратэст тады быў крывава падаўлены.

## Мытнік-падпольшчык

У верасьні будзе адзначацца 25 гадоў утварэньня руху «Салідарнасьць», які страйкамі ды масавымі акцыямі пратэсту вымусіў камуністычны ўрад сесьці за стол перамоў. Перамовы праз год былі прыпыненыя ўвядзеньнем ваеннага становішча, а лідэры руху былі арыштаваныя. Але яшчэ амаль год у падпольлі дзейнічала «Змагарная Салідарнасьць», якую ўзначальваў адзін з самых маладых на той час прафсаюзных актывістаў — Зьбігнеў Буяк. У адрозьненьне ад Валэнсы, ён пачынаў электрыкам на варшаўскім «Урсусе», дзе вырабляюць трактары. Схоплены ўвесну 1986-га, правёў у турме тры месяцы. Як ён сам потым сказаў, «гэта было ўсяго імгненьне…».

З Буякам давялося спаткацца ўдзельнікам канфэрэнцыі «Журналісты па-за ізаляцыяй», што прайшла нядаўна ў Познані ў Вышэйшай школе журналістыкі.

З выгляду былы прафсаюзны актывіст-падпольшчык нагадвае звычайнага прафэсара або чыноўніка. Некалькі гадоў таму Буяк пэўны час узначальваў Мытны камітэт Польшчы, распрацоўваў новую канцэпцыю дзейнасьці гэтага ведамства, якая б адпавядала прынцыпам вольнай рынкавай эканомікі Эўразьвязу. А гэтым прынцыпам, як выявілася, даволі цяжка нават дагэтуль прабіваць сабе шлях у Польшчы зь яе рэцыдывамі сацыялістычнай сьвядомасьці. Тэме пераадоленьня спадчыны таталітарызму быў прысьвечаны і даклад Буяка, зроблены ў акадэмічнай манеры.

## За тры месяцы да рэвалюцыі

Аднак найбольш цікавай падалася эмацыйная рэакцыя былога лідэра «Салідарнасьці» на выступы беларускіх журналістаў, якія спрабавалі пазнаёміць польскіх калег з сытуацыяй са свабодай слова ў краіне. Аб тым, што беларускія й польскія журналісты жывуць ня толькі ў дзьвюх розных краінах, але і ў розных эпохах, сьведчыла рэакцыя палякаў на прапагандысцкі фільм БТ. Кадры, на якіх выявы дзеячаў апазыцыі чаргуюцца з кадрамі штаб-кватэры ЦРУ або з друкарскім станком, зь якога выходзяць сьвежанадрукаваныя даляры, і дыктарскі тэкст выклікалі ў польскіх калег паракcізмы сьмеху. Іншым разам яны літаральна падалі з крэслаў ад рогату.

Кожны зь беларускіх журналістаў гаварыў пра нейкую канкрэтную сытуацыю ў канкрэтным сэктары ці пра лёс асобных СМІ, асабліва не кранаючы палітычнай сытуацыі ў краіне, агульная карціна вымалёўвалася даволі змрочная. Гэты пэсымістычны настрой, які адчуваўся нават у дробязях, адчуў Буяк. Ён выступіў з кароткай, але энэргічнай прамовай.

Буяк перш за ўсё нагадаў, што нешта падобнае разам са сваімі калегамі з «Салідарнасьці» чуў некалі ад сяброў «Хартыі-77» на чале з В.Гаўлам у Празе… за тры месяцы да «аксамітнай рэвалюцыі». Хартысты тады захапляліся посьпехам «Салідарнасьці» на першых вольных выбарах у Польшчы, але казалі, что ў Чэхаславакіі падобнае будзе немагчымым яшчэ гадоў пяцьдзясят. Што чэскі народ абалванены камуністычнай прапагандай і дзесяцігодзьдзямі маны. Што выбарцы ахопленыя апатыяй і не давяраюць апазыцыі. Што апазыцыя раздробленая, а яе лідэры ня могуць паразумецца паміж сабой з прычыны асабістых амбіцый і карысьлівых памкненьняў. Што інтэлігэнцыя забылася на сваю высакародную місію й займаецца прыстасаванствам. Што моладзь у масе сваёй марыць толькі аб тым, каб зьехаць за мяжу.

А галоўнае — што грамадзтва на ўсіх узроўнях паралізаванае страхам…




WWW.AGENCEVU.COM

**ЗЬБІГНЕЎ БУЯК (справа) зь Лехам Валэнсам і Віктарам Юшчанкам у Кіеве, падчас Аранжавай рэвалюцыі.**

## Альтэрнатыўны цэнтар

Паводле слоў Буяка, для яго і ягоных паплечнікаў было відавочна, што сытуацыя ў Чэхіі зьмянілася ў параўнаньні зь нядаўнім мінулым: людзі на вуліцах паводзілі сябе інакш, чым раней, пачалі менш баяцца паліцыі і ўладаў. І самае дзіўнае — калі чэскім дысыдэнтам пра гэта гаварылі, яны згаджаліся з тым, што зьмены сапраўды адбываюцца, але… не маглі ці не хацелі ў гэтыя зьмены паверыць.

Рэвалюцыя, паводле Буяка, — гэта вельмі простая рэч. Гэта паказалі падзеі ў ПНР і ЧССР у 1989-м ці нядаўнія падзеі ў Грузіі ці Кыргызстане, дзе ўсе ўладныя структуры абрынулася літаральна ў лічаныя гадзіны. Але ж асабліва паказальнымі й важнымі для разуменьня Буяк лічыць апошнія падзеі менавіта ва Ўкраіне. Бо адной толькі зьмены настрояў у грамадзтве (а яны могуць адбыцца спантанна, цалкам незалежна ад памкненьняў улады ці апазыцыі) недастаткова. Важна, каб існаваў моцны альтэрнатыўны цэнтар, вакол якога ў вырашальны момант маглі б згуртавацца рэвалюцыйныя сілы і на бок якога мог бы перайсьці бюракратычны апарат, у тым ліку сілавыя структуры. Ролю такога цэнтру ва Ўкраіне відавочна адыграў выбарчы штаб Юшчанкі. Калі такога цэнтру няма альбо іх некалькі, ілавым структурам значна цяжэй вызначыцца — на чыім яны баку. Канечне, на думку Буяка, і ў гэтым выпадку дэмакратыя ўсё адно здольная перамагчы, але працэс будзе значна больш марудным.

## Зразумець беларускае грамадзтва

Аднак калі самі па сабе рэвалюцыі адбываюцца імкліва, высьпяваць яны могуць гадамі. І тут агромністая роля, на думку Буяка, належыць незалежнай прэсе і слову праўды, якое здольны несьці ва ўмовах недэмакратычнага рэжыму толькі журналісты. Ня трэба думаць, што калі сёньня ў незалежных ці падпольных газэт няма масавых накладаў, значыць справа безнадзейная.

Падпольная газэта, якую выпускаў незалежны прафсаюз «Урсусу» за камуністычным часам і рэдагаваньнем якой дагэтуль ганарыцца Буяк, ніколі ня мела вялікіх накладаў. Але калі ўзьнікла рэвалюцыйная сытуацыя ў 1980-м, наклады імгненна ўзрасьлі ў тысячы разоў. Акрамя таго, чытачы прывыклі давяраць сваёй газэце, і менавіта ў яе рэдакцыю яны прыйшлі й запыталі — што рабіць далей?

Зразумела, што сытуацыя ў Беларусі вельмі адрозьніваецца ад той, што была ў Польшчы ў 1980-я гады. Але ж задача прэсы менавіта ў тым і палягае, каб спрабаваць зразумець тое грамадзтва, у якім яна існуе. Асэнсоўваць, якія тэндэнцыі ў ім дамінуюць, на якія страты яно дзеліцца? Ці хаця б хто складае чытацкую аўдыторыю, чаго хочуць чытачы, на што спадзяюцца, чаго чакаюць? Дзякуючы веданьню рэальнага стану рэчаў, чаго не было ва ўладаў зь іх спэцслужбамі, у свой час «Салідарнасьць» змагла выпрацаваць стратэгію дзеяньняў і ўрэшце перамагчы.

Ці здольныя беларускія журналісты, у тым ліку й незалежных СМІ, адказаць на падобныя пытаньні? Ці ставяць яны ўвогуле перад сабой падобныя задачы?.. Не спрабаваць быць калектыўным прапагандыстам і арганізатарам перамог апазыцыі, а — для пачатку — паспрабаваць зразумець, што ж сабой уяўляе беларускае грамадзтва. Значна прасьцей пісаць аб рэпрэсіях уладаў, адзначаць перастаноўкі на яе вяршынях альбо апісваць бясконцае перацягваньне канату паміж дзеячамі апазыцыі, пераказваць меркаваньні расейскіх і заходніх палітолягаў аб тым, што адбываецца ў Беларусі.

Ніхто не ўступіў у спрэчку з З.Буякам. Не таму што ягоныя выказваньні ня выклікалі ні ў кога эмацыйнага водгуку. І не таму што яны гучалі рытарычна (на жаль, сёньня гэта ня так). А таму што беларускім журналістам не было чым адказаць. Пакуль не было…

Рэвалюцыі адбываюцца імкліва, а высьпяваць яны могуць гадамі.

Адной зьмены настрояў у грамадзтве для рэвалюцыі недастаткова. Важна, каб існаваў моцны альтэрнатыўны цэнтар, вакол якога ў вырашальны момант маглі б згуртавацца рэвалюцыйныя сілы і на бок якога мог бы перайсьці бюракратычны апарат і сілавыя структуры.



CZAT.GAZETA.PL

ЗЬБІГНЕЎ БУЯК (нар. 29 лістапада 1954 г. у Лапушне, Сьвентакшыскае ваяводства) — сузаснавальнік «Салідарнасьці». Дзеяч падпольля, у 1986 г. быў арыштаваны на тры месяцы. Удзельнік круглага стала «Салідарнасьці», прадстаўнік камуністычных уладаў Польшчы, ад 1992 — віцэ-прэзыдэнт Уніі Працы; у 1990—1991 — прэзыдэнт Фундацыі імя Сьцяпана Батуры. Суаўтар кнігі «Прабачце за «Салідарнасьць». У 1999—2001 г. узначальваў мытны камітэт краіны.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Варвашэні, 8 будзе бараніцца

ЖРЭА Савецкага раёну Менску прапанавала Партыі БНФ і ГА «БНФ «Адраджэньне» «добраахвотна ва ўстаноўленым парадку» пакінуць да 15 траўня памяшканьне па вул.Варвашэні, 8. Калі БНФ ня выедзе сам, ЖРЭА пагражае зьвярнуцца ў гаспадарчы суд і арганізаваць прымусовае высяленьне.

БНФ арандуе сядзібу з 1992 г. Апошні раз дамова пра арэнду памяшканьня была падпісаная ў 2002 г. і з таго часу абнаўлялася, апошін раз на пачатку году. Але цяпер камунальныя службы лічаць неабходным разьмясьціць тут «дзяржаўныя службы», у аднабаковым парадку скасаваўшы дамову арэнды.

ПБНФ суду не баіцца і зьбіраецца бараніцца да апошняга. Яна мяркуе арганізаваць грамадзкі пратэст, узяўшы за ўзор аналягічную сытуацыю з ГА «Таварыства беларускай мовы». Увосень 2003 г. ТБМ пагражала высяленьне, і збор подпісаў па ўсёй краіне дазволіў арганізацыі выстаяць. Сядзіба на Варвашэні — месца знакавае: гістарычнае ня толькі для партыі, але і для ўсяго грамадзіва, таму В.Івашкевіч спадзяецца на масавую падтрымку грамадзкасьці.

**АШ**

# У парку Чалюскінцаў закапалі парэшткі

У сталічным парку Чалюскінцаў пры пракладцы кабэлю знайшлі людзкія пахаваньні. Аднак парэшткі закапалі, каб не зрываць плянаў добраўпарадкаваньня.




Месца, дзе былі знойдзеныя парэшткі.
Станцыя мэтро «Парк Чалюскінцаў».
Помнік на брацкай магіле ваеннапалонных.
Дзіцячая чыгунка.

Паводле слоў выканаўчага дырэктара МГА «Гісторыка» Зьмітра Рагачова, чалавечыя косткі былі знойдзены за 20—30 мэтраў ад брацкай магілы савецкіх салдатаў. У парку ляжаць ахвяры і сталінскага, і гітлераўскага рэжымаў. Аднак разьбіраціца, чыё гэта пахаваньне, ніхто ня стаў.

МГА «Гісторыка» зьвярнулася ва ўпраўленьне па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры. Але супрацоўніца ўпраўленьня Натальля Хвір растлумачыла, што, хоць парк Чалюскінцаў і зьяўляецца гісторыка-культурнай каштоўнасьцю 3-й катэгорыі, пахаваньнем яны апекавацца ня могуць: «Ёсьць упраўленьне па ўшанаваньні памяці пры Міністэрстве абароны, ёсьць інспэкцыя Менгарвыканкаму па ахове гісторыка-культурнай спадчыны. Я парэкамэндавала зьвярнуцца туды і нават сама тэлефанавала ў Міністэрства абароны. Мне сказалі, што павінен быць афіцыйны зварот ад той будаўнічай арганізацыі, якая знайшла пахаваньне».

Начальнік упраўленьня па ўшанаваньні памяці пры Мінабароны палкоўнік Віктар Шумскі заявіў нам: «Выпадак надзвычайны, таму будзем неадкладна разьбірацца».

Тым часам некалькі дзён работнікі марна чакалі спэцыялістаў-археолягаў, пасьля чаго парэшткі закапалі, а кабэль правялі крыху ўбаку. Рабочыя, якія парадкуюць брацкую магілу, пра знойдзенае пахаваньне гаварыць ня хочуць. Выглядае, што будаўнікі проста вырашылі замоўчваць сытуацыю, каб не нажыць сабе лішніх праблем напярэдадні 9 траўня. Як жа — сарваць пляны добраўпарадкаваньня?

З.Рагачоў кажа, што цяпер МГА «Гісторыка» рыхтуе заяву ў пракуратуру: разьбірацца са знойдзенымі чалавечымі пахаваньнямі — іх кампэтэнцыя.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Аркадзь Шанскі**

## СЬЦІСЛА

### Іран «зажаў» грошы

Іранская кампанія «Кейсан» адмовілася даваць грошы на будаўніцтва ў Шклове заводу па вытворчасьці газэтнай паперы. Беларускі бок сьпешна ўносіць у праект карэктывы. Замест 200 тыс. тон паперы штогод у Шклове будуць вырабляць толькі 40 тыс. У выніку рэалізацыя праекту будзе каштаваць не $400 млн, а 96 млн. Збудаваць завод маюць за два з паловай гады.

### Мода пад кантролем

На віцебскім ААТ «Кім» («Клясыка індустрыі моды») уводзіцца «залатая акцыя». Доля дзяржавы ў статутным фондзе будзе павышана з 57,6% да 99,5%. Апошнім часам фабрыка зазнала значныя фінансавыя цяжкасьці, ня можа выплаціць падаткі, падаюць аб'ёмы вытворчасьці. Заснаванае ў 1931 г. прадпрыемства вырабляе панчохі, шкарпэткі, бялізну ды верхні трыкатаж.

### Нацыяналізацыі — бой!

Акцыянэры ААТ «Лякафарба» супраціўляюцца нацыяналізацыі прадпрыемства. Дзяржава пажадала павялічыць сваю долю ў статутным фондзе «Лякафарбы» з 25% да 99,8%, а ўзамен інвэставаць грошы ў рэканструкцыю вытворчасьці. Але праз тое, што павелічэньне дзяржаўнай долі пагражае зьнізіць кошт акцый амаль да нуля, акцыянэры прагаласавалі супраць. Ды ў дзяржавы застаўся козыр — права «залатой акцыі», якую, як мяркуецца, неўзабаве ўвядуць на «Лякафарбе».

### Колькі каштуе не памерці з голаду

Урад зацьвердзіў бюджэт пражытачнага мінімуму. У сярэднім на чалавека БПМ складзе 139 230 руб. Найбольш грошай патрабуюць дзеці ад 3 да 16 год — кошт іх спажывецкага кошыку 151 тыс. 980 руб. Для людзей працоўнага ўзросту БПМ вызначылі ў памеры 151 690 руб., а пэнсіянэрам прапанавана выкручвацца на 121 570 руб.

### Бутэлькі — на пераапрацоўку

Аўстрыйская фірма «РэПляс-М» рыхтуе да ўводу ў дзеяньне ў Магілёве лінію па пераапрацоўцы плястыкавых бутэлек. Інвэстыцыі ў праект складуць $2,5 млн. Магутнасьці дазволяць пераапрацоўваць 8 тыс. тон ПЭТ-бутэлек у год. Заснавальнікі фірмы прызнаюць, што самае складанае — наладзіць збор бутэлек. Паводле ацэнак спэцыялістаў, у краіне штогод назапашваецца да 25 тыс. тон адходаў ПЭТ-сыравіны.

### Эўразьвяз падвёў вынікі

ЭЗ падсумаваў вынікі пашырэньня ня Ўсход, якое адбылося год таму. Рост эканомік дзесяці новых сяброў Эўразьвязу сёлета склаў 5% супраць 3,7% летась. Яны ўнесьлі ў адзіны бюджэт каля 3,2 млрд эўра, а атрымалі зь яго 6 млрд. Для пятнаццаці старых сяброў ЭЗ пашырэньне прынесла рост ВНП на 0,7%.

**АК, АФН, Інтэрфакс**

### КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 5 траўня:**
1 амэрыканскі даляр — 2 151 рубель.
1 эўра — 2 785,33 рубля.
1 латвійскі лат — 4 001,86.
1 літоўскі літ — 806,52.
1 польскі злоты — 657,82.
1 расейскі рубель — 77,40.
1 украінская грыўна — 429,34.

**Паводле Нацбанку**

# Журналісты на Гарадзеншчыне былі самымі свабоднымі, сёньня іх уціскаюць наймацней

У Горадні адбылося ўручэньня ганаровага дыплёму імя Ігара Герменчука. Першым ляўрэатам стала рэдактарка газэты «Биржа информации» Алена Раўбецкая.

У Сусьветны дзень свабоды друку, 3 траўня, кіраўніцтва Беларускай асацыяцыі журналістаў прыехала ў Горадню. Як сказала старшыня арганізацыі Жанна Літвіна, зважаючы на ўмовы працы мясцовых журналістаў недзяржаўных выданьняў, сябры праўленьня хацелі прадэманстраваць сваю салідарнасьць: «Мы разам, мы побач».

БАЖ выдаў заяву з нагоды Сусьветнага дня свабоды друку, яна якраз прысьвечана становішчу на Гарадзеншчыне, якая названа «тэрыторыяй рызыкі для незалежных журналістаў».

Дыплём «За адданасьць прынцыпам свабоды слова» імя галоўнага рэдактара газэты «Свабода» і часопісу «Кур'ер» Ігара Герменчука, які памёр тры гады таму, заснавалі сумесна нарвэскія «Дом правоў чалавека» і ПЭН-клюб. Праўленьне БАЖ вырашыла адзначыць ім Алену Раўбецкую. Летась суд пакараў яе штрафам за сьмелую публікацыю наконт абвешчанага Лукашэнкам рэфэрэндуму. Неўзабаве Міністэрства інфармацыі прыпыніла выхад «Биржи информации» на тры месяцы. Калі тэрмін скончыўся, усе беларускія друкарні атрымалі загад не друкаваць газэту. Сёньня журналісты выпускаюць інтэрнэтстаронку, сама газэта не выходзіць амаль паўгоду і наўрад ці адновіцца да восені.

«За адданасьць прафэсіі» — такімі дыплёмамі БАЖ былі ўзнагароджаны Натальля Макушына зь «Биржи информации», Андрэй Пачобут, які працаваў для інтэрнэт-сайту «Газэта «Пагоня», а цяпер будзе рэдагаваць «Magazyn Polski», Аліна Суравец з «Новой газеты Сморгони» і Андрэй Шантаровіч, які выдае «Местную газету» ў Ваўкавыску.

На сустрэчы ўспаміналі «Свабоду» Ігара Герменчука, які ўмеў знайсьці інфармацыю, якой ня меў ніхто іншы. Гаварылі таксама пра тое, што на Гарадзеншчыне заўжды незалежная журналістыка была разьвіта найболей у параўнаньні зь іншымі мясьцінамі, таму і перасьлед сёньня найбольш моцны менавіта тут. Мы друкуем вытрымкі з выказваньнямі гарадзенскіх рэдактараў, якія зьяўляюцца сябрамі БАЖ.

**А.Шантаровіч** («Местная газета»): «Можа быць, усё ж мае сэнс размаўляць з суседнімі краінамі, каб ствараць газэты і выпускаць іх на тэрыторыі Беларусі нейкімі шляхамі?.. Карацей, калі я ў Беларусі не магу атрымаць «дах», апроч як у адміністрацыі прэзыдэнта, дык трэба шукаць гэты «дах» дзесьці ў замежжы, прычым не ў такіх краінах, якія ад нас далёка і дзе нас ня ведаюць, а бліжэй, там, дзе нам спачуваюць».



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**АЛЕНА РАЎБЕЦКАЯ стала першай ляўрэаткай ганаровага дыплёма імя Ігара Герменчука.**

**М.Маркевіч** («День»): «У гэты дзень тут у Горадні мы не на словах, а практычна бачым, што мы не адны, што нас многа, што наша справа слушная. Што нас падтрымлівае цэлы сьвет і тыя каштоўнасьці, якія вызнаём мы, зьяўляюцца падмуркам для ўсёй цывілізацыі».

**А.Раўбецкая** («Биржа информации»): «Я хачу сказаць аб двух момантах... Нас чакаюць паўтара году інтэнсіўнай працы ў абсалютна невыносных умовах. Магчыма, нам трэба цяпер сабраць у нейкую інфармацыйную базу тыя газэты, якія яшчэ ня страцілі сваёй ліцэнзіі. Вы выдатна разумееце, што такое мясцовая прэса і наколькі яна бліжэйшая людзям, чым цэнтральныя газэты. І хоць невялікімі накладамі трэба паспрабаваць адрадзіць гэтыя газэты, знайсьці магчымасьць, каб малыя рэгіянальныя выданьні існавалі, бо яны рабілі сваю вялікую справу.

Мне вельмі хочацца, каб мы былі падрыхтаваныя да новай палітычнай сытуацыі, каб у нас потым не было ніякай бюракратычнай дзяржаўнай прэсы. У нас павінна быць гатовая такая заканадаўчая база, якая датычыць «чацьвёртай улады». Я хачу, каб мы былі гатовы да таго, што гэтыя перамены могуць настаць — і з нашай дапамогай, і з Божай — у любы момант».

**Сяргей Максімовіч, Горадня**

## СЬЦІСЛА

**25 красавіка ў Магілёве пачаўся судовы працэс у справе маладафронтаўца Сяржука Нягаціна**, абвінавачанага ў распаўсюдзе друкаваных матэрыялаў, якія ганьбяць дзяржаўны лад, а таксама ў дробным хуліганстве і супраціве міліцыянтам. Яго затрымалі 23 красавіка ўвечары: у хлопца парваўся пакет, зь якога пасыпаліся на тратуар каля 300 асобнікаў розных дэмакратычных газэт, што й прыцягнула ўвагу міліцэйскага патруля.

Экс-дэпутат **Сяргей Скрабец** 25 красавіка накіраваў у пракуратуру Беларусі і старшыню КДБ заявы «пра злачынствы» — так ён ацаніў заявы спэцслужбаў пра затрымку двух кур'ераў зь Літвы, якія везьлі яму 200 тыс.даляраў.

Офіс берасьцейскай філіі **БСДП (НГ)** 26 красавіка наведалі міліцыянты з упраўленьня па барацьбе з абарачэньнем наркотыкаў. Наркотыкаў не знайшлі, але ўзялі некалькі асобнікаў віншавальных улётак з нагоды 1 траўня. На каардынатара руху «Воля народу» па Берасьцейшчыне, актывіста БСДП **Ігара Маслоўскага** склалі пратакол за дзеяньне ад імя незарэгістраванай арганізацыі. Прэзыдыюм Выканаўчага бюро мае намер накіраваць афіцыйны ліст міністру ўнутраных спраў, каб прыцягнуць да адказнасьці берасьцейскіх міліцыянтаў за перавышэньне імі паўнамоцтваў і парушэньне заканадаўства.

У Магілёве 26 красавіка міліцыянты перашкодзілі правесьці Чарнобыльскую акцыю, прэвэнтыўна затрымаўшы сяброў ПБНФ **Рыгора Костусева** і **Зьмітра Салаўёва**, сябра БСДП **Паўла Вусава**, сябра АГП **Уладзімера Шанцава**. Затрыманых адпусьцілі праз некалькі гадзін, не складаючы пратаколаў.

Студэнтку **Аксану Цімчанку** й кіраўніка арганізацыі «Сузор'е» **Зьмітра Шыманскага** затрымалі ў Берасьці 26 красавіка падчас акцыі «Сьвечка памяці»: яны раздавалі ўлёткі з інфармацыяй пра вынікі Чарнобыльскай катастрофы. На дзяўчыну склалі пратакол за незаконнае распаўсюджваньне друкаванай прадукцыі.

Гарадзенскую журналістку **Ірыну Чарняўку** 26 красавіка выклікалі ў абласную пракуратуру й прымусілі даць тлумачэньні па скарзе намесьніка міністра па падатках і зборах Васіля Каменкі. Ён лічыць, што журналістка ў артыкуле «Праверкі ў падатковай» («Народная воля», 5 красавіка 2005 г.) раскрыла таямніцу папярэдняга сьледзтва. Журналістка растлумачыла, што карысталася адкрытымі крыніцамі.

У Менску падчас Чарнобыльскай акцыі 14-гадоваму школьніку **Данілу Барысевічу**, актывісту незарэгістраванай арганізацыі «Зубр», пашкодзілі зьвязкі на руцэ.

27 красавіка асуджаны ўдзельнікі Чарнобыльскай акцыі — грамадзяне Ўкраіны: **Андрэй Бокач** — на 15 сутак, **Аляксандар Машлай, Андрэй Грымалюк** і дэпутат Луцкага гарсавету **Ігар Гузь** — на 10 сутак кожны, **Аляксей Панасюк** — на 9 сутак. 10 сутак арышту атрымаў карэспандэнт часопісу «Русский Newsweek» **Аляксей Амётаў**, 8 сутак — журналіст газэты «Московский комсомолец» **Міхаіл Раманаў**. На суды да расейцаў і ўкраінцаў не пускалі дыпляматаў, парушаючы гэтым Венскую канвэнцыю аб консульскіх адносінах ад 1963 г. 30 красавіка пасьля ўмяшаньня расейскіх дыпляматаў асуджаныя грамадзяне Расеі былі адпушчаны і вывезены на радзіму.

«Маладафронтаўцы» **Кірыла Шымановіч** і **Алег Гнедчык** атрымалі 27 красавіка за Чарнобыльскую акцыю па 10 сутак арышту. На столькі ж быў асуджаны кіраўнік БПС **Сяргей Высоцкі**, а таксама **Мікіта Дзядзюшка** і **Анатоль Бякасаў**. Асуджанага па той самай справе **Сяргея Лісічонка** ў ноч на 1 траўня даставілі са спэцпрыёмніку ў інфэкцыйную больніцу.

З актывістамі Свабоднага прафсаюзу мэталістаў УП «Лёс» (г.Барань Аршанскага раёну) сьлесарамі **Рыгорам Максіменкам**, **Вадзімам Дзюдзяковым** і **Міхаілам Воранавым** 27 красавіка адміністрацыя заводу адмовілася працягваць кантракт. Яны, у сваю чаргу, накіравалі кіраўніцтву сустрэчныя заявы з патрабаваньнем скасаваць кантракт у сувязі зь невыкананьнем яго адміністрацыяй: заробкі выплачваюцца ня двойчы ў месяц, як напісана ў кантракце, а толькі адзін раз. Паколькі адміністрацыя адмовілася плаціць работнікам кампэнсацыі, яны падрыхтавалі заявы ў суд.

Першы допыт затрыманага **Андрэя Клімава** адбыўся 27 красавіка. Клімаў адмовіўся даваць паказаньні, заявіўшы, што не давярае сьледчаму й лічыць допыт бессэнсоўным. 29 красавіка Клімаву прад'явілі абвінавачаньне за арганізацыю акцыі 25 сакавіка. Паводле рашэньня пракурора, ён застанецца за кратамі сама меней да 22 чэрвеня.

Палітзьняволены **Валер Леванеўскі**, як стала вядома 28 красавіка, пачаў чытаць лекцыі па юрыдычнай тэматыцы і пытаньнях прававой дзейнасьці вязьням калёніі №22 у Івацэвіцкім раёне, дзе адбывае пакараньне.

Падчас распаўсюду незарэгістраванай газэты «Выбар» у Магілеве 27 красавіка затрыманы актывісты «Зубра» **Яўген Сувораў**, **Мікалай Ільын** і **Ганна Петракевіч** — на іх склалі пратаколы за распаўсюджваньне друкаванай пардукцыі без выходных зьвестак. Непаўналетнюю Ганну Петракевіч паставілі на ўлік у інспэкцыі па справах непаўналетніх і правялі зь ёй «прафіляктычную гутарку».

28 красавіка блізкія забітай журналісткі Веранікі Чаркасавай атрымалі пастанову менскай пракуратуры ад 18 красавіка, згодна зь якой зь яе сына **Антона Філімонава** ды айчыма **Ўладзімера Мялешкі** зьнятыя падазрэньні «праз адсутнасьць у іх дзеяньнях складу злачынства».

Сыны **Міхаіла Марыніча** 28 красавіка накіравалі ў пракуратуру Беларусі скаргу на адміністрацыю Аршанскай калёніі: яны лічаць, што там іхняга бацьку спрабавалі забіць і таму наўмысна не давалі яму лекаў напярэдадні інсульту.

У актывісткі АГП **Марыны Багдановіч** 28 красавіка апісалі маёмасьць без удзелу панятых: яна асуджана на 150 базавых велічынь штрафу за акцыю 26 красавіка й на 200 б.в. за акцыю прадпрымальнікаў 1 сакавіка.

У падтрымку газэты «Борисовские новости» 28 красавіка актывісты «Зубра» вывесілі расьцяжку на мосьце над шашой Менск—Масква. Міліцыянты затрымалі на 15 хвілін журналіста газэты **Аляксандра Абрамовіча**, які фатаграфаваў падзею. Суд над рэдактарам газэты **Анатолем Букасам** пачаўся 29 красавіка: яго вінавацяць у паклёпе і абразе рэдактара газэты Барысаўскага гарвыканкаму «Адзінства» Веры Пратасевіч.

Адміністрацыйная камісія пры Наваполацкім гарвыканкаме 28 красавіка разглядала справу затрыманага падчас распаўсюду студэнцкага бюлетэню студэнта Полацкага дзяржунівэрсытэту **Алега Вяжэвіча**. Хлопца апраўдалі «праз адсутнасьць складу правапарушэньня», а канфіскаваныя асобнікі пастанавілі вярнуць уладальніку.

Менскія гарадзкія ўлады адмовілі прафсаюзу **РЭПАМ** у арганізацыі 1 траўня шэсьця па праспэкце Скарыны й мітынгу на Кастрычніцкай плошчы. Афіцыйнай падставай для адмовы стала спазьненьне з заяўкай: чыноўнікі гарвыканкаму кажуць, што яна паступіла да іх 19 красавіка — менш чым за 15 дзён да мерапрыемства. Прафсаюзныя актывісты гавораць, што падавалі заяўку 15 красавіка.

У Гомелі 1 траўня прэвэнтыўна затрыманы **10 актывістаў** моладзевых арганізацый, якія меліся раздаваць мінакам цукеркі «Лімонныя» і «Лімоньнік». У затрыманых адабралі партрэты Лукашэнкі, купленыя ў кнігарні, і адпусьцілі, не складаючы пратаколаў.

1—2 траўня адбылася акцыя Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі — віншаваньне на Вялікдзень. У сьпісе віншаваньня было 70 чалавек — гэта беларуская эліта, народныя пісьменьнікі, паэты, акадэмікі, навукоўцы, палітыкі, кандыдаты ў прэзыдэнты, грамадзкія дзеячы. Сэнс акцыі — прэзэнтацыя ідэй хрысьціянскай дэмакратыі. Сярод падарункаў былі музычны дыск з хрысьціянскімі сьпевамі, праграмка хрысьціянскай дэмакратыі. Затрыманьняў не было.

**АШ**

## Археолягі ў Слуцку

Слуцак працягвае рыхтавацца да «Дажынак». Цяпер горад выглядае нібы пасьля вайны — усё перарыта. Шмат земляных работ праводзіцца ў гістарычных месцах.
На пасяджэньні штабу па правядзеньні сьвята выносілася прапанова, каб у такіх выпадках у работах бралі ўдзел спэцыялісты па археалёгіі, але на справе выходзіць інакш. І шмат знаходак, магчыма, так і ня дойдзе да вучоных ды спэцыялістаў.
Так, напрыклад, адзін рабочы апавядаў, што ў ходзе раскопак натрапілі на колішняе месца знаходжаньня майстэрні. Але рэшткі скураных ды жалезных вырабаў не падаліся рабочым каштоўнымі. У выніку знаходка была закапана назад у глебу.
Гэты выпадак быў апісаны ў мясцовай газэце «Інфакур'ер». Шмат народу цяперака шчыруе на раскопках рэчышча Случы. Хтосьці здабывае добрую глебу для расады, а хтосьці марыць знайсьці радзівілаўскі скарб. Аднаму хлопцу пашчасьціла знайсьці старажытную сярэбраную манэту. Які лёс чакае гэтую знаходку? Спачатку хлопец хацеў яе прадаць, але цяпер пляную пераплавіць яе на ланцуг ці пярсьцёнак.
Прыгадваецца выпадак, пачуты мною ў сямідзясятыя ад аднаго сына вайскоўца. Пры грабарскіх работах салдаты будбату знайшлі драўляную скрыню. У ёй сярод некаторых спарахнелых рэчаў знаходзілася некалькі слуцкіх паясоў. Тады існавала палітыка пасылаць служыць у войска далей ад радзімы. Магчыма, тыя хлопцы і ня ведалі пра каштоўнасьць сваёй знаходкі, таму яны знайшлі ёй ужываньне, зыходзячы са сваіх патрэб, — разрэзалі паясы на анучы для ботаў. Калі гэта выявілі камандзіры, цэлых знаходак не засталося. Кавалкі пазабіралі афіцэры сабе на сувэніры.
Вось і цяпер ці захоча які чыноўнік прыпыняць работы ды выбівацца з графіку ў выпадку якой знаходкі? Пры раскопках пад п'едэстал для помніка Леніну былі знойдзены чалавечыя чарапы. Аб знаходцы паведамілі не будаўнікі, а хлапчукі, якія гулялі на месцы раскопак.

**Сяржук Кут, Слуцак**

## Стракаты Першамай у Бабруйску

Раніцай 1 мая на галоўнай плошчы гораду адбыўся мітынг прадстаўнікоў працоўных калектываў з ускладаньнем кветак да помніка правадыру. Пасьля абеду праваслаўныя вернікі зь ліку мітынгоўцаў маглі далучыцца да хроснага ходу на шляху да капліцы ў гонар іконы Божай маці «Усіх смуткуючых радасьць» на Менскіх могілках. У свой час будаўніцтва капліцы было забаронена былым «чырвоным мэрам» Уладзімерам Рамануоўскім. Побач у піку гэтай будоўлі за нейкі месяц узьнёсься помнік савецкаму салдату на кані, што забівае пікаю зьмея. Помнік у народзе празвалі «канём Раманоўскага».
Увечары таго ж дня ў Палацы мастацтваў адбыўся міжканфэсійны велікодны канцэрт, арганізаваны каталіцкай парафіяй Бабруйску, дабрачыннай арганізацыяй «Крыніца жыцьця» і рухам «One Way».

## Міліцыянэр-птушкавод

У лістападзе Бабруйская птушкафабрыка перайшла ў прыватныя рукі. Гаспадаром стаў былы супрацоўнік міліцыі Леван Агаджанян. Адной з умоў продажу было захаваньне колькасьці працоўных месцаў. Але за паўгоду на фабрыцы ня толькі не скарацілі ніводнага чалавека, але і забясьпечылі працай дадаткова яшчэ 110.
Узрасьлі і заробкі: сярэдняя зарплата на прадпрыемстве складае 320 тысяч рублёў, а ў часы, калі птушкафабрыка была дзяржаўнай, людзі атрымлівалі зарплату 120—130 тысяч, прычым часьцей за ўсё яна выдавалася натурай — яйкамі.

**Надзея Лісоўская, Бабруйск**

## Аднаўлены «Заклік»

Пасьля трохгадовага перапынку аднавіўся выхад касьцюковіцкага інфармацыйнага бюлетэню «Заклік», выдаванага актывістамі БНФ. Выданьню яшчэ далёка да вядучых газэт краіны, але для правінцыйных Касьцюковіч — гэта немалое дасягненьне.

**Андрэй Пархоменка, Крычаў**

## Афрыканскі футбол у Горках

У Горках адбыўся другі міжнародны турнір па міні-футболе на Кубак Садружнасьці, заснаваны год таму эгіпэцкімі студэнтамі. Сёлета ў турніры ўзялі ўдзел 20 камандаў. У фінальным матчы каманда зоаінжынэрнага факультэту Беларускай сельгасакадэміі выйграла па пэнальці ў зборнай нігерыйскіх студэнтаў. Апошнія, нядаўна прыехаўшы ў акадэмію, арганізавалі футбольную каманду, якая рэгулярна трэніруецца на стадыёне БДСГА. Шмат хто зь нігерыйцаў разьлічвае трапіць у беларускія футбольныя клюбы, для чаго нядаўна згулялі таварыскі матч у Магілёве з клюбам вышэйшай лігі «Дняпро-Трансмаш», саступіўшы 0:2.

**Эдуард Брокараў, Горкі**

## Усё як заўсёды

На першамайскім мітынгу ў горадзе над Нёманам было ўсіх патроху — ад піянераў да пэнсіянэраў. Прыцягвалі ўвагу паветраныя балёнікі, якія калыхаліся над натоўпам. Чырвоны і зялёны балёнікі, найбольшыя памерам, трымаліся на нітцы вышэй за іншыя.
Шмат было міліцыі, якая шчыльна абступіла плошчу Леніна і сачыла за перамяшчэньнем людзей. У цэнтры яе зацікаўленасьці былі лідэры мясцовай апазыцыі. Дэпутат гарадзкога савету Сяргей Антусевіч пажартаваў, што «бяз нас ім і работы не было б».
Гучалі прамовы. Кіраўнік абласной прафсаюзнай арганізацыі радасна паведаміў, што народ цягнецца да сваіх абаронцаў-прафсаюзаў, а яны разам зь дзяржорганамі пільна сочаць за захаваньнем працадаўцам правоў рабочага люду. Прадстаўнік працоўнай дынастыі распавёў аб сваіх дасягненьнях і падзякаваў уладзе за магчымасьць працягваць заводзкую справу дзеда і прадзеда. Чытаў рабочы з паперкі, таму збіваўся, бо сустракаліся незнаёмыя словы, падабраныя невядомым сьпічрайтэрам.
Гэтым разам абышліся бяз шэсьця калён. Дасьведчаныя людзі растлумачылі, што рашэньне аб першамайскім мітынгу было прынятае ў апошнюю хвіліну. Улада ўсё вагалася: сьвяткаваць ці не? А раптам апазыцыя выкіне якое каленца?
Пагаварылі і разышліся. З дынаміка бадзёра гучалі расейскамоўныя мэлёдыі. Па-расейску прамаўлялі і выступоўцы. Усё як заўсёды.
Відаць, усе лепшыя сілы будуць кінуты на арганізацыю сьвята 9-га мая. Будзе багата словаў на адрас вэтэранаў вайны, купку якіх правядуць па галоўных вуліцах.

**Антон Лабовіч, Горадня**

## Сталін п'е за перамогу

Выстава, прымеркаваная да 60-годзьдзя Перамогі, адкрылася ў гарадзкой выставачнай залі Воршы. Тут дэманструюцца жывапіс, графіка ды скульптура з фондаў мясцовага музэйнага комплексу. Прадстаўленыя дакумэнты датаваны 1940—1950 г., прысутнічаюць творы Яўгена Зайцава, Заіра Азгура, Віктара Грамыкі ды інш.
Найбольшую цікавасьць у наведнікаў выклікаюць добра зробленыя копіі шматфігурных карцін вядомага некалі ўкраінскага мастака Міхаіла Хмялька «Трыюмф Перамогі» ды «За вялікі расейскі народ», уганараваныя ў 1946 і 1948 гг. Сталінскімі прэміямі. На апошняй адлюстраваны ўрачысты прыём у Крамлі пасьля параду Перамогі. Сярод намаляваных асобаў — Сталін, Молатаў, Кагановіч…
Перададзеныя ў другой палове 1950-х г. зь Дзяржмузэю Вялікай Айчыннай вайны ў Менску ў мэмарыяльны музэй К.Заслонава, яны ніколі ў Воршы не выстаўляліся.

## Лебедзі ў Барані

Другі год запар жыве ў горадзе Барань (Аршанчына) сям'я белых лебедзяў. Відаць, даспадобы прыйшлася ім тутэйшая рэчка Адроўка.
Лебедзі ўжо сталі мясцовай славутасьцю. Жыхары пачалі іх песьціць — увесь час падкормліваць хлебам, што ня дужа добра для птушынага здароўя. А вось баброў, якія таксама «кватаравалі» на Адроўцы, летась пазабівалі баранскія дзецюкі. Кажуць, яны, ня маючы грошай на «Віягру», здабывалі бабровы струмень, які, паводле народнай мэдыцыны, дае мужчынам моц. Дзякуй богу, на лебедзяў пакуль ніхто не замахваўся.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

## На таран

На мінулым тыдні ў Баранавічах адбылася жудасная аварыя. На прыцемку, па вуліцы Камсамольскай на вялікай хуткасьці «BMW» уехала ў хвост гарадзкому аўтобусу. Аўтамабіль па лабавое шкло ўлез пад аўтобус, які ад удару праехаў больш за трыццаць мэтраў.
У аўто было пяцёра хлапцоў. Кіроўца загінуў на месцы, пасажыр, што сядзеў побач, ён жа гаспадар машыны, памёр па дарозе ў шпіталь. Яшчэ адзін хлопец сканаў на наступны дзень. Астатнія з рознымі пераломамі і страсеньнямі знаходзяцца ў бальніцы. З пасажыраў аўтобуса ніхто не пацярпеў.
Паводле слоў сьведкаў, «Бумэр» нёсься з хуткасьцю больш за 100 кілямэтраў у гадзіну ды без уключанага сьвятла. Паводле некаторых зьвестак, хлопцы вярталіся з бару.

**Руслан Равяка, Баранавічы**




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ГАРАДЗЕНСКІЯ БАЙКЕРЫ** адкрылі сэзон. 1 траўня тры сотні аматараў хуткае й гучнае язды на матацыклах праехалі па вуліцах Горадні.

# Трэш

## залатыя часы

Сьмецьце, хлуд, трэш — найгоршае з найкепскага... Мэдсястрычкі-маньячкі і набожныя канібалы. Усё наўмысна-безгустоўнае, крывавае і брыдотнае — усё гэта і ёсьць трэш. Міністэрства культуры Беларусі ніколі не заяўляла: «Здымаем фільмы паводле запаветаў трэш-студыі «Трома»: сэкс і кроў у залімітных дозах, звышнізкі бюджэт!» Але наша краіна — запаведнік адборнага мастацкага сьмецьця. Трэш сёньня — ключавы беларускі стыль. І знак нашага часу. Дасьледуе **Андрэй Расінскі.**

### У заражанай зоне

Неяк у сеціве наткнуўся на расейскі клюб заўзятараў трэшу. У сьпісе ўрачыстых праглядаў разам зь фільмамі Цібара Такача й «найгоршага рэжысэра ўсіх часоў» Эда Вуда ганаровае месца займала беларуская карціна — «Рэйнджар з атамнай зоны» Вячаслава Нікіфарава.

Грудастыя прастытуткі Чарнобыльскай зоны, недарэчныя эратычныя сцэны, безгустоўная страляніна — усё гэта расквецьць любую кінамакулятуру.

Але Нікіфараў — аўтар клясычных экранізацый «Дуброўскага», «Бацькоў і дзяцей» — профі, які й не зьбіраўся здымаць сьмецьце. Проста «Рэйнджар» — жанр для яго чужы, нязручны й неасвоены, а недапрацаваныя, неахайныя вобразы нізкага жанру заводзяць нас у заражаную зону, дзе пануе хлуд.

### Вайна «Прастытуткі» зь «Лясной быльлю»

Трэш люляецца ў калысцы кожнай культуры. Нават само нараджэньне высокага й паважанага сёньня кіно адбывалася пад кірмашовыя крыкі й балаганныя воплескі.

У беларускай культуры на ролю першага фільму — разам зь «Лясной былю» Тарыча — прэтэндавала й камэрцыйна-забаўляльная «Прастытутка».

Апісаньне гэтага рарытэту не пакідае сумневу ў трэшавасьці тагачаснай кінапрадукцыі. «Забітыя жыцьцём» жарсьці, табліцы вэнэрычных захворваньняў, прытоны… Мастакі не хавалі пагарды, але цікава, што «клубнічна»-сьмецьцевыя люлі ганараваныя тытрамі Віктара Шклоўскага, культавага расейскага інтэлектуала.

### Імпэт Цэнзара

Лінію «Прастытуткі» працягнуў Юры Цьвяткоў, цяпер кіраўнік Дзяржрэгістру. Але карціны, калісьці зробленыя ім, напоены радасьцю й непасрэднасьцю наіўнага трэшу. Чаго вартая камэдыя «Гэтая вясёлая плянэта»: іншаплянэтнікі трапляюць на сустрэчу Новага году: недарэчныя касьцюмы, заміланаваньне й ап'янела-лёгкая бутафорыя пераплюнуць любых «Клоўнаў-забойцаў з далёкага космасу».

Цьвяткоў даказаў: трэш — гэта ня толькі тромаўскія кроў, мяса і язык на бак, але й беларуская цнатлівасьць у квадраце, музычныя дрындушкі за кадрам і кола ад ровару ў якасьці іншаплянэтнага прычындала.

### Паўлінка, знойдзеная на сьметніку

«Пасьля кірмашу» Цьвяткова — гэта экранізацыя знакавай п'есы «Паўлінка»; сцэнар фільму склаў Андрэй Макаёнак, акторамі былі Галіна Макарава й Міхаіл Пугаўкін, музыку напісаў Яўген Глебаў.

Але «Паўлінка» атрымалася адлякаванай мыльнаопэрнай дамаю ў этнаграфічным касьцюмчыку з тэатральнымі прыбамбасамі.

Дурацкія скокі, лёгкае камікаваньне, этнаграфічная бутафорыя выстаўленыя рэжысэрам з заміласаваньнем і неабавязковасьцю ахайнага й чысьценькага кінасьмецьця.

Дык ці ня ёсьць кіна-Паўлінка Цьвяткова сапраўдным узнаўленьнем таго, што насамрэч напісаў Купала, — лёгкім, нязмушаным і неабавязковым трэшам?

Ці ня з трэшу пачыналася новая беларуская культура? Трэшу, які знаходзіць сваё месца наўзбоч ад «высокаакадэмічных» суседніх культур, які наўмысна прыкідваецца «дурным як варона», які апранае кажух Мацея Бурачка і песьціць на галаве каўтун?

### «Мне мамку зарэзалі немцы...»

Трэш — гэта рэзэрвацыя, дзе ўсе аўтары, незалежна ад іхняга таленту, становяцца аднолькава «бяздарнымі» (часам наўмысна) — і кірмашова-імпэтнымі. Крытыкі дасюль пакутуюць у роздумах, як ставіцца да апошніх вер-



PHOTO.BYMEDIA.NET

шаў Купалы. А ён проста гуляў тут па правілах трэшу. Некаторым ягоным радкам пазайздросьцілі б любыя трэш-сцэнарысты: «Мне мамку зарэзалі немцы, сястрычку спалілі жыўём. Дык хай жа кроў чорная льецца, іх псіная кроў ручаём…» — гэта зь вершу «Хлопчык і лётчык на вайне».

І ў савецкага Купалы не адзін такі хлудны верш. 1930-я насычаныя «тапельцамі» ў Вісьле, «бандай трацкісцкай», якую «асіна адкіне», штучным шчасьцем — ажно пільны крытык з наганам Лукаш Бэндэ заўважыў, што тагачасныя Купалавы творы не адпавядаюць таленту: неахайныя, нядбайныя, зь няправільнай рыфмай — без душы.

Яны пад эпоху — трэшавыя.

### Эратычныя ночы «Сатанінскага туру»

Куды натуральнейшы трэш у Івана Шамякіна, выдатнага бульварнага пісьменьніка. Модніцы-даяркі, якія адстойваюць права на асабістае жыцьцё ў сацспаборніцтве, дазаваныя эратычныя сцэнкі. Але самы круты трэш — «Сатанінскі тур», калі аўтар быў разгублены перабудоваю і канчаткова страціў пачуцьцё меры. Шлюндра заражае СНІДам хабарніка, чаўнакі вязуць у аўтобусе труп і выдаюць за жывога — характараў няма, затое якая энэргетыка!

Перабудовачная эпоха спараджала самыя чыстыя дыямэнты сьмецьця: можна паказваць забаронена, але аўтарскія сілы загубленыя, а ўлады жанравых традыцый — што хоць неяк дазваляе трымаць форму — пакуль няма.

### Д'ябал у шафе і палюбоўніца Берыі

Сярод тагачасных дыямэнтаў — непераўзыдзены трэш-шэдэўр кінарэжысэра Віталя Дудзіна «Д'ябал» («Бес»). Д'ябал у шафе з голымі бабамі грае ці то на баяне, ці то на гітары; дзяўчынка (амаль праз увесь фільм аголеная) атручвае ўласную бабулю; бабка (сэксапільны грудасты труп у выкананьні Маі Булгакавай) апавядае, як ёй хораша было з Лаўрэнціем Берыем.

Шкілеты ў саванах ідуць праз горад, і — самая выбітная сцэнка — душа (з воблаю ў руках) стаіць над сваім целам, а мэдсястрычка-істэрычка ломіцца ў апэрацыйную…

«Д'ябал» Дудзіна — самы чысты, нязмушаны й геніяльны беларускі хлуд.

### Шэдэўр паводле Чаргінца

Здавалася, па вайсковай тупасьці й недарэчнасьці немагчыма пераплюнуць тромаўскіх «Нацыстаў-сэрфінгістаў, якія мусяць памерці»: састарэлая й помсьлівая амэрыканка з наганам перасьледуе на матацыкле нацыстаў-сэрфінгістаў і давіць катэрам сэрфінгіста Адольфа.

Рэжысэр Юры Бяржыцкі даказаў, што пераўзысьці можна ўсё. Пасьля карціны «Вам — заданьне» паводле М.Чаргінца вайсковую тэму ў беларускім кіно можна лічыць закрытаю, бо бязь сьмеху глядзець на людзей у мундзіры нельга.

Няма аніводнага штампу беларускага вайсковага кіно, які ня быў бы даведзены ў гэтым фільме да абсалютнага, глыбіннага і сумленнага маразму.

Нават сцэна спаленьня жывуцом людзей — якая мусіла быць сур'ёзнай! — зьнятая так, што здольная выклікаць зайздрасьць камэдыёграфаў.

Людзі сагнаныя ў хату: выцьцё і лямант. Раптам — ні з пушчы ні з поля — з радаснымі (!) тварамі плякатных герояў яны выбіваюць дзьверы — і разьбягаюцца.

Бравурная вайсковая статыстыка (самае ачалавечанае ў фільме), мэляман-нацыст, раптам забіты кепскім панам (сцэнка яшчэ тая), — і над усім гэтым энкавэдыст зь нявестаю, сьветлы вобраз якога настолькі ідылічна-шчасьлівы і правільны, што можа быць толькі мараю сёньняшняй улады.

Адбываецца вяртаньне да самага адлякаванага «саўка», але безь ягонай крыві, плоці, энэргіі — і нават безь ягонай фальшывай «праўды», але з паўторамі і з выключнай, заміласаванай бяздарнасьцю.

### Марат Казей і калдыры

Хлуд савецкай эпохі не адпускае і незалежных беларускіх трэшмэйкераў. Так вайсковыя атрыбуты нечакана засьвяціліся ў праекце «Навінак» — фільме «Случай з пацаном». Уступная застаўка студыі «Навінкі Home Video» ўяўляе сабой Марата Казея з гранатай.

У засені Марата Казея пазыцыянавалі сябе й «Зубры», якія вызначыліся трэш-акцыямі, дзе за «лыжнікам» ганяліся псыхіятрыні, а за імі — сапраўдныя міліцыянты.

Але найлепшая кампанія для Марата Казея — «Саша і Сірожа» — самае камэрцыйнае беларускае сьмецьце апошніх часоў. Два прыдуркі, якія гутараць на трасянцы, гопнікі й калдыры — яны даводзяць да сьцёбнага сур'ёзу штампы, забабоны й пагалоскі.

Мілыя бутафорскія морды хаця й не выпівалі пад «помнікам з гранатаю», але прынялі б манумэнт у сваю кампанію (і выклікалі раздражненьне афіцыёзу). Проста ў афіцыёзу свой — і манапольны — стыль. Гэты стыль — трэш-афіцыёз.

### Трэш-афіцыёз і вызваленьне

Цяжка пераплюнуць Усенароднаабранага ў лыжных забегах па асфальце. А сэлектарныя нарады па ўгнаеньнях? Уключыце тэлебачаньне — на вас патокам пальецца трэш без берагоў і бязь межаў…

«Я знайшоў яго на памыйніцы!» — гэта ня проста абраза й крык душы. Гэта глыбінная дзяржаўная палітыка.

Галоўны стыль сёньня — гэта трэш-афіцыёз, бо сьцьвярджаецца ізаляцыя, маргінальнасьць, адкінутасьць Беларусі. Беларусь як сьметніца савецкай прасторы.

І што рабіць з гэтымі горамі хлуду, зь яго абсалютным і задоўжаным панаваньнем?

Даводзіць да абсурду і перапрацоўваць.

У справе давядзеньня да абсурду зуброўскія псыхіятры — самае адэкватнае. Хаця сёньня нават і даводзіць ня трэба — дастаткова адбіраць і паказваць. Перапрацоўка старога хлуду стварае новую культуру.

Таму на разваліна трэш-афіцыёзу няхай жыве беларускі трэш!

І новая высокая культура, якая з гэтага вырасьце.

# Скарбы Відзібору



Калі б нехта вызначаў самага калярытнага беларускага выканаўцу, ім бы без сумневу стаў **Іван Кірчук**, лідэр этна-трыё «Тройца». Доўгая сівая барада, два мэтры росту, чорныя акуляры. А галоўнае — голас, які стаў беларускай музычнай візытоўкай у сьвеце.

Голас Кірчука зьвязвае эпохі, стагодзьдзі, пакаленьні. Гэты голас з захапленьнем слухаюць замежнікі, бо вялікае дзіва; старыя, бо прабірае да душы; студэнты, бо захаплялньна.

Музыкант марыць, каб беларускае этна загучала ў кансэрваторскіх і філярманічных залях, каб выйшлі на CD песьні ўсіх этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Матэрыял гатовы зьбіраць уласнаручна. Чым ён, дарэчы, займаецца ўжо 22 гады. Пакуль жа змушаны вазіць сваіх замежных гасьцей на Палесьсе, каб тыя пачулі беларускую песьню, бо няма чаго падараваць у запісаным выглядзе.

Кірчук — за дыхтоўнасьць: «Дыскі зь беларускім фолькам мусяць выдавацца і мець прыгожае аздабленьне. Але дзе ж возьмеш грошы? У нашай краіне вунь колькі танкаў і самалётаў зьяўляецца. Няхай бы сродкі ад аднаго самалёта апчадзілі дзеля памяці продкаў і выдалі б іх музычную спадчыну».

Кірчук марыць, але несупынна пры гэтым займаецца справай. Выкладае ва ўнівэрсытэце. Кажа, цікавасьць у студэнтаў да аўтэнтычнай музыкі шалёная. Калі ўключае на занятках запісы замежных фольк-калектываў, нават на мабільнікі запісваюць. Езьдзіць на гастролі зь дзьвюма скрынямі інструмэнтаў, «Тройца» з 1996 г. — жаданы госьць буйных world-music-фэстаў, тры альбомы выдала ў Нідэрляндах. Шмат часу музыкант праводзіць у экспэдыцыях.

Вынік адной з апошніх — пяць гадзін запісанага аўдыёматэрыялу, некалькі гадзін відэа. Дзякуючы вандроўцы на Століншчыну Кірчук паспрабаваў сябе ў ролі прадусара і кінаактора.

Як прадусар ён адабраў на праграму аўтэнтычныя сьпевы вёсак Століншчыны.

Як актор ён зьняўся ў фільме «Сонцам асьвячуся» (рэж. Сяргей Рыбакоў). Ён там сыграў самога сябе — зьбіральніка песень Івана, але з гэткім містычным прысмакам: у таго Івана пераўвасабляецца лялька са старадаўняй батлейкі.

«Толькі праз 10—15 год я пачынаю асэнсоўваць некаторыя тэксты, на якія раней не зважаў. Якая мудрасьць закладзена ў іх!» — захапляецца Кірчук. Пра такіх людзей кажуць, што аднаго жыцьця ім мала. «Столькі інструмэнтаў трэба адрэстаўраваць!» — дзеліцца ён планамі. Да ўсяго, жыве ідэя наноў паставіць монаспэктакль «Варажбіт». І, натуральна, канцэрты «Тройцы».

**Сяргей Будкін**

**6 траўня ў Доме літаратара ў Менску Іван Кірчук прэзэнтуе аўтарскі этнаграфічны праект «Століншчына».** На сцэну выйдуць непасрэдныя ўдзельнікі альбому — жыхары вёсак Століншчыны (дваццаць чалавек). У праграме таксама паказ фільму «Сонцам асьвячуся». Пачатак а 19-й. Кошт квітка — 8—12 тыс. руб.

## ДЫСКАГРАФІЯ

### Зьмяя




«Усё дзеля Вас». (c) «Зьмяя», 2005. (p) «БМAgroup», 2005

Няпросты альбом. Трэба быць падрыхтаваным або мець прыдатны настрой, каб адным лётам праслухаць усе 12 трэкаў. Нішто не ўратуе ад штурму й драйву, якія дэманструе Зоя Каральчук з кампаніяй. Адчайны жаночы вакал, што раз-пораз зрываецца на рык, сымпатычна спалучаецца з мэлядычнасьцю.

Усе песьні па-беларуску. «Цяпер я — музыка BY», — сьпявае «Зьмяя», бо гурт адмовіўся ад расейскамоўных вэрсій некаторых сваіх кампазыцый.

Беларускія тэксты — экспрэ-сіўныя, часам эпатажныя (нечаканыя мацюкі ў песьні «Ў яму»), перасыпаныя іроніяй (лысая сямейка ў «Цётцы»).

Матывы папсова-эстраднай лірыкі даведзены «Зьмяёй» да абсурду (адрынутая дзяўчына, якая штовечар шнарыць у майтках з надпісам «Бывай»). Вельмі цікавы фальклёрна-геймэрскі хаўрус у песьні «Counter-Strike Source», дзе традыцыйныя каліны-рабіны суседзяць з гульнёвымі БОТамі і вінтоўкай М-16.

Самая сур'ёзная, бясьсьцёбная песьня «Вайна» — змрачнаватая футурыстычная карціна з салдатамі невядомай арміі і шчырым антываенным патасам. На жаль, у пляне лексікі мова «Зьмяі» недасканалая. І нават пахвальны момант самастойнага перакладу ранейшых тэкстаў з расейскай блякне перад плоймай памылак. Але гэта справа папраўная.

### Postscriptum




«Вандроўка». (c) «Postscriptum», 2005. (p) «БМAgroup», 2005.

Бывае, што альбомы спазьняюцца. А бывае — забаўляюцца. Дзіўнае ўражаньне робіць кружэлка гурту «Postscriptum». Здаецца, што гэта ўсё было — ці то ў іх, ці ў іншых. Псэўдафольк перамяшаны з рокам і прыпраўлены народнай аўтэнтыкай. Здаецца, што бальшыня трэкаў (агулам іх 12) стваралася музыкамі для саміх сябе і сваіх верных фанатаў. Я не хачу прымяншаць узроўню прафэсійнасьці каманды Юліі Белізяк, але мушу разважаць як абывацель. За што зачэпіцца паспалітае вуха? Што ўпадабае цынік-рэдактар «Кракадзілус-FM»?

Без увагі на тое, што ў загалоўнай кампазыцыі пяецца «Вандроўка — прэч ад тугі», ладная колькасьць песень напоўнена сумам. І сум гэты часьцяком напяты, штучны (за выняткам прачулай «Вецер з поўначы»).

Гарадзкія матывы («Ведаць бы яшчэ», «Дарую табе») марнеюць у псэўдафольквым вакале. А там, дзе вакалістка паўстрымлівае сябе ад надужыцьця сваімі галасавымі данымі, удаецца зусім няблага (восеньскі горад у «Мне не шкада»). Некаторыя крытыкі пасьпелі назваць мэга-гітом альбому песьню «Званы». Пагарачыліся. Трохі весялейшая за іншыя, і ўсё. Няма тут мэга, з гітамі таксама складана.

**Сяргей Балахонаў**

### Bionic@




«Bionic@». «Zigzag». (c) БМА, 2005

Цяпер Валік Грышко можа пачувацца ня так самотна. У беларускім электра-попе зьявіўся яшчэ адзін праект — «Zigzag». Ненавязьлівыя аранжыроўкі, простыя мэлёдыі месцамі з «жывой» гітарай ці скрыпкай, атмасфэрныя эфэкты, электронная апрацоўка вакалу — вось як караценька можна абмаляваць стылістыку групы. Прапанова ўнікальная як для беларускага музычнага рынку, але запозьненая: такі альбом быў патрэбен гадоў дзесяць таму, яшчэ лепей — у васьмідзясятыя, час музычных нэарамантыкаў. Цяпер наўрад будзе попыт на музычна-кампутарныя экспэрымэнты. Беларускія электроншчыкі пайшлі куды далей за «Zigzag». Пакідае пытаньні й мастацкая вартасьць тэкстаў. Далейшае разьвіцьцё праекту бачыцца ў рэчышчы атмасфэрнага фолькпопу. Якраз такая «Гара» — самая ўдалая кампазыцыя альбому, зробленая сумесна з вакалістам групы «Нагуаль».

Кампазытарскі талент лідэра «Zigzag» Ігара Загумёнава заўважылі нават афіцыёзьнікі — ён летась быў намінантам на «Кампазытара году». Але яго цікавым музычным ходам («Пабудзі мяне», «Палымянае неба») не стае завершанасьці. Нібыта слухаеш чарнавы варыянт песьні.

Пазнаёміцца з экспэрымэнтатарамі варта, але трэба адразу маральна падрыхтавацца, што знаёмства зь беларускімі электрапопэрамі будзе няпростым.

**Сяргей Будкін**

# Паўстаньне ў Эквадоры

У Эквадоры народныя дэманстрацыі прымусілі прэзыдэнта Гуцьерэса сысьці ў адстаўку і пакінуць краіну. Як гэта адбывалася і хто стаяў за гэтым? Якая роля ЗША ў гэтых падзеях? Чаму невялікія дзяржавы робяцца ўсё больш незалежнымі ў сучасным сьвеце? Эквадорскія падзеі аналізуе левы амэрыканскі сацыёляг **Імануіл Валерстайн**.



ІМАНУІЛ ВАЛЕРСТАЙН (нар. у 1930 г. у Нью-Ёрку) — Амэрыканскі гісторык, сацыёляг, прафэсар Ельскага ўнівэрсытэту, нязьменны з 1976 г. дырэктар Цэнтру дасьледаваньняў эканомікі, гістарычных сыстэмаў і цывілізацый імя Фэрнана Брадэля. Аўтар фундамэнтальнай працы «Сучасная сьветасыстэма». Апублікаваў больш за 20 кніжак і звыш 300 артыкулаў. Ягоная апошняя кніга — «Заняпад Амэрыкі: ЗША ў сьвеце хаосу» (2003).

Даўней у кітайцаў існавала катаваньне «лін чы» — сьмерць ад тысячы парэзаў. Усе тыя парэзы былі маленькія, але ўрэшце чалавек паміраў. Гэта акурат тое, што адбываецца цяпер з панаваньнем ЗША ў Лацінскай Амэрыцы. Апошнім маленькім парэзам (а гэта сапраўды маленькі парэз) сталі эквадорскія падзеі. Эквадор — гэта невялікі край, што праўда, з пэўнымі важнымі асаблівасьцямі: ён здабывае нафту. У ім ёсьць вельмі шматлікае карэннае насельніцтва, гістарычна адлучанае ад улады, і, вядома ж, эксплюатаванае эканамічна і сацыяльна. Ён мяжуе з Калюмбіяй, дзе ўжо на працягу вельмі доўгага часу ідзе ды не спыняецца грамадзянская вайна і дзе Злучаныя Штаты моцна заблыталіся ў сваёй падтрымцы надта кансэрватыўнага ўраду. Гэта таксама краіна, у якой цягам апошніх дзесяці гадоў тры прэзыдэнты былі скінуты з пасады ў выніку народных паўстаньняў — кожны раз гэта адбывалася, прынамсі, пры маўклівай падтрымцы ўзброеных сілаў.

> Сёньня ЗША ўжо ня могуць быць пэўнымі што да свайго кантролю над амэрыканскім кантынэнтам.

ЭКВАДОР — дзяржава на паўночным захадзе Паўднёвай Амэрыкі. Плошча 283,56 тыс. км². Насельніцтва 12 920 тыс. чалавек. Дзяржаўная мова — гішпанская. Грашовая адзінка — сукрэ. Дзень незалежнасьці — 10 жніўня. Прэзыдэнцкая рэспубліка. Прэзыдэнт абіраецца на 4 гады, як і аднапалатны Нацыянальны кангрэс. Займае 4 месцы ў Лацінскай Амэрыцы па нафтаздабычы, мае істотныя запасы газу, сусьветны экспартэр бананаў. Старое места Кіта ўключанае ЮНЭСКА ў сьпіс сусьветнай спадчыны.




У 1997 г. Абдала Букарам, выбраны дзякуючы сваёй плятформе барацьбы з алігархіяй, замест гэтага пачаў ажыцьцяўленьне суворай эканамічнай праграмы (у адпаведнасьці з рэкамэндацыямі былога міністра фінансаў Аргентыны Дамінга Кавальё), за якую выступаў МВФ (і якую да таго ажыцьцявіў у Аргентыне сам Кавальё). Пасьля двухдзённай забастоўкі прафсаюзаў, студэнтаў, жаночых арганізацый, праваабарончых арганізацый і «CONAIE» (Фэдэрацыі карэнных народаў Эквадору) эквадорскі Кангрэс зьняў Букарама з пасады з фармулёўкай за «псыхічную няўстойлівасьць». Наступныя выбары прывялі да ўлады іншага кансэрватара, Хаймэ Магуада, які працягнуў «далярызаваць» эканоміку. Тады на пачатку 2000 г. чарговае народнае паўстаньне зрынула і яго. Гэтае забурэньне ўзначаліла згуртаваньне арганізацый карэннага насельніцтва і «народных палкоўнікаў», чый лідэр Люсіё Гуцьерэс, на думку Злучаных Штатаў, быў зьвязаны з вэнэсуэльскім прэзыдэнтам Чавэсам.

Сілы рэжыму зноў справіліся з сытуацыяй. Гуцьерэс зьехаў на выгнаньне, а верх узяў віцэ-прэзыдэнт Густава Набоа. Праўда, у выніку чарговых выбараў у 2002 г. Гуцьерэс, скарыстаўшыся магутнай падтрымкай арганізацый карэннага насельніцтва, перамог Набоа. Тыя выбары лічыліся перамогай левых. Аднак, трапіўшы да ўлады, Гуцьерэс зьмяніў свае перакананьні. У 2003 г. ён наведаў Вашынгтон, дзе абвясьціў сябе «найлепшым сябрам Злучаных Штатаў» у Лацінскай Амэрыцы. Неўзабаве прадстаўнікі руху карэннага насельніцтва выйшлі са складу ўраду, а Гуцьерэс прапанаваў Злучаным Штатам новую вайсковую базу і стаў палкім прыхільнікам «пляну «Калюмбія» (ачольванага ЗША пляну падтрымкі калюмбійскага ўраду ў яго барацьбе супраць партызанаў ды, як сьцьвярджаюць ЗША, супраць наркагандляроў). Эквадор таксама актыўна перагаворваўся са Злучанымі Штатамі наконт укладаньня дамовы аб вольным гандлі. Хоць цэны на нафту спрыялі дзяржаўнаму бюджэту, ані шэлега з гэтых грошай не трапляла велізарнай большасьці насельніцтва. Апошняй кропляй, пасьля якой усё гэта палілося цераз край, стала рэфармаваньне Гуцьерэсам Найвышэйшага суду краіны, каб новы суд змог памілаваць Букарама, які не марудзіў вярнуцца ў Эквадор і праз сваю партыю надаць парлямэнцкую падтрымку Гуцьерэсу.

Тады ў красавіку ў Эквадоры выбухнула чарговае паўстаньне. Гуцьерэс абазваў дэманстрантаў forajidos — тымі, хто ўцякае. Дэманстранты тут жа з гонарам прысвоілі сабе гэтае імя і праз пару дзён ператварылі самога Гуцьерэса ў forajido. Гэтым разам паўстаньне ахапіла ня толькі звычайных яго завадатараў — рухі карэннага насельніцтва, але і пэўныя сэгмэнты сярэдняе клясы, якіх на бунт узьняла карумпаванасьць Гуцьерэса і Букарама. Войска зноў адступіла ўбок, а Гуцьерэса зьмяніў ягоны віцэ-прэзыдэнт, больш левы Альфрэда Палясіё. З тае пары мы бачым супярэчлівыя адзнакі новае палітыкі. Палясіё прызначыў умеркавана левага каталіка Рафаэля Карэа на пасаду міністра фінансаў, і адной зь першых заяў таго стала выказваньне, што, маўляў, сорак адсоткаў дзяржбюджэту пойдуць на выплату дзяржаўнага доўгу, а на ахову здароўя і адукацыю будзе выдаткавана толькі 2%. Хаця ўрад запэўніў ЗША, што ён дазволіць заставацца іх ужо існуючай вайсковай базе, але новы кабінэт ня мае намеру будаваць дадатковую ўзбуйненую базу, на што пагаджаўся Гуцьерэс.

ЗША асьцярожна прызналі новы ўрад пасьля немалой затрымкі. Кастра і Чавэс віталі перамены, але некаторыя «рэвалюцыйныя групы» наракаюць на тое, што гэтыя перамены няшмат чаго зьмяняюць. Чаго ж зараз нам варта чакаць? Мабыць, што гэтым разам мы ўбачым вялікі спад усіх праяў дзейнасьці, што патыхаюць нэалібэралізмам. Партыі карэннага насельніцтва ўжо адваявалі колькі месцаў у парлямэнце, якія былі страчаныя імі праз тое, што некаторыя дэпутаты, выбраныя па іх сьпісах, перайшлі ў партыі, якія падтрымлівалі Гуцьерэса.



**Прэзыдэнт Гуцьерэс спачатку схаваўся ад дэманстрантаў у бразільскім пасольстве, а пасьля ўвогуле ўцёк у Бразылію.**

Эквадорскае паўстаньне ўпісваецца ў мадэль падзей, што назіраюцца ў Лацінскай Амэрыцы вось ужо дзесяць гадоў, асабліва пасьля прыходу да ўлады Джорджа Буша. Зусім нядаўна, калі пэўны ўрад у Лацінскай Амэрыцы раздражняў ЗША, дык ЗША звычайна давалі рады яго зьмяніць — простым сілавым умяшаньнем, калі неабходна, альбо праз выкарыстаньне тамтэйшых вайскоўцаў. Такім быў лёс Гватэмалы, Дамініканскай Рэспублікі, Чылі, Бразыліі ды многіх іншых. Адзіным вартым увагі правалам у гэтых адносінах была Куба, але ЗША здолелі мабілізаваць амаль усе лацінаамэрыканскія краіны на супрацоўніцтва ў ізаляцыі/блякадзе/байкоце Кубы.

З другога боку, за апошнія пяць гадоў многія краіны Лацінскае Амэрыкі пасунуліся ўлева — праз выбары альбо праз народныя дэманстрацыі, — аднак гэтае «лева» ніколі не было «цалкам левым». Пералік немалы: Аргентына, Бразылія, Уругвай, Балівія, Чылі, Вэнэсуэла. Насамрэч у нашы дні ўраду ЗША сапраўды прыходзіцца даспадобы ў Паўднёвай Амэрыцы толькі адзін урад Калюмбіі. Надоечы адбываліся выбары Генэральнага сакратара Арганізацыі Амэрыканскіх Дзяржаў. І ўпершыню ў гісторыі гэтае арганізацыі кандыдат ЗША ня здолеў выйграць. Мэксыканскі ўрад нядаўна паспрабаваў адхіліць ад удзелу ў чарговых прэзыдэнцкіх выбарах кандыдата левае партыі. Але мусіў адступіць пад народным ціскам у самой Мэксыцы. Куба ўжо даўно не пачувае сябе ізаляванай у Лацінскай Амэрыцы. Нішто з гэтага не выклікае радасьці ў Вашынгтоне.

Вось яны — гэтыя малыя парэзы. Ніводная з гэтых дзяржаў, нават Вэнэсуэла, не зайшла занадта далёка. Аднак Бразылія зладзіла ў Сусьветнай гандлёвай арганізацыі бунт «вялікай дваццаткі», які даўёў арганізацыю да фактычнага прыпыненьня сваёй дзейнасьці. Аргентына адкрыта не падпарадкавалася сусьветнай фінансавай супольнасьці і здолела істотна скараціць свае пратэрмінаваныя запазычанасьці. Усеамэрыканская асацыяцыя вольнага гандлю (Free Trade Association of the Americas, або ALCA ў гішпанскім скарачэньні) коціцца ў нікуды, дарма што застаецца першаснай эканамічнай мэтай ЗША ў Лацінскай Амэрыцы.

Левыя інтэлектуалы і некаторыя левыя рухі ў кожнай з гэтых краін пераймаюцца ўсім тым, чаго так і не зрабілі нібыта-левыя ўрады. Аднак ЗША яшчэ больш пераймаюцца тым, што яны нарабілі. Факт, што сёньня ЗША ўжо ня могуць быць пэўнымі што да свайго кантролю — у эканамічным, палітычным ці дыпляматычным пляне — над уласным падворкам — амэрыканскім кантынэнтам. Гэта і ёсьць сьмерць ад тысячы парэзаў — маленькіх, але ад таго ня менш сьмяротных.

**З ангельскай пераклаў Сяргей Богдан**

# Справа Рыбакова

Працяг са старонкі 2.

Рыбакоў нават не спрабаваў неяк прыкрыць недапушчальныя парушэньні ўмоў тэндэру. Больш за тое, яму так карцела атрымаць «зробленыя» грошы, што ўжо 29 чэрвеня ён аддае распарадчай дырэкцыі Белтэлерадыёкампаніі загад аб пераводзе завышанай сумы кантракту на разьліковы рахунак ВПУП «Валідыя», пасьля чаго ў працоўным кабінэце атрымлівае ад Ганчарова 9 тыс. даляраў гатоўкай. Само абсталяваньне паступіла ў НДТРК толькі 29 жніўня.

Падчас атрыманьня першага хабару паміж Рыбаковым і Ганчаровым была дасягнута чарговая дамоўленасьць: «Валідыя» выйграе тэндэр на пастаўку тэлевізійных журналісцкіх камплектаў для Агенцтва тэлевізійных навін на тых жа ўмовах — 10% «адкату» ад зьдзелкі.

Сказана — зроблена. 3 жніўня 2001 г. прыватнае прадпрыемства зноў выйграе тэндэр, прапанаваўшы журналісцкія камплекты коштам 88 627 даляраў. Гэтым разам скромнічаць у паборы з падаткаплатнікаў ня сталі ні Рыбакоў, ні Ганчароў. Яны падпісалі дагавор №142, дзе цана абсталяваньня была завышана ў параўнаньні з тэндэрнай на 37 тыс. (!) даляраў. З гэтай сумы 11 тыс. гатоўкай атрымаў Рыбакоў, які забясьпечыў пералічэньне сродкаў ужо праз тры дні пасьля падпісаньня кантракту, а астатнія дасталіся фірме «Валідыя».

## Люты апэтыт

Апэтыт Ягора Рыбакова яшчэ больш узрос, калі гаворка пайшла пра новыя буйныя кантракты. У жніўні 2001 г. НДТРК быў заключаны дагавор №0134 з ангельскай кампаніяй *Continental Microwave* на пастаўку спадарожнікавай перасоўнай станцыі коштам 481 952 даляры. Інтарэсы ангельскай кампаніі ў Беларусі лабіравала тая ж «Валідыя» ў асобе Ганчарова, зь якога Рыбакоў запатрабаваў 12 тыс. даляраў. Дырэктар ПП перадаў «просьбу» ангельцам, але тыя катэгарычна адмовіліся даваць хабар. Замежнікі, што зь іх узяць! Нежаданьне замежных партнэраў «дзяліцца» толькі раззлавала Рыбакова. Ён націснуў на Ганчарова і змусіў яго выкласьці 5 тыс. даляраў. Гэта каля 1% ад сумы зьдзелкі. На момант атрыманьня гэтых грошай Рыбакоў быў ужо паўнапраўным старшынём НДТРК, без ранейшай прыстаўкі «в.а.». Задаволіцца толькі адным адсоткам замест ранейшых дзесяці было неяк несамавіта, і колішні в.а. запатрабаваў ад Ганчарова штомесячных выплат па 2,5 тыс. даляраў. Так цягам студзеня—ліпеня 2002 г. старшыня НДТРК атрымаў гатоўкай яшчэ 17 500 даляраў.

Калі грошы пачалі цячы пастаянна і ў вялікай колькасьці, Рыбакоў азадачыўся іх улікам, захоўваньнем і размеркаваньнем. Ён запатрабаваў ад Ганчарова набыцьця сыстэмы «Банк—кліент» і адкрыцьця рахунку на падстаўную кампанію ў адным з замежных банкаў. Выконваючы заданьне, кіраўнік прадпрыемства «Валідыя» накіроўваецца ў Маскву, купляе дакумэнты аб заснаваньні кампаніі *Sable Corporation* зь юрыдычным адрасам у ЗША і банкаўскім рахункам 1-469-0023303-0201, адкрытым у АТ *Aizkraukles banka*. Ганчароў набывае Рыбакову за 1200 даляраў сыстэму «Банк—кліент» і ноўтбук «Сымэнз» для кіраваньня сыстэмай.

Калі ўсё гэтае дабро трапіла ў распараджэньне Рыбакова, у яго разгарэўся люты апэтыт да фінансавай дзейнасьці. Ён ужо не задавальняецца «адкатамі» і займаецца адкрытым вымагальнем. Штучна стварае сытуацыю з затрымкай аплаты па кантрактах зь фірмамі, якія прадстаўляў Ганчароў, і патрабуе за выплату грошаў ня толькі кантракты, але й далей. Шантажуючы тым, што затрымлівае «вылучэньне пытаньняў зь неплацяжамі вялізных грошай».

Як было ўстаноўлена сьледзтвам, НДТРК ня мела недахопу ў сродках, а вось сума запазычанасьці кампаніям Ганчарова складала некалькі мільёнаў даляраў. Гэта вымушае Ганчарова зноў плаціць. Паводле падлікаў сьледчых, са жніўня 2002 г. па кастрычнік 2003-га на рахунак Рыбакова ў *Aizkraukles banka* паступіла 119 446 даляраў. Акрамя таго, Ганчароў за гэты пэрыяд перадаў гатоўкай яшчэ 10 тыс. Але Рыбакову гэтага было мала. Пагражаючы не рабіць аплаты па раней заключаных і выкананых дагаворах з ганчароўскімі прадпрыемствамі, ён патрабае давесьці пазначаныя вышэй сумы да 500 тыс. даляраў і перавесьці іх на яго рахунак.

## Хатка па-над рэчкаю

Такія грошы старшыню НДТРК былі патрэбны на добрыя мэты: ён нагледзеў для сям'і дамок у Цнянцы, што пад Менскам, коштам 500 тыс. даляраў.

У лістападзе 2003 г. Рыбакоў пераводзіць на рахунак гаспадара «залатога» цераму 280 тыс. даляраў, атрыманых ім у якасьці хабару ад Ганчарова. У сьнежні спадарыня Рыбакова перадае гаспадару дома яшчэ 70 тыс. гатоўкай. Астатнія 150 тыс. Рыбаковы абавязваюцца выплаціць па працягу трох месяцаў. Іх паступленьне планавалася ад «спагадлівага» Ганчарова.



«ВДГ ДСП»

Згодна з паказаньнямі Рыбакова, ён штомесяц атрымліваў на спэцпраекты 6500 даляраў і даваў за іх справаздачу асабіста прэзыдэнту. Справу пра хабарніцтва немагчыма было схаваць, аднак суд прайшоў пры зачыненых дзьвярах.

Цнянскі домік быў аформлены на нейкую грамадзянку Карашкевіч Н.І., якая ў натарыяльнай канторы паставіла свой подпіс «там, дзе сказалі». Сям'я Рыбаковых пражыла ў вёсцы каля трох месяцаў і вярнулася ў гарадзкую кватэру. Загадную цішыню на гарадзкі шум дапамог зьмяніць Ганчароў, у якога непамерны апэтыт галоўнага тэлевізіёншчыка выклікаў абурэньне. Замест пералічэньня астатніх 150 тыс. даляраў ён зьвярнуўся ў праваахоўныя органы з заявай, якая прыйшлася вельмі дарэчы. Цярпеньне лопнула ня толькі ў Ганчарова.

## На шырокую нагу

Дом у паўмільёна даляраў быў апошняй пакупкай Рыбакова, праўда, так і не давядзенай да канца. Арышт старшыні НДТРК і немагчымасьць атрыманьня астатніх 150 тыс. даляраў прымусілі цнянскага прадаўца разарваць зьдзелку. Уладальніку дома давялося вярнуць атрыманыя ім грошы, але ўжо не Рыбаковым, а ў пракуратуру.

Вось яшчэ некалькі фактаў, якія характарызуюць фінансавы лад жыцьця нашага героя. Джып «Судзукі Гранд Вітара ХЛ 7» абышоўся ў 20 тыс. даляраў. Пры вобыску ў кватэры Рыбакова знойдзена ювэлірных вырабаў на 13 тыс. даляраў і амаль 40 тыс. даляраў ды 11 тыс. эўра гатоўкай. За рамонт сваёй кватэры старшыня НДТРК выклаў, як падлічылі сьледчыя, 13 тыс. даляраў. Летні адпачынак у Турцыі абышоўся яму ў суму, якая перавышае 6 тыс. даляраў. Былі ўстаноўлены два факты, калі Рыбакоў даваў у доўг па 60 тыс. і 70 тыс. даляраў.

## Прыкрыцьцё

Паколькі слуханьні крымінальнай справы Рыбакова праходзілі пры зачыненых дзьвярах, назіральнікі так і не зразумелі, якія дзяржаўныя таямніцы там хаваліся і чаму Рыбакову былі вынесены такі суровы прысуд. Адказы на гэтыя пытаньні хаваюцца ў акалічнасьцях папярэдняга расьсьледаваньня крымінальнай справы і яе разгляду ў судзе.

Рыбакоў выбраў бязглуздую, калі не сказаць самазабойчую, тактыку абароны: жадаючы прыкрыць сваю сараматy, ён выставіў напаказ сарамату беларускіх уладаў, расказаўшы, як рыхтаваліся і фінансаваліся на БТ усім вядомыя спэцпраекты. Згодна са сьцьверджаньнем Рыбакова, ён штомесяц атрымліваў на спэцпраекты 6,5 тыс. даляраў і па іх выкарыстаньні даваў справаздачу асабіста прэзыдэнту. Старшыня НДТРК адкрыта заявіў сьледчым, што прысвойваў выдзеленыя на спэцпраекты грошы. Спачатку ён называў суму 140—150 тыс. даляраў, потым павялічыў яе да 160—180 тысяч.

Адбіваючыся ад абвінавачаньня ў атрыманьні буйнога хабару (ч.3 арт.430 КК РБ), Рыбакоў фактычна прызнаўся ў крадзяжы шляхам злоўжываньня службовымі паўнамоцтвамі (ч.4 арт.210 КК РБ). Як той казаў, хрэн за рэдзьку не саладзейшы. Па гэтых артыкулах прадугледжаны аналягічныя пакараньні — да 15 год пазбаўленьня волі. Так няўмела апраўдваючыся, падсудны рэальна рызыкаваў падпасьці пад абвінавачаньне адначасова па абодвух артыкулах, і тады кара была б яшчэ больш жорсткай. На што ж ён разьлічваў?


АР

Усё проста. Яму не маглі прад'явіць абвінавачаньне ў крадзяжы сродкаў, якіх афіцыйна не існуе. Акалічнасьці справы Рыбакова адназначна сьведчаць, што фінансаваньне спэцпраектаў ажыцьцяўлялася не зь дзяржбюджэту, а з крыніц, падсправаздачных толькі аднаму чалавеку.

## Закон ня пісаны

У справе былі «засьвечаны» і іншыя доказы «левага» валютнага фінансаваньня спэцпраектаў. Напрыклад, дакладная запіска Рыбакова на імя прэзыдэнта №36/1147 за 28 лістапада 2003 г., дзе давалася справаздача аб выкарыстаньні атрыманых даляраў. Няма неабходнасьці даводзіць, што прэзыдэнт краіны не зьяўляецца супрацоўнікам бухгальтэрыі НДТРК. Узьнікае пытаньне: чаму за расходаваньне гэтых сродкаў Рыбакоў даваў справаздачу не бухгальтэрыі, як гэта мае быць, а кіраўніку дзяржавы? І навошта прэзыдэнту справаздача па грошах, якіх ён не выдаваў?

Факт, што ў НДТРК мелі месца «левыя» паступленьні валюты, якія не праходзілі праз звычайную фінансавую справаздачнасьць, пацьвердзіў і намесьнік старшыні НДТРК Аляксандар Мартыненка. Згодна зь яго паказаньнямі ў судзе, па так званым спэцпраекце ён выдаваў журналістам АТН каля 3 тыс. даляраў у месяц. Можна дапусьціць, што Мартыненка падпрацоўваў касірам у НДТРК, але нават у гэтым выпадку ён ня мог выдаваць журналістам грошы ў валюце. Гэта забаронена законам.

Небезьвядомы Рыгор Кісель, даючы паказаньні ў судзе, расказаў, што расходаваньне сродкаў па спэцпраекце кантралявалася і вялося толькі па мэтавым прызначэньні — выключна для журналістаў АТН. Зрэшты, да журналістаў даходзіла толькі частка сумы: Рыбакоў, паводле яго слоў, на спэцпраекты атрымліваў штомесяц 6,5 тыс., а Мартыненка выдаваў «чэсным» толькі 3 тысячы. Дзе ж рэшта?

## Асаблівы падыход

Калі б разбор вёўся так, як таго патрабуе закон, сьледчыя і суд абавязаны былі б высьветліць, хто даваў Рыбакову і журналістам АТН валюту, зь якіх крыніц вялося фінансаваньне спэцпраекту, чаму яно не праходзіла праз бухгальтэрыю НДТРК, а калі праходзіла (ня выключана і такая магчымасьць), то якім чынам. Паколькі справаздачы па выкарыстаньні валюты Рыбакоў накіроўваў у Адміністрацыю прэзыдэнта на імя кіраўніка дзяржавы, то можна было б высьветліць сумы ўсіх выплат. Але і гэтага зроблена не было.

Справа дайшла ўвогуле да маразму. Як канстатаваў суд, прыведзеныя абвінавачваным крыніцы дастатку, якія ён хацеў выкарыстаць для пакупкі дому ў вёсцы, не пацьвярджаюцца доказамі, бо з кастрычніка 2003 г. так званы спэцпраект ужо не існаваў і Рыбакоў ня мог разьлічваць на паступленьне сродкаў зь яго. Іншымі словамі, судзьдзя толькі абазначыў часавыя рамкі паступленьня незаконнай валюты, ня даўшы гэтаму ніякай юрыдычнай ацэнкі. З такім жа посьпехам можна было не зьвяртаць увагі і на прызнаньні забойцы, робячы акцэнт на тое, што ён пазбавіўся ад прылады злачынства і больш ня мог яе скарыстаць.

## Добры жарт

Паводле прыгавору зь Ягора Рыбакова была спагнана нанесеная дзяржаве шкода ў памеры 212,933 млн руб., што складае каля 100 тыс. даляраў. Як няўдалы жарт можна прымаць і пастанову суду ў той частцы, дзе асуджанаму дадзены тэрмін добраахвотнага пагашэньня шкоды ў частцы грамадзянскага іску — да 1 красавіка 2005 г. Жарт заключаецца ня ў даце, а ў тым, што ў выпадку адмовы ад добраахвотнага пагашэньня шкоды суд пастанавіў зьвярнуць спагнаньне на грашовыя сродкі Рыбакова, якія былі арыштаваныя і здадзеныя на захаваньне ў бухгальтэрыю пракуратуры рэспублікі. Гаворка ідзе пра грошы, адабраныя ў абвінавачванага пры вобыску, а таксама вернутыя прадаўцом дому. Гэта — пад 360 тыс. даляраў і 11 тыс. эўра, якія пасьля вынясеньня прыгавору павінны былі быць канфіскаваныя ў даход дзяржавы. Цяпер жа выходзіць, што Рыбакоў кампэнсуе імі нанесеную Белдзяржтэлерадыёкампаніі шкоду. Але калі грошы не былі канфіскаваны ў даход дзяржавы, а зь іх толькі 100 тыс. спагнаны на кампэнсацыю шкоды НДТРК, дык каму адышлі 260 тыс. даляраў і 11 тыс. эўра, якія засталіся?

# Хто пераможа

Зоркі спрыялі Лукашэнку ў 2004 годзе Малпы. 2006–ты год Сабакі — не ягоны. Ён спрыяе народжаным у гады Каня і Сабакі. Калі верыць клясычнай астралёгіі, ён будзе для Беларусі годам пераменаў. Самы ж небясьпечны праціўнік для Панны — Рыба. Асновы астралёгіі вывучаў **Мікола Багдановіч**.

Знаўцы клясычнай астралёгіі даводзяць, што чалавек, які нарадзіўся ў пэўны год ці месяц, мае толькі яму ўласьцівыя рысы. Бо зоркі, як і гадавыя і шматгадовыя прыродныя цыклы, ня могуць не ўплываць на нараджэньне і разьвіцьцё чалавека.

## Дэспатычныя пераходы

Напачатку пра знакі задыяка.

Паводле астролягаў, тыранічныя рысы характару найчасьцей выяўляюцца ў людзей, народжаных пад пераходам з знаку на знак, на якіх адбіліся рысы адразу дзьвюх сумежных дэспатычных «жывё-



Гэта людзі, што нарадзіліся ў 20-х чыслах кожнага месяца. Плюс/мінус некалькі дзён.

Найбольш небясьпечным лічыцца пераход з сузор'я **Авэна ў Цяльца** (трэцяя дэкада красавіка). На думку вядомага расейскага астроляга Сяргея Вронскага, людзі, народжаныя ў апошняй дэкадзе красавіка, «на рэдкасьць ганарлівыя, самаўлюбёныя, цынічныя, з прагай пахвалы. Яны навязваюць сваю волю, капрызы і прыхамаці, эгаістычныя, карысьлівыя, жорсткія, бязьлітасныя, нягнуткія, упартыя і бескампрамісныя». Да такога пераходнага знаку належаць Адольф Гітлер (20.04.1889 даты нараджэньня даюцца паводле новага стылю), Уладзімер Ленін (22.04.1870,), Зянон Пазьняк (24.04. 1944), Уладзімер Жырыноўскі (25.04.1946), Садам Хусэйн (28.04.1937).

## У адным шэрагу з Чаўшэску і Мілошавічам

Небясьпечным зьяўляецца дэспатычны пераход **«Стралец—Казярог»** — Леанід Брэжнеў (19.12.1906), Іосіф Сталін (21.12.1879), Мао Дзэ-дун (26.12.1893) — а таксама пераход **«Казярог—Вадаліў»** — Эдуард Шэварднадзэ (25.01.1928) ды Нікалае Чаўшэску (26.01.1918), што прывялі свае краіны да эканамічнага калапсу.

Прэзыдэнт Беларусі нарадзіўся пры канцы жніўня (30.08.1954), калі дзейнічае пераход **«Леў—Дзева».** Да гэтага пераходу належаць Напалеон Банапарт (15.08.1769), цар Іван IV Жахлівы (25.08.1530), кіраўнік ГДР Эрых Хонэкер (25.08.1912), Слабадан Мілошавіч (29.08.1941) ды рымскі імпэратар Калігула (31.08.12).

## Аратары-Коні

Важную ролю ў лёсе чалавека адыгрывае і год нараджэньня. Так, на думку С.Вронскага, людзі, што нарадзіліся ў год Каня (1918, 1930, 1942, 1954, 1966, 1978), «маюць аратарскі талент, любяць вялікія відовішчы і забавы, імкнуцца быць у цэнтры ўвагі і падзей, нікога ня слухаюць, робяць, што хочуць, на сьвет глядзяць толькі са сваёй званіцы, пасьпяховыя ў палітыцы. Часам самаўпэўненасьць у іх зьмяняецца на недавер да сябе, які выклікае ўспышкі гневу і ярасьці. Яны сапраўдныя эгаісты; могуць растаптаць любога, хто апынецца на іх шляху перашкодай; любяць слухаць у свой адрас пахвалу і адабрэньне; нетактоўныя, вострыя на язык, рызыкоўныя і авантурныя».

## Кар'ерныя цыклы

Астроляг Рыгор Кваша ў «Цыклічным гараскопе» энцыкляпэдыі гараскопаў «Знайдзі сябе па знаку нараджэньня» пайшоў далей і вызначыў нават кар'ерныя цыклы для кожнага з гадоў.

Так, з 12-гадовага цыклу для кар'еры вельмі важныя свой год, два супольныя зь ім (±4 і ±8 гадоў) і чатыры кармічныя: кармічны год (рэвалюцыйны, пераломны), год адсутнасьці слугі (другі кармічны), антыкармічны (самы пасьпяховы, але сьмяротна небясьпечны) і адсутнасьці гаспадара (другі антыкармічны, небясьпечны, але добры для кар'ернага прасоўваньня тых, у каго кар'ера адстае ад рэальных магчымасьцяў і здольнасьцяў).





## Конскія посьпехі правіцеля

Праілюструем прыведзеную ніжэй табліцу. Прэзыдэнт Беларусі нарадзіўся ў 1954 г. (год Каня), стаў дэпутатам парлямэнту ў 1990 г. (год Каня), кіраўніком дзяржавы — у год Сабакі (1994), які наагул спрыяльны для гадоў гэтай тройкі «валевікоў» — Каня, Тыгра і Сабакі. 1996 год (год Пацука) быў для яго кармічным і мог або «раздушыць» імпічмэнтам, або даць новыя далягляды ўлады яшчэ на 12 гадоў. Дарэчы, апошні рэфэрэндум быў праведзены ў 2-гі антыкармічны год Малпы (2004).

Аналягічны лёс напаткаў камуністычнага кіраўніка Беларусі Пятра Машэрава, які нарадзіўся ў год Каня (26.02.1918). Гады



Каня былі лёсавырашальнымі ў кар'еры: у 1942 — камандзір партызанскага атраду, у 1954 г. — другі сакратар Менскага абкаму КПБ, з 1966 г. — член Прэзыдыюму ВС СССР. У антыкармічным 1959 год Кабана Машэраў стаў сакратаром ЦК КПБ.

## Пасткі для Каня

Варта таксама памятаць, што другі антыкармічны год Малпы (1980, 1992, 2004) вельмі небясьпечны для Каня. У гады Малпы памерлі Машэраў і прафэсар Міхась Ткачоў (нар. у 1942 г., год Каня, памёр у 1992 г.). Наступны небясьпечны год для людзей, народжаных у год Каня — 2016.

Але прэзыдэнт нарадзіўся таксама пад знакам Дзевы, а для такіх людзей уяўляе небясьпеку знак Рыбаў, што разьмешчаны якраз насупраць. Адлічыце шэсьць месяцаў.

## Рыбы-пераможцы

Віктара Ючшанку (23.02.1954), Міхаіла Гарбачова (02.03.1931), Васлава Каштуніцу (24.03.1944) яднае ня толькі тое, што яны прынесьлі з сабой дэмакратыю. Усе яны нарадзіліся блізу сузор'я Рыбы (20.02—21.03 ±3дні)! Прычым Рыба-Гарбачоў прыйшоў на зьмену Дзеве-Чарненку, Рыба-Каштуніца —Дзеве-Мілошавічу.

Рыбы хоць і лічацца самым слабым знакам задыяку, але, здараецца, сам Лёс выбірае іх, каб перамагчы больш моцных.

## Якія яны — рыбы?

Рыбы — інфармацыйны водны знак. Яны мяккія, лагодныя, цярплівыя, пяшчотныя, шчырыя, сьціплыя, вельмі зычлівыя і сяброўскія, ня любяць гвалту і зьдзекаў, і ў адрозьненьне ад іншых знакаў, не падпадаюць пад дэспатычныя пераходы задыяку. Рыбкі богабаязныя, часьцей праўдалюбцы, стараюцца нікога ня крыўдзіць, гатовыя бескарысьліва дапамагчы людзям, апекаваць хворых, старых і слабых, гуманныя і альтруістычныя. За ўсё гэта іх і шчыра любяць у народзе.

Добрыя аратары, разумныя, духоўна і інтэлектуальна разьвітыя, дабрадушныя і сумленныя, але адначасова і славалюбівыя, што і штурхае іх у палітыку з высакародным жаданьнем стварыць ідэальнае, гарманічнае, справядлівае грамадзтва. Бо яны — ідэалістычнага, рэлігійнага, філязофскага складу мысьленьня. Ім адкрыты невядомыя тайны прыроды і Сусьвету, астралёгіі, рэлігіі, псыхалёгіі і нетрадыцыйнай мэдыцыны. Каб усе былі «рыбкамі», не было б войнаў, бо яны не трымаюць зла нават на ворагаў. У той жа час яны ўпартыя, рашучыя і настойлівыя ў дасягненьні высакароднай мэты. Могуць стаць змагарамі і абаронцамі прагрэсіўных ідэй і глябальнай перабудовы, ахвяруючы здароўем і часам.

## Фатальны дэфіцыт Рыбы

Таму можа быць прычына ў паразе выбараў-2001 у тым, што ні Домаш (02.01.1950), ні Ганчарык (29.04.1940), ні Гайдукевіч (08.09.1954) не былі паводле гараскопу Рыбамі? Мо пакуль адзіным кандыдатам ад апазыцыі ня стане «рыб-

# ў год Сабакі

ка», ніякія рэсурсы й паліттэхналёгіі нам не дапамогуць? І варта зважаць ня толькі на палітычныя заслугі перад грамадзтвам, а таксама і разьмяшчэньне зорак?

Паводле астролягаў, наступны, 2006-ты, год Сабакі (1910, 1922, 1934, 1946, 1958, 1970, 1982, 1994) можа несьці рэвалюцыйныя перамены ў краіне, народжанай пад знакам Авэна (25 Сакавіка), а вось 2005 год (Пеўня) для рэвалюцый неспрыяльны.

Гады Пеўня (1909, 1921, 1933, 1945, 1957, 1969, 1981, 1993) — даволі жорсткія, рэакцыйныя, гады навязваньня «парадку», зь цяжкай працай і пагрозай беспрацоўя, зь людзьмі ў вайсковай форме ў імя «парадку», з высокай ступеньню злоўжываньняў і злачынстваў.

Затое 2005 год спрыяльны для прыняцьця важных рашэньняў, а наступны, 2006-ты, — для іх выкананьня.

## Шукаем Коней, Тыграў і Сабак

2006 год спрые перамогам людзей, якія нарадзіліся ў цотны год. Асабліва спрыяльным ён абяцае быць палітыкам, народжаным пад знакамі Тыгра, Сабакі і Каня.

Калі верыць клясычнай астралёгіі, няпростым абяцае быць гэты год для прэтэндэнта на званьне «адзінага кандыдата»,



новага лідэра сацыял-дэмакратаў Аляксандра Казуліна (25.11.1955 — Стралец-Каза). Крыху болей шанцаў у партнэраў па кааліцыі «Дзясятка» — Лябедзькі (27.06.1961, Бык) і Шушкевіча (15.12.1934, Сабака).



2006 год найбольш спрыяльны для людзей гадоў-«валевікоў»: Каня (1954, 1966), Сабакі (1958, 1970) і Тыгра (1950). Для Тыгра гэты будзе яшчэ і



другі антыкармічны год — сьмяротна небясьпечны і кар'ерны, як для Ючшанкі (году Каня) быў 2004-ты год Малпы. Таму, калі апазыцыі карціць пайсьці па ўкраінскім варыянце зьмены ўлады, як мінімум, трэба вылучыць чалавека, які нарадзіўся ў год Тыгра або Сабакі. І, пажадана, пад сузор'ем Рыбы. Ну і пажадана, каб ён быў надзейным чалавекам і быў маладзейшым за сёньняшняга прэзыдэнта.

Паводле гэтага гараскопу, найлепшую для перамогі кандыдатуру трэба шукаць сярод людзей, што нарадзіліся між **20.02—25.03** (Рыбы зь перах одам уАвена) у **гады Сабакі й Тыгра.**

**Год Тыгра** (1938, 1950, 1962) надзяляе людзей супрацьлеглымі характарамі



— або вельмі пазытыўным, або вельмі адмоўным.



Першыя — сьмелыя, самаахвярныя і добрыя рыцары гонару і справядлівасьці, якія настойліва бароняць слабых, высакародную ідэю і справу.

Другія — ганарыстыя, самаўпэўненыя, нястрыманыя, упартыя да наравістасьці, уражлівыя, запальчывыя і раздражняльныя, жорсткія, рэзкія, канфліктныя і патрабавальныя. Яны добрыя кіраўнікі, рэвалюцыянэры, правадыры, ваяры; бываюць рызыкоўныя да безразважлівасьці; уладалюбівыя, бескампрамісныя, эгаістычныя ў дробязях, але бескарысьлівыя ў вялікім; не спыняюцца перад рангамі і герархіяй улады; выступаюць супраць кансэрватызму, бюракратызму, палітычнага дагматызму і мяшчанскага складу мысьленьня; імкнуцца наперад да недасягнутага.

Таварыскі тып самаўлюбёны, любіць быць у цэнтры ўвагі і падзей, пахвалу, лісьлівасьць і паказуху. Замкнутаму тыпу не хапае самаўпэўненасьці, неабходны мацнейшы партнэр. Затое ўсе яны любяць відовішчы, стадыёны, мастацтва і ўсё моднае. І могуць пазбавіць ад вялікіх няшчасьцяў, ад зладзеяў, хітруноў і круцялёў.

**Людзі году Сабакі** (1946, 1958, 1970) заўсёды на варце: абараняюць іншых, змагары за справядлівасьць, верныя, адданыя, шчырыя і справядлівыя; любяць справядліва крытыкаваць; чэпкія, ведаюць, як змагацца, і змаганьне даводзяць да перамогі; выдатныя арганізатары і кіраўнікі, людзі ім давяраюць; высакародныя, велікадушныя, сумленныя, добразычлівыя, пасьлядоўныя, цярплівыя і клапатлівыя ў дачыненьні да падначаленых, любяць дагаджаць людзям; без эмацыйных успышак; сьціплыя, задавальняюцца тым, што маюць; абавязковыя; спачувальныя; з крытычным і лягічным розумам, інтэлектуалы, філёзафы і маралісты; аскеты, якім, аднак, не праблема зарабіць шмат грошай; працавітыя і працаздольныя.

Кандыдатуру трэба шукаць найперш сярод людзей, што нарадзіліся між **20.02—24.03** (Рыбы) у **1950 і 1962** гады Сабакі, ці, у горшым выпадку, у **1958** г. Тыгра.

## Віртуальны гараскоп

Табліцу знакаў гэтага гараскопу можна паглядзець на сайце: **abz.narod.ru** і ў энцыкляпэдыі Рыгора Квашы, якую ён стварыў, прааналізаваўшы кар'еры тысячаў людзей.



Знакі віртуальнага гараскопу будуюцца на спалучэньні вядомых задыякальнага і гадавога гараскопаў. Знак задыяка адказны за пляны, а год — за магчымасьці іх ажыцьцяўленьня.

Паводле кітайскага календара, год Сабакі пачнецца 29 студзеня 2006 году. Таму ў апазыцыйнага асяродку яшчэ багата часу, каб адшукаць «адзінага».

У астралёгію і «сумяшчальнасьць па жыцьці» можна верыць ці ня верыць. Адно факт — перш, чым галасаваць, трэба даведацца як найбольш пра кандыдатаў.

**Заўвагі і пытаньні дасылайце на e-mail: zorachki@tut.by.**

| 4 суполкі па 3 узаемаспрыяльныя | Кармічны гады | 2-гі кармічны (адсутнасьці слугі) | Антыкармічны год | 2-гі антыкармічны (адсутнасьці гаспадара) |
|---|---|---|---|---|
| **Конь 1954, 1966, 1990, 2002** (Лукашэнка, Юшчанка, Кандаліза Райс) | Пацука **1996**, 2008 | Дракона 2012 | Кабана 2007 | Малпы **2004**, 2016 |
| **Сабака1958, 1970, 1994, 2006** | Пеўня | Тыгра | Быка | Ката |
| Тыгр 1962, 1998, 2010 (Кастра — 1926, Кучма — 1938, Януковіч — 1950) | Быка | Зьмяі | Казы | **Сабакі 1994, 2006** |
| Пацук | Малпы | Кабана | Каня | Зьмяі |
| Бык (Хусэйн — 1937, Лябедзька — 1961) | **Сабакі 2006** | Казы 2003 | Тыгра | Пеўня |
| Дракон | Кабана | Пеўня | Ката | Каня |
| Зьмяя (Мілошавіч — 1941) **2001** | Казы | Пацука | Малпы | Тыгра |
| Каза (Гарбачоў — 1931, Казулін — 1955) | Тыгра | Малпы | Зьмяі | Быка **1985** |
| Кот | Дракона | Сабакі 2006 | **Пеўня** | **Кабана** |
| Малпа | Зьмяі | Каня | Пацука | Казы |
| Певень | Ката | Быка | **Сабакі 2006** | Дракона |
| Кабан | Каня | Ката | Дракона | Пацука |



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ФОТА НА ПАМЯЦЬ у фае Дому літаратара. Аўтары і чытачы «НН».**

# Лайнэр «Наша Ніва»

Палуба Дому літаратара не зьмясьціла ўсіх ахвотных. Здаецца, трэба было пакрыўдзіцца. Напэўна, можна было б адшукаць вінаватых. Але што зробіш, калі Вялікая заля Дому літаратара выявілася замалой для ўсіх, хто жадаў трапіць на вечарыну «Нашай Нівы» і «Arche». Урачыстасьці 100-годзьдзя першай беларускай газэты стартавалі з аншлягам.

«Сябры, праходзьце на сцэну», — запрашаў Андрэй Дынько моладзь, што ціснулася ў праходах. Урэшце, і сцэна, і прастора перад ёй, і прыступкі, і, натуральна, рады крэслаў былі занятыя, а на вуліцы яшчэ стаяў ладны натоўп, прыціснуўшы насы да шкла зачыненых дзьвярэй. Ніякія ўгаворы не зьмякчылі сэрцы аховы: усе шлюзы былі надзейна задраеныя шчэ за 10 хвілінаў да пачатку вечарыны. Моладзь лезла цераз краты, пакуль дырэктарка будынку не пагразіла міліцыяй. Адзіны плюс сытуацыі — заля праглынула ўсе 600 лятарэйных білецікаў і 300 мандарынаў, падрыхтаваных арганізатарамі акцыі.

Вядучым імпрэзы быў Сяргей Харэўскі, нашанівец ад самага другога нараджэньня газэты ў 1991 г. Месцы ў «прэзыдыюме» занялі ня толькі аўтары выданьняў, але і дзеці, якім не было месца ў залі. Тым весялей: яны махалі бел-чырвона-белымі сьцяжкамі. Валер Булгакаў, галоўны рэдактар «Arche», прамаўляў да публікі. Іншы аўтар часопісу, Павал Абрамовіч, правёў паралелі з антычнасьцю ў сваім эсэ. Уладзімер Арлоў ды Лёлік Ушкін былі завалены пытаньнямі. Адам Глёбус увогуле вырашыў адказаць на ўсе запыты праз Інтэрнэт, каб не займаць зашмат часу. Зрэшты, запіскі былі пераважна з просьбамі пазнаёміцца. Глёбус прысьвяціў свой выступ вершам. «Я хвалююся. Іранічныя вершы заўсёды больш складана чытаць, чым пафасныя», — прызнаўся Глёбус. Калі Глёбус чытаў верш пра тых, хто ў прыцемках пакінуў радзіму, і тых, хто назаўсёды застанецца тут, за кулісамі заплакаў адзін знакаміты паэт, што толькі што вярнуўся на радзіму з адной паўночнай краіны.

Андрэй Хадановіч імправізаваў лімэрыкамі ды сьпяваў пад гітарны акампанэмэнт намесьніка галоўнага рэдактара «НН» Андрэя Скурка. Зьміцер Бартосік заклікаў мужчынскую палову залі аднаўляць генафонд нацыі, а жаночую — падрыхтавацца да наступу моцнай паловы. Аўтар «НН» Зьміцер Дзядзенка выявіў талент бардаўскага сьпеву. Віталь Тарас сарваў воплескі залі. Вера Бурлак расстраляла публіку сваімі вершамі, і публіка прагна глытала кулі-радкі. Постамэрыканскі Лявон Вольскі сьпяваў постамэрыканскія песьні, а ў фінале выцягнуў білецік, што вызначыў шчаслівую глядачку, якая атрымала прыз лятарэі — зборны керамічны партрэт Ідэальнага чытача.

«Жыве Беларусь» разьлягалася так гучна, што ў фае пад яго захоплена пляскалі нават наведнікі банкету ў рэстарацыі, дзе былі заўважаны намесьнікі міністра эканомікі і замежных справаў.

Але што да выступаў, дык энэргетычнай кульмінацыяй вечара стаўся сьпеў Міхала Анемпадыстава. Без музычнага суправаджэньня, але з шаманскай мэлёдыкай, без падтанцоўкі, але з сотнямі ўдзячных слухачоў. Аповед пра падарожжа зь сябрамі на эстонскую выспу Ультыма Тхульле. Маленькі эпізод з чужога жыцьця, які выявіўся нечакана блізкім нам усім.

Ёсьць спакуса параўнаць залю Дома літаратара з каўчэгам, у які мы забіліся, каб перачакаць агульнанацыянальны палітычна-культурны патоп. Не паддамося ёй. Гэта было ўсяго толькі прыемнае падарожжа на надзейным лайнэры на выспу пад назвай Беларусь,

на якой стаіць дуб, што стаяў там
спрадвеку,
такі магутны, што трымае ён неба,
каб яно ня ўпала на выспу
пад назвай Беларусь.

**Алесь Кудрыцкі**

## Ад Рэдактара

Прабачце ўсе, хто не прабіўся ў залю. Былі бітком забітыя праходы і сцэна. Можна зразумець адміністрацыю, што баялася за бясьпеку. Мы не чакалі такога наплыву людзей, мы меркавалі, што зьбярэцца колькасьць людзей, супастаўная зь прээнтацыямі 1996 і 2001 гадоў. Вядома, варта ладзіць такія сустрэчы ў большай залі. На наступны раз паспрабуем штосьці прыдумаць.

## МІХАЛ АНЕМПАДЫСТАЎ

### Ультыма Тхульле

Тэкст паўстаў пад уражаньнем вандроўкі на эстонскую выспу Кыхну, абвешчаную *UNESCO* помнікам нематэрыяльнай культуры. Эстонцы ўважаюць, што мэсаліёцкі вандроўнік IV ст. Піфэй адкрыў менавіта гэтую выспу і называў Ультыма Тхульле. Грэкі лічылі яе паўночным краем зямлі.

Я палю сваю файку,
Вецер дзьме мне ў сьпіну.
У паўночным кірунку
Нясе мой карабель.

Мой карабель —
Ветразяў бель.
Бей, вецер, бей
У яе, як у бубны.
Дзьмуй, вецер, дзьмуй,
Дзьмуй, не шкадуй,
Нясі карабель мой
На Ультыма Тхульле.

Ультыма Тхульле —
Чароўная выспа.
Там выспацца можна
Пасьля вандраваньняў.
І кожны вандроўнік
Знойдзе прытулак
Там, на высьпе далёкай,
Высьпе Ультыма Тхульле.

А на той высьпе далёкай
Ёсьць корчмы і бары.
Там клёцкі за дзякуй,
Там піва задарма.
І прыгажуні
Прагнуць каханьня
Там, на высьпе далёкай,
Высьпе Ультыма Тхульле.

А яшчэ там ёсьць дуб
Стары і магутны.
І такі ён стары,
Што стаяў там спрадвеку.
І такі ён магутны,
Што трымае ён неба,
Каб яно ня ўпала
На выспу Ультыма Тхульле.

Я палю сваю файку,
Вецер дзьме мне ў сьпіну.
У паўночным кірунку.
Нясе мой карабель.

# Пытаньні і адказы зь вечарыны

Жарты і экспромты кепска перадаюцца на паперы, таму перадаваць атмасфэру вечарыны не бяромся. Падаем некаторыя пытаньні й адказы, найперш тыя, на якія не пасьпелі адказаць з сцэны.

### Андрэй Дынько

**— Ці не плянуеце Вы зьмяніць грамадзка-палітычны характар газэты на грамадзка-забаўляльны? Менш палітыкі і больш цікавостак?**

— Наша палітыка бывае вельмі забаўнай. Штогод забаўнейшая. Без палітыкі ніяк. Нас хочуць загнаць у літаратурна-культурнае гета. Гэтаму нельга паддавацца.

**— Чаму ў залі няма спадара Дубаўца?**

— Спадар Дубавец заняты падрыхтоўкай некалькіх вельмі важных кніг, якія выйдуць неўзабаве.

**— Чаму ў «Нашай Ніве» зьніклі артыкулы, друкаваныя лацінкай?**

— Калі аўтары пішуць лацінкай, мы друкуем лацінкай. А што мала пішуць так — знак часу.

**— Куды зьбеглі Грамадан і Сабака?**

— Пытаньне можна ставіць на адным узроўні з ключавымі пытаньнямі нашага часу: дзе Ганчар? Дзе Пазьняк? Насамрэч Грамадан і Сабака — гэта таксама ахвяры лукашызму.

**— Калі Рэдакцыя перадзе ў Вільню?**

— Такое пытаньне пакуль не стаіць.

**— Чаму ў газэце няма «Правага вока»?**

— Пакуль не знайшлося адпаведнага аўтара.

### Сяргей Харэўскі

**— Ці існуе музэй «Нашай Нівы», і калі не — ці няма намеру яго стварыць?**

— Пакласьці там Глёбуса… *(Сьмех у залі.)* Асабістыя рэчы Арлова… мае акуляры. Ведаеце, вы рана хаваеце нас. Я думаю, такая задача паўстане перад іншым пакаленьнем. Чаго-чаго, а экспанатаў мы настваraем.

### Андрэй Хадановіч

**— Калі выйдзе кніга Вашых шматлікіх перакладаў?**

— Кніга выбраных перакладаў пад назвай «Разам з пылам. Калекцыя перакладаў» мае зьявіцца ў наступным годзе. Дарэчы, у густоўным мастацкім афармленьні Алеся Пушкіна.

**— Падкажыце, дзе яшчэ можна набыць Вашы «Лісты з-пад коўдры»?**

— «Лістоў з-пад коўдры» набыць пакуль нельга нідзе, бо ўвесь наклад раскуплены. Часткова гэтыя тэксты можна знайсьці ў Інтэрнэце, а часткова — у новай кніжцы «From Belarus with Love», якая выдадзена ва Ўкраіне.

**— Дазвольце запытацца, чаму Вы вось ужо два тыдні не зьяўляецеся да нас на заняткі?**

— Выбачаюся ва ўсіх сваіх студэнтаў і студэнтак: сачкаваў заняткі, таму што прадстаўляў Бацькаўшчыну падчас дзён беларускай культуры ў Кракаве. Лекцыі і інтэлектуальныя дыскусіі ў Ягелёнскім унівэрсытэце, а таксама выступ у артыстычнай кракаўскай кавярні пайшлі на карысьць як мне, так і польскім аматарам беларускай культуры. Мае калегі па кракаўскіх днях культуры Андрэй Скурко, Валер Булгакаў і Зьміцер Бартосік не дадуць схлусіць!

**— Колькі Разэнкранцаў можа зьмясціцца ў адным Хадановічу?**

— Прыблізна столькі ж, колькі і Гільдэнстэрнаў. А калі сур'ёзна, то мяне радуе вашае знаёмства з кнігай пераможцаў конкурсу Пэтраркі «Формула каханьня», алюзіяй на якую і ёсьць гэтае пытаньне.

**— Помніцца, у «НН» быў нэкралёг-апавед пра мысьляра Кіма Хадзеева. Чым ён быў для беларускага інтэлектуальнага дыскурсу?**

— Я вам не скажу за ўвесь інтэлектуальны дыскурс, а для мяне Кім Хадзееў быў адным зь першых настаўнікаў, цудоўным рэдактарам, які навучыў працаваць над паэтычнымі тэкстамі, і проста чалавекам, які здорава пашырыў мой інтэлектуальны далягляд. Ведаю шмат творцаў, якія падпісаліся б пад гэтымі словамі.

**— Ці можаце на заказ напісаць лімэрык пра беларускі мэгаполіс Залеські?**

— У Залеськах, буйным
мэгаполісе,
Жыхары пазнаюцца па голасе.
Пасылаюць па мацяры —
Дык чуваць на экватары,
А па бацьку — чуваць аж на
полюсе.

### Уладзімер Арлоў

**— Ці ўваходзіць у Вашы пляны стварэньне вялікага гістарычнага твору, ці Вы сканцэнтраваліся на эсэістыцы?**

— Завершана праца над тэкстам кнігі пра Вялікае Княства Літоўскае, якая будзе своеасаблівым працягам «Краіны Беларусі». Што да мастацкіх плянаў, то ў рабоце аповесьць, прысьвечаная Міхалу Валовічу, апошняму няскоранаму паўстанцу 1831 году.

**— Што ў Вас за пярсьцёнак на руцэ? *(Дзевачка Людачка з 4-га раду.)***

— Гэта пярсьцёнак, які прываражвае Людачак і іншых дзевачак.

**— Пытаньне да ўсіх: дзе вы былі ў час Чарнобыльскага шляху?**

— За ўсіх адказваць не бяруся, але некаторыя з нас (як і было задумана паводле сцэнару) свае пэтыцыі з подпісамі і адрасамі імкнуліся перадаць у рэзыдэнцыю. Праўда, іх забралі людзі ў цывільным, паабяцаўшы, што яны перададуць самі. Нас, як бачыце, пакуль не забралі.

**— Дзе ў Менску знаходзіцца ўніяцкая царква? Калі ўніяты сьвяткуюць свае сьвяты?**

— Беларускія грэка-каталікі, у адрозьненьне ад некаторых іншых уніяцкіх цэркваў, трымаюцца, як і большасьць хрысьціян сьвету, грыгарыянскага календара. У Менску некалькі прыходаў. Я наведваю набажэнствы, якія адбываюцца ў капліцы касьцёлу Сьвятых Сымона і Алены.

**— Пра якую краіну Ваш твор «Задніца Эўропы»?**

— Трэба пачытаць аднайменнае эсэ, бо адказ не такі адназначны. Эсэ пра некалькі краін, а задніцай Эўропы адзін зь яго герояў называе дзяржаву, якая імкнецца з намі інтэграваца. Дарэчы, гэтае эсэ натхніла вядомага скульптара Алеся Шатэрніка. Ён падарыў мне «задніцу Эўропы», высечаную зь белага мармуру, вельмі, дарэчы, спакусьлівую. Я думаю, што такія задніцы павінны заставацца ў нашай краіне.

**— Ці сустракаліся Вы з прэзыдэнтам?**

— Ведаеце, я сустракаўся з прэзыдэнтам Чэскай Рэспублікі Вацлавам Гаўлам. Сустрэча была даволі кароткая, але мяне вельмі ўразіла. Цяпер мару пра час, калі такі прэзыдэнт будзе ў Беларусі.

### Зьміцер Бартосік

**— Можа, Вы растлумачыце, чаму самыя шчырыя патрыёты Беларусі па паходжаньні не беларусы?**

— Адказ ляжыць на паверхні. Ёсьць у нас органы пачуцьцяў — слых, зрок… А паколькі мы яшчэ і людзі, у нас павінен быць орган, які адказвае за нацыянальнае пачуцьцё. У беларусаў ён атрафіраваўся, яго няма. А ў жыдоў, маскалёў ён ёсьць, таму яны і нацыяналісты. І гэты орган, на жаль, не аднаўляецца. Людзям проста не баліць.

### Вера Бурлак

**— Калі мы нарэшце ўбачым ваш музычны альбом? А пачуем?**

— Цяжкае пытаньне. Пакуль гэта толькі ідэя.

### Лёлік Ушкін

**— Ці прадугледжана прадстаўленьне газэтнага варыянту «Навінак»?**

— Не. Гэтым летам «Навінкі» будуць здымаць фільм «Толькі мерцьвякі нічога не баяцца».

### Вольф Рубінчык

**— Ці даяце прыватныя ўрокі гульні ў шахматы?**

— Пакуль што толькі жонцы (і яна ўжо ведае, як хадзіць канём!). Але давайце паспрабуем і з Вамі… Тэксты з «Каісы» — адносна сьвежыя — можна чытаць на bychess.narod.ru/nn/. Тутака справа і банэр «Шахмат у Беларусі» вісіць, зь пешачкай. Электронны адрас: rubinchyk@lycos.com.

### Андрэй Скурко

**— Якой Вам бачыцца «Наша Ніва» праз два, пяць, дзесяць гадоў?**

— «НН» — гэта больш, чым газэта. Мы тут усе ў гэтай залі — «Наша Ніва». Пакаленьні аўтараў газэты могуць зьмяняцца, але ідэі беларускай Беларусі і творчага падыходу да жыцьця застаюцца. Што зьменіцца за дзесяць гадоў? Краіна Беларусь, жыцьцё яе людзей. І «НН» непазьбежна эвалюцыянуе, каб адэкватна адказваць на выклікі новага часу.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ЧЫТАЧЫ АКУПАВАЛІ СЦЭНУ.** Вечарына сабрала рэкордную для Дому літаратара колькасьць людзей. Цесна было нават на сцэне.

### Паважаная рэдакцыя «Нашай Нівы», шаноўныя чытачы найстарэйшай беларускай газэты!

Я ня змог прыняць удзел у вечарыне, прысьвечанай 99-м угодкам «Нашай Нівы». З прычынаў службовых у той дзень я адсутнічаў у Менску. Аднак маю гонар выказаць сваё пажаданьне пісьмова: няхай свой стогадовы юбілей газэта сустрэне ў свабоднай і дэмакратычнай Беларускай Дзяржаве — і няхай у наступным сваім стагодзьдзі на стамляецца ўзгадоўваць новыя пакаленьні Купалаў, Коласаў і Багдановічаў!

Жыве «Наша Ніва»!

Жыве Беларусь!

З павагай —

каардынатар Грамадзянскай ініцыятывы «Агульнанацыянальны рух «Воля Народу»

**Прафэсар Аляксандар Казулін**

*29 красавіка 2005 г.*

### Дык падпісвайся!

Падпісны індэкс «Нашай Нівы» 63125. Падпіску на «НН» прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку».

Цана на месяц — 3820 рублёў на поштах або 3530 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі без чужога слова штотыдзень. Чытай сваё!

# Дэмакратычныя цнатліўцы

«Народная воля» ў нумары за 27 красавіка ў разьдзеле «Паліткухня» надрукавала агрэсіўную зацемку выбаршчыка зь Менску С.Тарасава. «Народнай волі» адказвае намесьнік старшыні Партыі БНФ **Юры Хадыка**.

Да апошняга часу каралевай Вялікабрытаніі магла стаць толькі жанчына, якая захавала цнатлівасьць да шлюбу. Прынцэсу Дыяну ў 1981 г. аглядаў гінэколяг, і толькі пасьля таго, як ён пацьвердзіў яе дзявоцкасьць, адбыўся шлюб з насьледным прынцам. Дасьціпнікі жартавалі тады, што лэдзі Дыяна Спэнсэр была апошняй цнатліўкай у колах ангельскай арыстакратыі. Быццам пацьвярджаючы гэтую думку, прынц Чарлз праз 20 год ажаніўся з разьвядзёнкаю з багатым сэксуальным досьведам.

Гэтая гісторыя нагадвае сытуацыю ў колах беларускай дэмакратыі. Як толькі набліжаюцца прэзыдэнцкія выбары, у асяродку апазыцыі зьяўляюцца людзі, якія яшчэ ўчора служылі антыдэмакратычнаму рэжыму, а сёньня сьмела гатовыя ўзначаліць аб'яднаную дэмакратычную апазыцыю.

Я падкрэсьліваю — дэмакратычную, бо апазыцыя можа быць правай, левай, канструктыўнай і ляяльнай, нарэшце, шырокай, — але хто сёньня памятае дыялёг Аляксандра Рыгоравіча з шырокай апазыцыяй у 2000 г.? Я называю такіх людзей дэмакратычнымі нявіньнікамі. Не сумняваюся ў вялікіх арганізацыйных здольнасьцях Аляксандра Вайтовіча і Аляксандра Казуліна. Мне зразумелыя іх матывы. Бо пасьля абразьлівых выказваньняў на іх адрас ППРБ яны ня могуць любіць яго. Аднак сьведчаньняў іх адданасьці ідэалам дэмакратыі і незалежнасьці Беларусі недастаткова. Купляць жа «ката ў мяшку» недальнабачна.

Я б зьвярнуўся да ўсіх нявіньнікаў дэмакратыі (бо думаю, што іх сьпіс ня будзе абмежаваны згаданымі прозьвішчамі) з заклікам. Калі вы любіце ня толькі сябе, але і вольную дэмакратычную Беларусь, якую нам яшчэ толькі трэба пабудаваць, адкіньце амбіцыі і далучайцеся да працэсу аб'яднаньня дэмакратычных сілаў, які пачала Народная кааліцыя «Пяцёрка+». Прыйдзіце і скажыце: «Спадары Лябедзька, Калякін, Шушкевіч, Вячорка і Бухвостаў! Я хачу пакласьці канец дыктатуры ў маёй краіне. Дзеля гэтага я далучаюся да працэсу вылучэньня адзінага кандыдата і абяцаю, што пры любым выбары прыкладу ўсе намаганьні для перамогі дэмакратыі».

Ужо адбыліся менскія і абласныя канфэрэнцыі — усюды, акрамя Віцебску. На гэтых сходах дэмакратычнага актыву прысутнічалі і Вайтовіч, і Колас, і Фралоў, не было толькі Казуліна. Але ніхто зь іх не наважыўся падпісаць заяву-абяцаньне ў выпадку сваёй перамогі абараняць прынцыпы дэмакратыі і незалежнасьці Беларусі. Бяз гэтага людзі, якія на справе рызыкуюць і на справе будуць агітаваць за адзінага кандыдата, не пагадзіліся ўключаць іх прозьвішчы ў бюлетэнь для галасаваньня. Тады нездаволеныя прэтэндэнты пачалі публічна скардзіцца на недасканаласьць працэдуры і правакаваць крытычныя артыкулы ў незалежнай прэсе.

Так, «НВ» у нумары за 27 красавіка ў разьдзеле «Паліткухня» надрукавала агрэсіўную зацемку выбаршчыка зь Менску С.Тарасава. Сп.Тарасаў задае пытаньні, на якія неабходна адказаць. Ён піша: «Хто і калі вызначыў кола дэмакратычных сіл?»

Слушнае пытаньне. Гэтае кола ахапіла палітычныя партыі і грамадзкія аб'яднаньні, што бралі ўдзел у выбарчых кампаніях апазыцыйных кандыдатаў на апошніх парлямэнцкіх выбарах. Больш шырокага кола нельга прыдумаць. Асобы, якія ня бралі такога ўдзелу, могуць далучыцца да любой партыі ці аб'яднаньня і ўзяць удзел у вылучэньні адзінага кандыдата.

Другое пытаньне: «Калі чалавек прытрымліваецца дэмакратычных прынцыпаў, але не ўваходзіць у партыю ці нейкае грамадзкае аб'яднаньне, ці можа ён узяць удзел у вызначэньні таго ж адзінага кандыдата?» Зразумела, можа. Калі ён прэтэндуе быць гэтым адзіным, то павінен падпісаць згаданую заяву-абяцаньне і сабраць больш за 50% галасоў любой рэгіянальнай канфэрэнцыі, каб трапіць у якасьці прэтэндэнта на Нацыянальны кангрэс дэмсіл. Гэта вельмі важная ўмова. Калі чалавек спадзяецца атрымаць падтрымку, ён напачатку мусіць дамагчыся згоды і падтрымкі дэмакратычнага актыву. Тады гэты актыў дапаможа яму перамагчы ва ўсёй краіне. Мы ня маем іншых рэсурсаў для перамогі. Той, хто спадзяецца толькі на грошы альбо толькі на намэнклятуру, можа быць апанэнтам А.Лукашэнкі. Але ня можа быць лідэрам беларускай дэмакратыі.

Рэглямэнт вылучэньня прэтэндэнтаў быў распрацаваны спэцыяльнай групай, у склад якой уваходзілі юрысты з розных партый і арганізацый. Рэглямэнт усёй грамадзкасьці краіны не паведамлены, але ён усім даступны, сп.С.Тарасаў, і многія незалежныя газэты яго падрабязна апісвалі. Можа гэта зробіць і «Народная воля». Гэта ўсе пытаньні, якія былі пастаўлены.

Думаючы пра паводзіны і крыўды нашых нявіньнікаў дэмакратыі, часта прыгадваю сытуацыю 2001 г. Тады пяць прыстойных чалавек прыватызавалі права назваць адзінага кандыдата ад дэмсіл. І зацягнулі гэтую справу да таго часу, калі агітацыйную кампанію ўжо не было магчымасьці разгарнуць. За два з паловаю месяцы да 9 верасьня 2001 г. я паразмаўляў з трыма найбольш моцнымі прэтэндэнтамі — М.Чыгіром, У.Ганчарыкам і С.Домашам. Кожнаму зь іх я сказаў: «Паважаны дружа! Выберыце любога з чатырох астатніх і скажыце яму, што згодны быць у яго кабінэце прэм'ер-міністрам. Калі Вы так зробіце, «пяцёрка» распадзецца, усе дэмакратычныя сілы аб'яднаюцца і перамога на выбарах зробіцца рэальнаю. А Вы будзеце прэм'ер-міністрам у дэмакратычнай краіне». Аднак ніводзін з трох ня бачыў нікога дастойнага быць прэзыдэнтам акрамя сябе. Параза апазыцыі з такімі лідэрамі была прадвызначаная.

Гэтым разам, спадзяюся, мы не наступім на тыя самыя граблі. Строга вытрымаем акрэсьлены плян і аб'яднаем вакол абранага кандыдата нашы магчымасьці. Ніхто ня можа забараніць У.Коласу, А.Вайтовічу, А.Казуліну вылучацца іншым шляхам. Але прэтэндаваць на званьне адзінага кандыдата ад дэмакратычнай апазыцыі яны ня могуць — калі не паспрабуюць далучыцца да апісанай працэдуры на канфэрэнцыі ў Віцебску. Пасьля гэтага будзе позна. Толькі аб'яднаная апазыцыя, хто б ні перамог на Кангрэсе дэмсіл, здольная сабраць мільён подпісаў за вылучэньне гэтага чалавека кандыдатам на выбарах і закласьці трывалы падмурак перамогі.


**ЮРЫ ХАДЫКА** — прафэсар-фізык, намесьнік старшыні Партыі БНФ.

## Сяргей Посахаў хоча беларускага Гаўла


PHOTO.BYMEDIA.NET

Экс-памочнік А.Лукашэнкі Сяргей Посахаў на днях заявіў у інтэрвію расейскаму інтэрнэт-рэсурсу «Мацярык.ру», што рэвалюцыя ў Беларусі магчымая і «грамадзка-палітычная сытуацыя паступова рухаецца ў тым кірунку». Патлумачыць сваю думку яго папрасіў карэспандэнт «Белорусской деловой газеты». Посахаў сказаў: «Значная частка нашага грамадзтва незадаволена тым, як сёньня разьвіваецца краіна. Гэтая незадаволенасьць нараджае неабходнасьць зьменаў. Няма рэвалюцыйнай сытуацыі? Так, яе пакуль няма, але яна, як паказваюць прыклады суседніх краін, можа ўзьнікнуць у любы момант».

Які ж прэзыдэнт патрэбны Беларусі? С.Посахаў мяркуе: «Нам патрэбны сёньня чалавек, сувымерны з Вацлавам Гаўлам. Узважаны, культурны палітык, які дазволіць іншым будаваць жыцьцё паводле свайго разуменьня. Першы этап, калі нас хварасьцінай гналі да навядзеньня парадку, быў неабходны, але ён скончыўся. Тады ў краіне быў раздрай, хаос, я ўсё-ткі быў унутры сыстэмы і ведаю... Сёньня часы іншыя, але краіна не выкарыстоўвае сваіх эканамічных і іншых магчымасьцяў. Грамадзтву патрэбны сёньня не ваяр і не пастух, а наёмны работнік, які будзе кіравацца інтарэсамі грамадзтва. Патрэбны палітык, карысны для свайго грамадзтва, якога прызнаюць у сьвеце».

## БСДГ і віртуальная рэальнасьць

«Наша Ніва» — асноўная і ледзь не адзіная друкаваная крыніца, зь якой я атрымліваю інфармацыю пра палітычныя падзеі. Мала таго, я прывык ставіцца да ўсяго прачытанага ў «НН», як да «ўбачанага на свае вочы». Але апошнім часам, калі чытаю паведамленьні пра «пэрманэнтнае» аб'яднаньне сацыял-дэмакратаў, узьнікае адчуваньне, што ці я звар'яцеў, ці журналістаў «НН» нехта ўводзіць у зман.

Божа барані, я ні ў якім разе не замахваюся на свабоду прэсы — пішыце што хочаце, абы была праўда! А тут узьнікае шэраг пытаньняў. Першае: на якой падставе і хто адхіліў Станіслава Шушкевіча ад кіраваньня БСДГ? Можа, Кароль, якога перад гэтым Цэнтральная рада выключыла з БСДГ? Ці Казулін, які ніякага дачыненьня да БСДГ ня меў? Другое: на якой падставе сьцьвярджаецца, што БСДГ самаліквідавалася? Няхай перш казулінская, нібыта створаная, БСДП «Грамада» зарэгіструецца, а тады спраўляе баль на пахаваньні БСДГ.

Карэспандэнт «НН» вонкавыя падзеі апісаў дакладна. Проста намаляваная ім карціна мае іншае жанравае азначэньне. Гэта ўсяго толькі хэпэнінг пад найменьнем «Аб'яднаньне». Рабілі яго вельмі сур'ёзныя дзядзькі, якія мне, сябру БСДГ, аднаму з многіх, двойчы слалі тэлеграму-запрашэньне на зьезд. Толькі хто іх упаўнаважваў? З такім жа правам гэткую тэлеграму мне мог даслаць і Алесь Кудрыцкі... Хачу нагадаць: падобнае аб'яднаньне сацыял-дэмакратаў ужо нібы было. І дзе цяпер тая АСДП (НГ), створаная ў выніку шчасьлівага аншлюсу? Маўчок пра яе. А БСДГ як была, так і засталася. Ня трэба ж быць такім бяспамятным і двойчы наступаць на тыя самыя граблі. Відаць, мы ўсе апантаныя ідэяй яднаньня дэмакратаў і гатовыя жаданае выдаць за сапраўднае.

Разумею, для ўсякага вонкавага назіраньніка справа выглядае вельмі проста: маўляў, раз вы там усе — і БСДГ, і БСДП (НГ) — сацыял-дэмакраты, а значыць «левыя», дык яднайцеся і не дурыце людзям галовы! Але ж партыі не дзіцячы канструктар, ня кубікі для складаньня. Прабачце, з кім вы мне прапаноўваеце яднацца, з Казуліным? Ды яшчэ выбіраць яго ў кіраўнікі? Тады ўжо лепей з афіцыйнымі ўладамі пабратацца і ўсім партыям згуляць «Дажынкі» на палітычнай ніве?

Зрэшты, Казулін не такая важная штука, каб вакол яго чыніць спрэчкі. Калі ж частка сацыял-дэмакратаў, пераважна былых сяброў БСДП (НГ), сьляпцом лезе ў сацінтэрн, дык гэта, як па мне, куды большая падстава для разыходжаньняў. Мне, нацыяналісту, які ўсё сталае жыцьцё ненавідзеў камуністаў, падтрымліваць левы шабас — гэта тое самае, што таму казачнаму герою выменяць каня на качаргу.

Людзей, якія ў той ці іншай меры ідэнтыфікуюць сябе з правымі, у БСДГ нямала. Думаю, ня варта штучна, толькі з найменьня, заганяць нашу партыю ў «левы кут». Будзьце пэўныя, калі я пераканаюся, што ў БСДГ не засталося аднадумцаў з правым ухілам — сам зь яе выйду. А карэспандэнтам «НН» варта пільней прыслухоўвацца да розных бакоў. На жаль, часьцей за ўсё бальшыня рэпартажаў вакол БСДГ пішацца праз прызму левакоўаб'яднанцаў. Яны па-дзіцячаму рвуцца ў бой, мала думаючы пра вынікі. Цяпер жа, як казаў Алег Латышонак, лепш нічога не рабіць, раз ня ўпэўнены, што тваё дзеяньні не нашкодзяць. Апошняе датычыць і аб'яднаньня.

Перад гэтым у «НН» пісалася: маўляў, партыі не амёбы і мусяць яднацца, а не дзяліцца. Магчыма, яднаньне ідэйных праціўнікаў не ўмацоўвае, а толькі аслабляе партыю. Гісторыя беларускіх сацыял-дэмакратаў за апошняе дзесяцігодзьдзе паказвае, што ўсе аб'яднаньні вядуць не да задзіночаньня, а да пераразьмеркаваньня сілаў. Мяняюцца найменьні, мяняецца склад сяброў, але не мяняецца колькасьць партый. Адным словам — казу мяняем на казу. Горш за ўсё тое, што людзі, якія маглі б супрацоўнічаць, пасьля «аб'яднаньняў» назаўжды становяцца ворагамі. На маю думку, няхай лепш розныя партыі сябруюць, чым сябры адной партыі сварацца.

**Юры Пацюпа, Горадня**

## U krajinie Bulbondziji

Jakoje trapnaje skoŭca znajšłosia u «Našaj Nivie» №11 i №13! Dziakuj vam, spadarovie Pinčuk i Raviaka! Ja jaho tak doŭha šukaŭ, kab akreślić nazvaju źjavu: čałaviek pa žyćci nie prymaje biełaruskaha, movu rodnuju źniščaje, ale pry hetym maje nachabstva nazyvacca белорусом.

Pa sutnaści, adbiraje u mianie majo imia. Apošnim časam ja karystaŭsia slovam «savok». Prauda, kožny raz davodziłasia tłumačyć, što maju na ŭvazie nie savieckaha lumpena, a ludziej z mentalnaściu «ad Buhu da Kurył». Takimi mohuć być i prafesary, a nia tolki bamžy.

Adnojčy pačuu u čarzie: «Ja — nie baptystka, ja — chryścijanka». A sama złaja, hatovaja rasstralać usich baptystaŭ. Choć i chryścijanka, ale absalutna nie aryjentujecca u chryścijanstvie: «Што такое Срэцение? А-а, эта кагда шыць нельзя. Так бацюшка гаварыл».

Analahičnaja sytuacyja i ŭ samanazyvańni. Ludzi, što pa movie adroźnivajucca ad nas, tym nia mienš, nazyvajuć siabie белорусами. Tady chto my u ichnich vačoch? «А-а, эта какие-та бэнээфаўцы». U hałovach sucelnaja kaša. Našy susiedzi prysabiečyli imia Lietuva, a razam ź jim i usiu histaryčnuju litoŭskuju spadčynu. Na siońnia jany kvitniejuć i kvitnieć buduć. A tyja, chto adnojčy zdradziu rodnaj movie, da hetaj pary nia mohuć siabie uśviadomić, ci to jany ruskija, ci to biełaruskija, ci to tutejšyja.

Kultura, stvoranaja na našaj ziamli, apošnija paŭtara stahodździ nazyvałasia «biełaruskaj» i pilnavałasia biełaruskaj movy. Biełarusy zaŭsiody buduć ličyć siabie spadkajemcami Skaryny, Kupały, Bykava. Ale na hetuju ž tradycyju pretendujuć i белорусы! Praŭda, hučyć jana krychu inakš: Скорина, Скобелев. Spadarstva! Adčujcie važnaść histaryčnaha momantu! My žyviom u viekapomnyja dni — zapačatkoŭvajecca novy narodziec. I chaj imia jim — bulbašy — hučyć horda!

Kali našy pryjduć da ułady, kali Мінск padzie pierad Mienskam, tady lahčej i nia tak balesna Bulbondzija pieratvorycca ŭ Biełaruś.

**Henik Łojka, Miensk**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Аер

Традыцыйны артыкул беларускага экспарту ў Сярэднявеччы, аер выдатна надаецца ў рыбныя й мясныя стравы. Аер (Acorus Calamus) спалучаецца з пудынгамі, печывам, робіць непаўторнымі поліўкі. І дае памоцную настойку на гарэлцы. **Сяргей Харэўскі** падае таксама рэцэпт аерных цукатаў, альбо «сухога аеру кляштарным спосабам».



АЕР (Acorus Calamus) шматгадовая расьліна, вышыня да 125 см. Расьце па берагах вадаёмаў, канаваў, ціхіх затокаў, утварае зарасьнікі. Размнажаецца каранямі. Цьвіце зрэдку, у траўні-чэрвені, дробнымі зеленавата-жоўтымі кветачкамі.

Аер — адна з самых загадкавых расьлінаў у Беларусі. Найпершая загадка — як яна трапіла да нас з Паўднёва-Ўсходняй Азіі. Найчасьцей прыводзяць паданьне пра тое, што аер завезьлі татарскія ваяры ў XIII ст., для якіх ён быў найлепшым індыкатарам чысьціні вады. На карысьць гэтае гіпотэзы сьведчыць тое, што ў перакладзе зь цюрскіх моваў «аер» азначае «разьвезьці, падзяліць». А ў многіх беларускіх гаворках і дыялектах яго называюць «татарнікам», «татарскай зёлкаю», «татарскім чаротам».

## Артыкул беларускага экспарту

Пакуль аер ня стаў пашыраны на захадзе ад Беларусі, нашы продкі яго экспартавалі. Самая аўтарытэтная геаграфічная энцыкляпэдыя «Ўсеагульная касма-графія» 1550 г. прафэсара Базэльскага ўнівэрсытэту Сэбасьцьяна Мюнстэра паведамляла, што адным з традыцыйных артыкулаў экспарту зь Белай Русі быў «араматычны трысьнёг» (Calamo Aromatico). Як піша Алесь Белы ў артыкуле «Літоўская кунсткамэра», меўся на ўвазе наш аер, які ў XV—XVI стагодзьдзях яшчэ ня рос у Эўропе; яго карэньне (часам зацукраванае) завозілася туды з ВКЛ, Масковіі, Асманскай імпэрыі як далікатэс.

На захад ад Беларусі аер пакрысе трапіў нашмат пазьней, толькі ў XVII стагодзьдзі, праз Партугалію й Балканы. Цяпер яго можна сустрэць па берагох рэк, старыц і азёраў амаль паўсюдна ў Эўропе, на поўдзень ад Балтыйскага мора. Аер стаў ужо незаменнай часткаю рацыёну нашых баброў і андатраў, зубы якіх — найлепшая рэкляма гэтай расьліне. Аднак нават пераживаючы нашы зімы, у Эўропе аер не дае пладоў — вялікіх чырвоных ягад, — як у сябе на радзіме.

## Ад печыва да зьбітняў

У Паўднёвай Азіі аерам шырока запраўляюць рыбныя й мясныя стравы. Ён выдатна спалучаецца з пудынгамі, печывам, з стравамі з капусты, са смажанінай (найперш баранінай і дзічынай), араматызаванымі воцатамі, поліўкамі й соўсамі. У тыбэцкай мэдыцыне аер выкарыстоўваецца як глістагонны, танізуючы й бактэрыцыдны сродак. Кітайцы рэкамэндуюць яго пры рэўматызьме й хваробах страваваньня. Настойка аеру паляпшае слых і зрок. У традыцыйных малайскай, тайскай, цэйлёнскай, француcкай, галяндскай кухнях аерам араматызуюць алькаголь (джын, абсэнт, піва, вэрмут), кампоты, мусы, супы й саляты. Зь яго ў чыстым выглядзе гатуюць сочыва, сыропы, джэмы й цукаты. Яго шырока выкарыстоўваюць як дабаўку для начынак цукерак.

Аер — адзін з найважнейшых кампанэнтаў старасьвецкае беларускае кухні. Як і паўсюдна, яго наяўнасьць у вадзе лічылася індыкатарам яе добрае якасьці. Здавён яго выкарыстоўвалі як заменьнік перцу, лаўру й імбіру ва ўсялякіх стравах. Ідэальна аер надаецца да марынаваньня рыбы, бо насамрэч выклікае ўшчыльненьне рыбнага мяса й надае яму тонкі водар й вастравата-каўткі прысмак.

Гэтаксама як і ў Эўропе, беларусы дадавалі аер у розныя напоі — ад піва да зьбітняў. Гэта было звычайнай справаю, што лічылася добрым густам. Павал Шпілеўскі пісаў у 1853 г. у сваім артыкуле «Нізкі рынак у Менску»: «…проста насупраць Бэрнардынскай вуліцы ўбачыце некалькіх жыдовак, якія гандлююць зьбітнем, але *зьбітнем беларускім*, альбо *менскім*, прыгатаваным зь бярозавага лісьця, аеру, ліпавага цьвету і патакі; зьбіцень кіпяціцца ў вялізных, ня надта прыгожых самаварах і разьліваецца ў кубкі са сподачкамі».

## І хвораму, і кушняру

Зрэшты, пра выкарыстаньне беларусамі аеру з рознымі мэтамі можна прачытаць ня толькі ў Шпілеўскага, але й у Кіркора, Нікіфароўскага, Пяткевіча, іншых этнографаў. Па ўсёй Беларусі быў пашыраны звычай упрыгожваць хату аерам на рэлігійныя сьвяты (пераважна на Сёмуху) і раскідваць карэньне па падлозе, каб асьвяжыць паветра. Шырока ўжываўся ён у народнай мэдыцыне. Настоі аеру на гарэлцы спрадвеку выкарыстоўвалі для ўзбуджэньня апэтыту, пры захворваньнях страўніка й нырак, як танізуючы й бранхіяльны сродак. У выглядзе парашку аер ужывалі пры анэміі, парадантозе, пякотцы, прысыпалі раны. У адвары аеру купалі дзетак пры рахіце й дыятэзе. А таксама лячылі выпаданьне валасоў.

Аер меў значэньне і ў гарбарнай ды кушнярскай справе як дубільнік, кансэрвант і бактэрыцыднік. Маладзенькія бэзавата-ружовыя карэньчыкі аеру падчас першае касавіцы былі звычайным ласункам і для малых, і для старых як крыніца вітамінаў. На лісьці аеру пяклі хлеб й запякалі некаторыя мясныя стравы.

Аерам можна проста араматызаваць розныя стравы. Але трэба памятаць, што карэньне аеру, асабліва пасьля траўня, гаркавае, таму яго варта спажываць асьцярожна. Гэтак, у розныя вадкія салодкія стравы (кісялі, мусы, жэле, крэмы й г.д.) кавалачак аеру закладаюць за тры хвіліны да гатоўнасьці й перад спажываньнем абавязкова вымаюць. Найлепш надаецца аер да смажаніны зь дзічыны, бараніны, ялавічыны. Смачнага вам!



**СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ** — мастацтвазнаўца, пісьменьнік, кулінар. Аўтар кнігі «Зьвяры-суайчыньнікі» і цыклу нарысаў «Сто твораў беларускага мастацтва XX стагодзьдзя».

## …І перамешваючы сярэбранаю лыжкаю

Вось як можна прыгатаваць аерныя цукаты, альбо «сухі аер кляштарным спосабам», паводле кнігі Вінцэнтыны Завадзкай «Кухарка літоўская».

Карэньне аеру для смажаньня трэба капаць у сярэдзіне траўня й пры канцы верасьня. Яго замочваюць у халоднай вадзе цягам дзевяці дзён, кожныя два дні мяняючы ваду. Затым іх належыць пакласьці ў рондаль, заліць вадою й гатаваць (таўсьцейшыя карані — гадзіну, танчэйшыя — 45 хвілін). Адцадзіць ваду й астудзіць, абліваючы халоднай вадою, — і хай стаіць суткі. Потым узяць і пакраіць кольцамі ды зноў заліць вадою й трымаць шэсьць дзён, кожныя два дні мяняючы ваду. Пасьля выкласьці аер на сурвэткі ці анучкі й моцна адціснуць рукамі, каб сьцякла вада. Адважыць на паўкілі аеру чвэрць кілі цукру найлепшага гатунку і, заклаўшы ў паліваную ці парцалянавую пасудзіну, перасыпаць кожны пласт аеру тоўстым слоем цукру.

Колькі паўкіляў аеру будзем смажыць, столькі паасобных пасудзін спатрэбіцца для зацукроўваньня, бо болей як паўкіляграма не надаецца да смажаньня.

Гэткім спосабам зацукраваны аер павінен стаяць сама меней тры дні. Затым мы яго тушым, дабавіўшы тры сталовыя лыжкі халоднай вады, пакуль цурок сыропу, спушчаны з лыжкі, не пачне цягнуцца, а ня падаць кроплямі. Падчас гатаваньня аерную тушаніну трэба вельмі часта перамешваць сярэбранай лыжкаю. Як усё ўтушыцца, трэба даць састыць, затым кавалачкі аеру выкласьці на паперу і ўлажыць рады (папера мусіць быць тоўстая, каб не працякала вада). На кожны карэньчык наліваць сыроп і астуджваць. Далейшая кансэрвацыя мусіць адбывацца ў сухім месцы.

Дадамо, што найлепей тыя цукаты перасыпаць цукровай пудраю, каб не зьбіваліся ў клейкія камякі.

# Хочаш жні, а хочаш куй…

...Крыху паасобку стаялі актывісты здачы крыві з транспарантамі і плякатамі: «Не шкадуй крыві роднай уладзе», «Здай кроў — атрымай адгул», «Наша кроў — не вадзіца», «Імпэрыялістычных п'явак і крывасмокаў — на галодны паёк!»... Параднае апавяданьне **Сяргея Астраўца**.

Трыбуна з начальствам дэманстравала сабраным на мітынг працоўным масам, што ў Багдадзе па-ранейшаму ўсё ў парадку, усё спакойна…

— Таварышы! Мы будзем і надалей змагацца за сапраўдную, а не абстрактную свабоду і дэмакратыю ва ўсім сьвеце, за правы працоўных усіх краін і народаў, за міжнародную салідарнасьць людзей працы: чорных, жоўтых, чырвоных — любых, за мір на ўсёй плянэце. І ніякія сусьветныя агрэсары, ніякія тэрарысты і гандляры жанчынамі нам не перашкодзяць. Наша справа супэр і перамога будзе за намі!

Паглядзіце, тут супэррабочыя з макетамі нашых супэрвырабаў. Мы можам і павінны ганарыцца такімі каўбасамі, такімі шынкамі і карданнымі валамі. Мастакі пастараліся, каб нават муляжы выклікалі апэтыт і жаданьне закусіць. Такой каўбасінай можна было б накарміць цэлую плошчу. А з такой сасіскі — зрабіць хот-дог для цэлага заводу ці фабрыкі. Нашы каўбасы самыя мясныя, самыя пахкія, самыя смачныя ў сьвеце. Нашыя кардны самыя карданныя, нашая салетра самая аміячная. Каленвалы і агрэгаты таксама ня самыя горшыя, бываюць горш. Нам ёсьць чым ганарыцца. Ура, таварышы!

«Што гэта у вас за х-на?» — пацікавіўся мітынгоўшчык у суседа, які трымаў разам з дружбакамі жалезіну. «Гэта карданны вал, чуў, што начальства гаворыць? Такі кардан на дарозе не валяецца. Такі, калі сьцягнуць, можна прадаць нармальна?»

Рабочыя прынесьлі на мітынг на плячах, як бярвёны на суботнікy або на лесапавале, наглядную агітацыю: сасіскі, сардэлькі, каўбасы — усё валатоўскіх памераў, як фалясы антычных герояў ці пачвар накшталт Кінг-Конга.

А таксама беламорыны з тытунёвай фабрыкі, якімі можна было б атруціць цэлыя табуны. Свае прылады мужчыны паставілі старчма, каб адпачылі плечы, і прытрымлівалі з бакоў, а некаторыя прытуліліся, нават стаялі, абхапіўшы ў абдымкі. Былі яшчэ вялізныя кардонныя хлябы зь ёданай сольлю, бочкі са штучнымі угнаеньнямі, яшчэ штосьці.

Другі айцец гораду быў лякончны, відавочна памятаючы пра пашыранае крылатае выслоўе:

— Усе нам зайздросьцяць за наш эканамічны цуд. Мы дагналі 1984 год і ўжо яго пераўзышлі. Склады запоўнены, яблыку дзе ўпасьці няма. Яны нас баяцца, мы можам закідаць іх таварам — ботамі, шапкамі, нават шынкамі. Яны ўсе збанкрутуюць. А нашы яйкі маладзецкія, якія падвышаюць мужчынскую сілу?! Ніякай іхняй хіміі ня трэба, ніякай віягры. У нас усё толькі натуральнае. Няхай жыве Першамай!

Далей стаў старанна выступаць па паперцы прадстаўнік працоўнай дынастыі, сваякі якога дзякуючы народнай уладзе трапілі на мясакамбінат і замацаваліся там.

— Мы цераз плот мяхі зь мясам ды каўбасамі ніколі не перакідалі, і дзіркі ў плоце не рабілі. І праз прахадную не спрабавалі, абвязаўшыся сасіскамі, прасьлізнуць. Гэта ня наш мэтад, лепей на месцы ад пуза пад'есьці, каб потым цэлы дзень не хацець. Тут нашы карані: і дзед мой з бабкай працавалі, і бацька з маці, мы з жонкай пазнаёміліся ў заводзкай сталоўцы, думаю, што і дачка мая сюды прыйдзе, і сын таксама. Пры харчах — заўсёды надзейна, пры любой уладзе. Як кемлівы салдат: бліжэй да кухні, далей ад начальства.

— Прафсаюзы, кхе-кхе, — школа камунізму, як калісьці любілі гаварыць, — крыху нязэпу на распачаў наступны айцец гораду. — Іх зноўку ўзяла пад сваё крыло дзяржава, і яны пачалі працаваць як трэба. А то адбіліся ад рук зусім, у свабоднае плаваньне пайшлі, а баржа іхняя дала цечу…

Абаронца працоўных падзякаваў уладзе за слова:

— У гэтае сьветлае і радаснае сьвята дазвольце ўшанаваць хвілінай маўчаньня памяць пра герояў вытворчасьці — членаў прафсаюзу, якія загінулі ў барацьбе за ўраджай, за лепшыя паказчыкі, за валавую прадукцыю, за тое, каб у нас было болей чаравікаў, ботаў, карданных валоў, аміячнай салетры і гэтак далей. Спынюся на некаторых прыкладах. Сьцяпан Пробка ўратаваў трактар цаной свайго жыцьця, а Івана Трэску засыпала збожжам у сіласнай вежы. Слава героям!

Таварышы! Я толькі не хацеў бы, каб у вас узьніклі змрочныя настроі, што наша справа небясьпечная і ледзьве не безнадзейная. Гэта далёка ня так. Рэч у тым, што і раней зьдзяйсьнялі свае працоўныя подзьвігі, і раней гінулі дзеля нас на канвэеры і на палявым стане, на мэхдварах і ў зернесушылках нашы дарагія землякі, тыя, на каго трэба раўняцца, зважаць, хто стаў прыкладам для маладога пакаленьня. Але сьмерцяў пабольшала не праз нейкае насланьнё, а таму стала больш, што людзей залучылі назад у пярвічкі, дзе перад тым быў разброд і хістаньні, калі ўзносы плацілі як хацелі, на сходы не хадзілі, калі прафсаюзы сталі развальвацца па швах.

І крыху статыстыкі. За справаздачны час мы страцілі дзевяць рук часткова або цалкам, тры нагі, два вухі, сем вачэй і адну галаву. Як у той песьні: столькі вольных с плеч срубілі, не прышылі ні адной. А нам не ўдалося назад прышыць толькі адну. Вось такія пірагі. Захаваць жыцьцё і зрабіцца інвалідамі ўдалося ў чвэрці выпадкаў, гэта не такая дрэнная лічба.

Доктарка-нарколяг узьнёсла пахвалу прамаўляць пра здароўе нацыі і насельніцтва гораду, пачынаючы з Эскуляпа і Авіцэны. «Замест некаторых маральна ўстарэлых гатункаў пладова-ягаднага віна, шырока вядомага ў народзе як чарніла, пачалі выпускаць новыя гатункі гарэлкі, — важка зазначыла яна, — а гарэлка, як добра вядома, значна здаравейшая за чарвіўку». Яна працягвала:


PHOTO BYMEDIA.NET

— Алькагалізацыя насельніцтва, таварышы, не павінна перавышаць паказчыкі, заплянаваныя лічбы, крытычную мяжу. Тут павінен быць балянс паміж станам калектыўнага здароўя і акцызнымі падаткамі, напаўняльнасьцю дзяржаўнай кішэні, зь якой даюць на лекі. Дактары хадоркіны могуць адпачываць, таварышы. Мы за здаровы лад жыцьця, за «будзь гатоў к труду і абароне»!

— Жыць стала лепей і дзякуючы нашым слаўным мытнікам, якія не даюць падмануць дзяржаву розным кантрабандыстам і сьпіртавозам, — крыху па-пракурорску агучыў прэамбулу адзін з айцоў гораду.

У параднай форме мытнік нечакана сьціпла паведаміў пляцу пра дасягненьні ў рабоце — пра кантрабанду і канфіскат, які ў шырокім асартымэнце маецца ў магазінах гораду. Канкрэтна — піва чэскае, кветкі на 8 Сакавіка дарагім жанчынкам, калготкі піраціся, памада, памперсы.

Крыху паасобку стаялі актывісты здачы крыві з транспарантамі і плякатамі: «Не шкадуй крыві роднай уладзе», «Здай кроў — атрымай адгул», «Наша кроў — не вадзіца», «Нямігі крываўыя берагі», «Імпэрыялістычных п'явак і крывасмокаў — на галодны паёк!», «Донары ўсіх краін, яднайцеся!»

Побач сёстры забаблівалі ў мабільны пункт забору крыві.

Збоку ўсчалася валтузьня, ад напругі і стараннасьці саплі моўчкі два сяржанты ці прапары, нешта мычаў якісьці пралетар. Міліцыянты сканфіскавалі ў яго плякат з сакрамэнтальным тэкстам — «Хочаш жні, а хочаш куй». Ад абурэньня яны не маглі адразу сфармуляваць свае абвінавачаньні: «Ты, ты, ты, ё' тваю маць…» «А што я такога напісаў?» «Не, ты дагаворвай, дагаворвай. Мы знаем, што гэта такое!» — прарвала менш мажнага. «Так, знаем, ня дурні, як некаторыя лічаць», — перамог хвілёвую нематы больш дзябёлы. На пляцы выбухнула медзь, зайграў гімн, яны машынальна кінулі схопленага на дол, рукі па швах, далонь — да брыля.

Праз хвіліну міліцыянты зноўку вярнуліся да пэдагагічнай працы: «Калі ўжо пішаш, дык дапісвай да канца, не дуры галавы. Мы знаем, навучаны, зноў галаву падымаеце, не даяце народу нармальна жыць і адпачываць… Аднаго такога зславілі, напісаў на сьцяне: галасуй не галасуй, усё адно… Пятнаццацера сутак далі. Пісакі, лезуць у бутэльку вечна. А нам зь імі змагайся, ня сьпі, замест таго каб бандытаў лавіць. Разьвялося ўсякіх зуброў-казлоў, усялякай зьверыны».

Зайграў аркестар. Міліцыянты рэзка выпусьцілі з рук небаракумітынгоўшчыка, ён паваліўся ад раптоўнасьці і, нязграбна паварушыўшыся, застаўся ляжаць. Напэўна, палічыўшы, што лепей нічога не рабіць. Гімн скончыўся, міліцыянты схапілі яго за каршэнь і пацягнулі поцягам задворкамі пляцу ў «варанок».

Зьнянацку загучала бравурная музыка, міліцыянты тузануліся неяк спуджана, арыштаваны ўпаў, яны слупамі скамянелі — з рукой да чорнага лакаванага брыля. Аслупянелыя, яны ажылі з апошнімі акордамі, зноўку ўчапіліся ў сваю ахвяру, закруцілі рукі за сьпіну: «Мы табе пакажам "хочаш жні, а хочаш куй!", мы табе дамо, ты ў нас атрымаеш!»

*1 траўня 2005 г.*


**СЯРГЕЙ АСТРАВЕЦ** — празаік, журналіст радыё «Свабода». Выдаў тры кнігі прозы. Жыве ў Горадні.

# Чатыры спарынгі для Караткевічаўцаў

У межах фіналу конкурсу імя Ўладзімера Караткевіча праводзіцца сэрыя творчых сустрэч—«спарынгаў» зь беларускімі аўтарамі й прээзэнтацый іх кніг

**7 траўня, субота,** — сустрэча з Валянцінам Акудовічам і Пятром Васючэнкам ды прээзэнтацыя кніг П. Васючэнкі «Адлюстраваньні першатвору» і В.Акудовіча «Разбурыць Парыж».

Адбудзецца ў літаратурным музэі Янкі Купалы. Пачатак у 16.00.

**8 траўня, нядзеля,** — сустрэча з Аленай Бравай і Югасяй Калядой ды прэзэнтацыя кніг А.Бравы «Камэнданцкі час для ластавак» і Ю.Каляды «Галоўная памылка Афанасія».

Месца правядзеньня: заля бібліятэкі імя А.Пушкіна (вул.Гікалы, 19). Пачатак у 16.00.

**9 траўня, панядзелак,** — літаратурная акцыя «Неба над Бэрлінам» з удзелам Уладзімера Арлова, Аляксандра Ірванца (Украіна) і Андрэя Хадановіча.

Месца правядзеньня: сядзіба БНФ (вул. Варвашэні, 8). Пачатак у 16.00.

**10 траўня, аўторак,** — сустрэча з Вальжынай Морт і Альгердам Бахарэвічам ды прэзэнтацыя кнігі В.Морт «Я тоненькая, як твае вейкі».

Месца правядзеньня: літаратурны музэй М. Багдановіча (вул. М.Багдановіча, 7а). Пачатак у 16.00.

Выніковая гала-вечарына пераможцаў літаратурнага конкурсу імя Ў.Караткевіча, а таксама пэрформанс Алеся Пушкіна. У межах вечарыны — прээзэнтацыя кнігі пераможцаў конкурсу імя Ф. Пятраркі «Формула каханьня».

Месца правядзеньня: літаратурны музэй М. Багдановіча. Пачатак у 19.00. Уваход вольны.

**Пераможцы конкурсу імя Ўладзімера Караткевіча:**
Павал Анціпаў, Алеся Башарымава, Аліса Бізяева, Баба Броня, Вікторыя Герасімчук, Вікторыя Дубаневіч, Алесь Жураўскі, Андрэй Карэлін, Антаніна Курдзя, Тамаш Лярмат, Яўгенія Манцэвіч, Соф'я Марозава, Марыя Мартысевіч, Тацяна Нядбай, Сяргей Прылуцкі, Яўген Пыльчанка, Тацяна Пузенка, Алена Пятровіч, Алёна Рыбік, Алесь Сушчэўскі, Павал Сьвярдлоў, Сяргей Трафілаў, Ціхан Чарнякевіч.

# Як я Эўропу не ўратаваў

І не згадаеш, дзе атрымаеш. Што праўда, то праўда. Здаецца, з вэтэранамі заўжды ладзіў. Прывык ужо да іхніх ацэнак гісторыі, стараюся абыходзіць у размове небясьпечныя тэмы. Пра палітыку, Леніна ды Сталіна найперш. А тут папаўся, дый на чым, здавалася б? На песьні. Ды яшчэ на чужой. Быліцу з правінцыйнага жыцьця запісаў **Б.Сьпявак**.

Але раскажу па парадку.

На «гастролях» у Себежы наш хор «Вэтэран» абмяняўся з расейцамі ўпадабанымі нумарамі. Мы ім аддалі шчымлівую песьню «Вдовы», суседзі нам — «Приходите к вечному огню». Дарэчы, сьпявалі яны, трымаючы сьцяжкі ў руках. У адным з куплетаў пералічваліся гарады-героі, і бадзёрыя бабулькі ў такт падымалі адпаведныя сьцяжкі. Было крыху наіўна, але па шчырасьці. Мусіць, дзеля дадатковага эфэкту вэтэранкі працягвалі сьпіс гарадоў, дэклямуючы іх назвы ўжо бязь сьпеваў і махаючы сьцяжкамі. Неяк выйшла ні тое ні сёе.

Прайшло больш як два месяцы. Прыходжу аднойчы на рэпэтыцыю свайго хору, прапусьціўшы з уважлівай прычыны папярэднюю. Развучвалі ўжо якраз тую, падораную, песьню. Сьпяваю разам з усімі. І вось трэці куплет. Прагучалі чатыры радкі. А далей, на паўторы… мяркуйце самі:

Победив в сражениях жестоких,
Пусть придут сюда и станут в ряд
Сталинград, Одесса, Севастополь,
Лиепая, Брест и Ленинград,
Киев, Керчь, Новороссийск и Мурманск,
Орша и Витебск, Минск, Смоленск и Москва!

Тут я адразу падняў руку. «Не, — кажу, — так ня пойдзе. Па-першае, навошта тут Ліепая? Націск у назьве гэтага гораду ставіцца на літару «е», і наагул, гэта ня два склады, а своеасаблівы дыфтонг «іе». І чаму Орша, а ня Тула? І Масква зь Ленінградам ніяк не рыфмуюцца. А тут жа гатовая рыфма напрошваецца: Ленінград — Сталінград. Карацей, калі нельга без паўтору, давайце я мігам перараблю гэты куплет».

Усе пагадзіліся. Не скажу — мяне ў клюбе паважаюць, дый аўтарытэт мясцовага паэта нечага варты. Сьпяваем далей, а я між тым выпраўляю куплет, нават варыянты задумаў. Праўда, пад Севастопаль нічога лепшага не падабраў у рыфму, як Эўропа. Скончыліся сьпевы, і я прапанаваў паслухаць ды выбраць найлепшае. Напрыклад:

Кіеў, Менск, Адэса, Севастопаль,
Керч, Новарасійск і Ленінград,
Брэст, Масква, свабодная Эўропа,
Тула і жалезны Сталінград.

Гэта прыкідка, думаю, а там падшліфуем. Скажам, Сталінград можа быць гордым (напачатку хацеў гордаю Эўропу зрабіць), Маскву можна прыладзіць да «лепшага» месца — карацей, справа тэхнікі.

Аж, браточкі, ня тут тое было. Як ускочыць раптам адна бабуля (раней, здаецца, бухгальтаркай працавала ў выканкаме, праўда, муж быў з начальнікаў)! Як закрычыць, аж усе спужаліся: «Вецераны вам етава не прасьцят! Фашысты! Дайце ім спакойна ўмірэць!» І такі вэрхал адразу ўсчаўся! Пакуль я ліхаманкава думаў, што не так абурыла, — можа, рыфма няўдалая ці склад лішні ўставіў, — астатнія, больш напалітызаваныя, зразумелі, у чым справа. Бабулю абурыла… Эўропа!

Узмаліўшыся да Музы, я імгненна ацаніў, дзе крамола, і прапанаваў новы варыянт: хай Эўропа будзе «спасённая»! Усе аж запляскалі ў ладкі — да таго лёгенька, падалося, мы выйшлі з крызіснага становішча. Аж дзе там! Бабуля ўжо нешта крычала зь перакрыўленым тварам і сутаргава піхала рукі ды ніяк не трапляла ў рукавы паліто, якое яна зьдзерла зь вешалкі. Дарэмна адзін з вэтэранаў тлумачыў ёй, тыцкаючы пальцам у свае мэдалі: «Глядзі, спасаў я, спасаў і Прагу, і Бэрлін!» Дарма інтэлігентная пэнсіянэрка спрабавала давесьці думку, што «спасённая» Эўропа» — гэта гонар Савецкай Арміі, што ў Трэптаў-парку стаіць воін-беларус з уратаванай дзяўчынкай на руках. Ляснулі дзьверы, і разьятраная бабуля ўжо не пачула маёй зьедлівай фразы: «Дайце ёй аўтамат!»

А на душы было брыдка і страшнавата. Божачка! Да старасьці насіць столькі злосьці ў душы! Неасэнсаванай, тупой злосьці! А ўжо ж бы час і схіліць голаў перад няўмольным поклічам Вечнасьці…

Празь некалькі дзён сам сабой прыйшоў у галаву зусім, як мне падаецца, кампрамісны і ідэалягічна выверані (сам працаваў некалі ў прапагандзе) варыянт:

Победив в сражениях жестоких,
Пусть сюда придут и станут в ряд
Киев, Керчь, Одесса, Севастополь,
Минск, Новороссийск и Ленинград.
Не забудь, спасённая Европа,
Тулу, Брест, Москву и Сталинград!

Спадзяюся, усё ўладзіцца. Калі што якое, замяню Тулу на Воршу ці Кіеў на Мурманск. Гэта справа тэхнікі. А там, дзе пра Эўропу, можна і кулачком пагразіць. Толькі б бабулька на рэпэтыцыю прыйшла.

P.S. Працяг гісторыі стаўся нашмат складанейшы, чым думалася. Бабулька ня толькі не прыняла новага варыянту, але і пайшла скардзіцца ў «апарат». Рэзананс пайшоў на ўсю Дрысу. Імкнучыся ўлагодзіць «верную бальшавічку», фракцыя прымірэнцаў выказала паэтычныя здольнасьці. Склаўшы яшчэ адзін варыянт двух злашчасных радкоў. Гэтым разам у іх атрымалася:

Тула, Ворша, Брэст, Ліепая і Мурманск,
Віцебск, Менск, Смаленск, Масква і Бранск.

Раскрытыкаваны найперш спэцыялістамі-харавікамі дзеля паўтору «ск», варыянт быў адрынуты («У вас і так сківіцы выпадаюць, а тады наагул плявацца пачняце ў залю!»).

Урэшце бабуля заявіла пра згоду на кампраміс, але сказала, што пры выкананьні песьні крамольнага куплету сьпяваць ня будзе. Пасьля гарачых слоў і сьлёзнай сцэны з боку кіраўніцы (з эфэктным пакіданьнем на нейкі час клюбу) было прынята цяжкае рашэньне: песьні «Приходите к вечному огню» не выконваць.

Да гонару «апарату», на бок «звышбдзіцельнай» вэтэранкі працы ніхто ня стаў. У тым ліку і з ідэалягічнага аддзелу.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Школа жыцьця



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**ВЕРА БУРЛАК**

## Школа жыцьця

Зь лісьця, травы, трысьця,
Зь люстраў, з карцін на сьцяне
Страшныя вочы жыцьця
Ўпарта глядзяць на мяне.

Я ім сказала: не!
Я іх паслала на...
Страшна глядзяць на мяне,
Цьвёрдыя, быццам сьцяна.

Я чакаю крыху
Дый цалую іх у...
Гэта быў добры ўрок.
Так я спазнала Зрок.

Ад зроку да змроку
Адзін крок.

## Калі мы робім яміны

Калі мы робім яміны,
Падвалы для хацін,
Калі мы сьвідравінамі
Удольле рашацім,

Калі саджаем дрэвы мы,
Калі аром палі,
Глядзяць на нас памерлыя
Празь дзірачкі ў зямлі.

## Збан у агні

Я збан у агні.
І гэта назаўсёды.
Мне назаўсёды ўбілі
ў кроў і ў косьць
Багацьце духу,
Хараство прыроды,
Сусьвету прыгажосьць.
Няма маёй віны,
Што мне яны
Патрапілі ў пячонкі
І там сядзяць,
І іх ня выбіць вонкі.

Магчыма, ўчора я б яшчэ магла,
Ды ўчора я праспала,
Сёньня ж — позна.
З паленаў выпараецца смала,
З паперак — проза,
Ўва мне ж паволі камянее верш
Пра радасьць жыць
І хараство прыроды.
Мяне ня зьменіш больш
— хіба паб'еш.
І гэта назаўсёды.

## Х-танічны верш

Нянька заснула ля грубкі.
Мы — тыя, хто прыходзіць уначы.
У дзетак рэжуцца зубкі.
Ім трэба дапамагчы.

У дзетак рэжуцца рогі,
Капыты і іншая дрэнь,
І праз дзьверы ў траву ля дарогі
Прарастае даўжэзны карэнь-

-чык!

Бабулі коўдрамі накрылі
Сваіх Сержукоў і Каць.
А ў дзетак рэжуцца крылы.
Мы іх навучым лятаць.

А маткі шэпчуць замовы,
Каб нас адагнаць далей,
У змрок ільдзяны зімовы,
Ад сваіх нязнаных дзяцей.

# Салодкая помста Югасі К.

Гэтая кніга можа быць прачытаная рознымі спосабамі, аналізаваная ў розных кодах, альбо, як любіў казаць адзін зь пэрсанажаў Борхеса *Анорыё Бустас Домек*, — «убачаная праз розныя акуляры».

Спосаб першы, непазьбежны, хаця, можа, і ня самы цікавы — генэрацыйны. З гэтае пэрспэктывы кніга Югасі К. можа быць расцэненая як маніфэст дваццацігадовых, з усёй узроставай пазнавальнасьцю эмоцый, стаўленьняў, думак і непрадуманага. Дваццацігадовы насяляюць гэтую кнігу ад першай да апошняй старонкі: яны размаўляюць, маўчаць, кахаюць адзін аднаго, п’юць піва, здаюць сэсію, зноў размаўляюць, пішуць казкі, фантастычныя апавяданьні й маленькія гісторыі пра самоту, чакаюць натхненьня, каханьня, грошай і тэлефонных званкоў. Пры ўсёй сваёй адрознасьці і ўнутранай канфліктнасьці яны трымаюцца разам ды не пускаюць у свой сьвет чужых. Чужыя, калі й паўстаюць на даляглядзе, дык у лепшым выпадку на правах *зьвяроў-суайчыньнікаў* Харэўскага: дзіўныя зьнікаючыя істоты, вартыя вывучэньня, аховы ды шкадаваньня.

Гэты сьвет можа падацца ненатуральным: мы не знаходзім у ім аніякіх знакаў беларускай рэчаіснасьці: адраджэньня, змаганьня, супраціву. Аніякіх сымптомаў адчуваньня сябе ў культурным гета. Аніякай заклапочанасьці лёсам гаротнай бацькаўшчыны і роднай мовы. Аніякіх сьведчаньняў таго, што мы лічым *праблемамі выжываньня*. Зрэшты, у прозе Каляды няма нават канфлікту пакаленьняў.



**Югася Каляда. Галоўная памылка Афанасія.** — Менск: Мастацкая літаратура, 2005.



Дык што перад намі — утопія? Ідылія? Кіч? Ці наадварот, рэакцыя на пераўтварэньне ўсіх вышэйзазначаных рэчаў (адраджэньне, змаганьне, супраціў) у культурныя штампы, непрыдатныя для літаратуры?

У параўнаньні з творчасьцю трыццацігадовых, у прозе Каляды пануе дзіўная расслабленасьць. Пасьля Бахарэвіча зь яго *беларусамі на крышталёвых шарах*, пасьля Евы Вежнавец зь *беспрытульнымі хохлікамі*, што крадуць цукар у калідорах *Газэты выборчай*, проза Каляды можа падацца нават сэнтымэнтальнай. Але ненадоўга.

Як бы там ні было, але ў гэтую *ідылію вечнай маладосьці* прарываюцца іншыя, дарослыя пэрсанажы: на самым пачатку — Палітык (які застаецца безыменным), пры канцы — выкладчык, дацэнт і адраджэнец Афанасі. Менавіта гэтая закальцаванасьць кнігі пераўтварае ўтопію ў дэтэктыў: напачатку палітык забівае ў сабе самоту (і ўскосна вінны ў сьмерці маленькай пісьменьніцы), напрыканцы Афанасі забівае ў сабе каханьне. Наратарка кнігі (яна ж аўтарка і адна з гераіняў) пляную маштабную помсту: яна кідае два ўнівэрсытэты ды пачынае вучыцца на пракурора. Паралельна пачынае пісаць кнігу «Галоўная памылка Афанасія», у якой імкнецца зьблытаць літаратуру і рэчаіснасьць (пераўтвараючы рэальных людзей у пэрсанажаў ды наадварот, нацкоўваючы пэрсанажаў на рэальных людзей) ды скіраваць чытача ў іншыя бакі. У пэўным сэнсе кніга і мусіць быць асноўнай помстай Югасі К.

Вось такая інтэрпрэтацыя.

Могуць быць і іншыя. Так, Ігар Бабкоў, якому кніга надзвычай спадабалася (хаця ён так і ня змог уцямна растлумачыць чаму), прапанаваў ідэю помсты Югасі К. наступным чынам:

«Жыцьцё — гэта *непазьбежная памылка*, якая нас выбірае пры нараджэньні, тое, што з намі *здараецца*, ад чаго мы ня можам ухіліцца. Літаратура ж — *салодкая помста* за гэтую *прамінаючую непазьбежнасьць*».

Альбо, іншымі словамі:

адыходзіць жыцьцё
без адказу жыцьцё
ды любоў, ды любоў яму ўся
за пытаньне.

**Францішак N.**

# Тайны полацкіх лёхаў

**Иезуиты в Полоцке. 1580—1820 г. Часть 1.** — Полоцк: издатель А.Судник, 2005.

У сэрыі «Спадчына Полацкай зямлі», якую летась заснавалі палачане — выдавец А.Суднік і бізнэсовец А.Супрановіч, пабачыла сьвет чарговая кніга — «Езуіты ў Полацку. 1580—1820 г. Ч. 1». Зборнік складаецца з напісаных у розныя гады чатырох тэкстаў.

Адкрываецца кніга працай выкладчыка Полацкага кадэцкага корпусу Аляксея Мораля «История города Полотска и возникновение здания Полотского кадетского корпуса», надрукаванай у 1907 г. Напэўна, Мораля і меў на ўвазе Ластоўскі, калі пісаў у славутых «Лябірынтах»: «Адзін зь іх быў мясцовы чыноўнік, абрусельы немец, якога я знаў з брашуры, напісанай ім, калі было яшчэ моднае і паплатнае для чыноўніцкай кар’еры русіфікатарства. У гэнай брашуры ён задаваўся мэтай давесьці, што парасейску трэба пісаць назву гораду ня «Полоцк», а «Полотск» і што былым у гэтым перайменаваньні простай назовы краўся сам цэнтар «абрусеньня краю».

Аднак ня спробай тлумачэньня іншага напісаньня імя гораду каштоўная праца. Мораль прыводзіць пералік разрабаванай маёмасьці полацкіх езуітаў, што часткова трапіла ў музэі і вышэйшыя ўстановы Масквы і Пецярбургу.

Расейцы знайшлі ў будынках Полацкага езуіцкага калегіюму бібліятэку, якая складалася з трох частак — галоўнай, пакаёвай і польскай. Найбольш каштоўныя кнігі забралі з сабой езуіты і піяры. Але і тое, што засталося, уражвае. Камісія налічыла 23 551 том. Пазьней 6 260 тамоў паехалі ў Санкт-Пецярбурскую публічную бібліятэку, 454 тамы — у Маскоўскі ўнівэрсытэт, 389 тамоў — у Імпэратарскую публічную бібліятэку, 3 056 тамоў — у галоўнае ўпраўленьне духоўных справ і г.д.

Паводле Мораля, генэрал ордэну езуітаў Габрыэль Грубэр перавёз з Рыгі «многія гістарычныя паперы, якія тычыліся гісторыі балтыйскага краю. Па выгнаньні езуітаў полацкіх іх архіў перавезены ў архіў Міністэрства ўнутраных справ. (…) У пажары 1863 г. усе паперы згарэлі».

У мінэралягічным кабінэце чальцы камісіі налічылі: 2 алмазы, 20 ізумрудаў, 5 сапфіраў, 20 амэтыстаў, 24 кавалкі тапазаў, 100 кавалкаў цыркону і г.д. А таксама самародныя зьлёткі золата і срэбра, 3 біўні маманта, 8 акамянеласьцяў рыб і расьлін і іншыя экспанаты.

У карцiннай галерэі захоўвалася 67 прац — сярод іх карціны Рубэнса і старажытныя копіі карцін Рафаэля і Тыцыяна, якія выканаў езуіт Нядзьвецкі.

Яшчэ больш унікальная калекцыя чакала камісію ў фізычным кабінэце: галава, якая ўмела гаварыць; купідон, які мог рухацца ў калясцы; дзядок зківаючай галавой; купец, які гандляваў у сваёй лаўцы, і іншыя дзівы мэханікі і оптыкі. У кабінэце таксама налічылі 141 навуковую прыладу. Камісіі загадалі «прылады, якія маюць на ўвазе, хутчэй, фокус, чым навуковую мэту… адаслаць у Пецярбург».

Відавочна, на вочы камісіі патрапілі далёка ня ўсе скарбы полацкіх езуітаў. З даўніх часоў паўсталі легенды, што самыя каштоўныя рэчы манахі здолелі схаваць у падземных сутарэньнях. І тры іншыя тэксты зборніка апісваюць пошукі падземных лёхаў пад езуіцкімі мурамі.

У тэксьце краязнаўцы Івана Дэйніса (1905—1985) распавядаецца пра пошукі падземнага ходу на левы бераг Дзьвіны ў 1920 г., якія ладзіліся па загадзе асобага аддзелу 15-й арміі РСЧА. Чырвонаармейцы баяліся польскіх шпегаў, але лёх так і не знайшлі.



Артыкул Міхаіла Андрэева (1987) — «Пра пошук і наведаньне падземнага ходу пад ракой Заходняй Дзьвіной» — зьяўляецца апісаньнем дзіцячых вандровак у падзямельле ў сярэдзіне 1920-х.

Дасьледчык езуіцкіх скляпеньняў Андрэй Бухавецкі, які спускаўся ў полацкае падзямельле ў 2000 г., у сваім артыкуле сьцьвярджае, што полацкія лёхі былі сур’ёзна пашкоджаны выбухам сабору Сьв.Стэфана ў 1964 г.

Кніга будзе цікавай як аматарам полацкай гісторыі, так і дыгерам. Адзінае — не сур’ёзна называць езуіцкі ордэн «адыёзным», як гэта зрабілі укладальнікі зборніка ў анатацыі. Адыёзнымі, хутчэй, можна назваць дзеяньні рабаўнікоў Полацкага езуіцкага калегіюму і руйнавальшчыкаў сабору.

**Васіль Кроква**

АДАМ ГЛЁБУС



# Сучасьнікі

## 2005. Лу і ліст Стрындбэрга

Нарвэскі брашурыст Эрленд Лу ў кнізе пра Фінляндыю «Найлепшая ў сьвеце краіна» адхіліўся ад тэмы і напісаў колькі словаў пра Швэцыю: «Я чуў, што ў Стакгольме на пісьмовым стале Стрындбэрга ляжыць такі неадкрыты ліст. Ён не пасьпеў ускрыць яго перад сьмерцю, а потым яго так і пакінулі. Незразумела, падабаецца мне тое ці не. Усё-такі гэта нейкая міфаманія. Цікава, што напісана ў гэтым неадкрытам лісьце? Музэйшчыкі хочуць, каб мы пра гэта думалі, начамі ня спалі, гадалі, што ж там можа быць, але мяне гэта чамусьці не хвалюе. Пляваць я хацеў, што там напісана. Мне і без таго ёсьць аб чым падумаць. Напрыклад: пра Фінляндыю». Лу думае пра Фінляндыю, а я — пра Беларусь, дзе музэйшчыкаў-міфаманаў таксама хапае. Да прыкладу: менскія музэйшчыкі хаваюць інтымны дзёньнік Максіма Багдановіча, яны таксама хочуць, каб мы начамі ня спалі, а думалі, як Максім інтыміўся з Клаваю. Менскія музэйшчыкі больш цынічныя за стакгольмскіх, бо нашыя начамі чытаюць Максімавы дзёньнікі, самі чытаюць, а народу не паказваюць. Мне, як і Лу, пляваць на міфаманію скнарыстых музэйшчыкаў, бо сам я тыя запісы прагглядаў і ведаю, як Максім заінтыміўся з Клаваю. Каб ня быць у хаўрусе зь міфаманістымі музэйшчыкамі і брашурыстам Лу, які так і не сказаў чытачам пра зьмест ліста, напісанага Стрындбэргу, скажу: Максім любіў Клаву папростаму, без вычварэньняў, цёпла любіў і радаваўся той любові.

*21.04.2005*

## 2004. Кася і 200 латаў

Паспрачацца ды выйграць — мілы ўчынак. А прайграць? Ну немагчыма заўсёды выйграваць… Але ж хочацца, і яшчэ як карціць, хоць цудоўна ведаеш: у спрэчцы заўсёды дурань прайграе падлючаму монстру. Хочацца быць монстрам зь лішкам ведаў? Так. Хацелася таго і Касі Андарсан (Нічыпаровіч). Кася даўно пераехала ў Рыгу, выйшла замуж, стала грамадзянкай Латвіі, але цікаўнасьць да радзімы і белпатрыятызм ня страціла. Калі хто зь сяброў прыяжджае зь Беларусі ў Рыгу, дык чуе Касіна «як-там-у-нас?». Аднаго разу беларусачка пачула такое: «Хадзіў у менскі Макдональдс, еў дранікі…» «Жартуеш?» — «Не!» — «Ты што, нас — беларусаў зусім за лохаў абарыгеністых трымаеш? Якія дранікі ў Макдональдсе?» — «Звычайныя, з бульбы, са сьмятанаю, нават смачна! Ня верыш? Давай паспрачаемся!» Кася прайграла ажно 200 латаў з-за таго, што беларускі кулінарны патрыятызм набыў такую этнаграфічную форму, як залаты дранік у Макдональдсе.

*28.04.2005*

# Баскетбол па-беларуску

Менскі «Віталюр» у матчы з «Горадняй–93» вядзе ў фінале мужчынскага чэмпіянату па баскетболе зь лікам 2:0. Калі прэзыдэнтам клюбу «Горадня–93» быў Алесь Мілінкевіч, каманда выступала мацней, піша **Алег Раявец**.



ПРЕССБОЛ

У мінулыя пятніцу і суботу супернікі правялі два паядынкі ў сталіцы. 6 траўня (і, калі спатрэбіцца, 7 траўня) фіналісты згуляюць у горадзе над Нёманам. «Віталюру» дастаткова раз перамагчы, і гегемонія васьміразовых чэмпіёнаў Беларусі будзе спынена.

## Новыя фаварыты

«Віталюр» — пераемнік сталічнай РШВСМ (Рэспубліканская школа вышэйшага спартовага майстэрства). Летась (сэзон 2003/2004) РШВСМ упершыню стартавала ў беларускім першынстве — і адразу заваявала «бронзу». Потым над камандай узяла апеку фірма «Віталюр», буйны імпартэр рыбы і рыбнай прадукцыі — клюб памяняў назву і ўмацаваўся шэрагам моцных гульцоў.

А вось шматразовы чэмпіён краіны (1996, 1998—2004) «Горадня-93» мінулым летам панёс значныя страты. Клюб пакінуў ня толькі галоўны трэнэр зборнай Беларусі, самы вядомы айчынны спэцыяліст Аляксандар Барысаў, але й шэраг вядучых гульцоў. Так, Уладзімер Шарко, Аляксей Пынцікаў і Дзяніс Коршук перайшлі якраз у «Віталюр», прывабленыя лепшымі «ўмовамі». Так што яшчэ на старце сэзону экспэрты прадракалі менчукам залатыя мэдалі першынства. Праўда, гарадзенцам прагназавалася толькі «бронза».

## Чэмпіянат бяз залі

У «Віталюру», патэнцыйнага чэмпіёна Беларусі, няма нармальнай, як з заўзятарскага гледзішча, баскетбольнай залі. «Віталюр» праводзіць хатнія паядынкі ў спартовым комплексе «Гарызонт», што ля галоўнага офісу заводу. Але глядацкая трыбуна там адна, прычым на бальконе.

У пятніцу ў спарткомплексе назіраўся «аншляг». Каля сотні заўзятараў разьмясьціліся адразу за левым колцам: нехта пасеў на гімнастычныя лавы, хтось прыцягнуў аднекуль крэслы, большасьць стаялі. Зрабіць тое самае за правым колцам яны не маглі: глухая сьцяна. Трыбун уздоўж пярэдняй лініі няма, тут разьмяшчаюцца лаўкі трэнэраў, запасных і арбітраў. З адваротнага боку пляцоўкі — акно з прыгожым відам на вуліцу Куйбышава.

Таму другая сотня заўзятараў, у тым ліку і карэспандэнт «НН», акупавала балькон. На першым паверсе балькону — у адзін шэраг лаўкі, дзе паселі тыя, хто прыйшоў загадзя. Астатнія стаялі на «другім паверсе». У прынцыпе, нічога страшнага, восемдзесят хвілін адстаіш. Толькі ў вялікім перапынку ня тое што ня сыдзеш у бар — нават ня ступіш пару крокаў назад да сьцяны паразмаўляць па мабільніку. Бо тваё месца зойме шчасьлівы калега-заўзятар, які спазьніўся на матч і дзьве дзесяціхвілінкі стаяў на дыбачках за тваёй сьпінай.

## Дзень першы

«Віталюр», як і належыць фаварыту, першым паклаў у кошык два пункты. Зрабіў гэта Дзяніс Коршук, які, дарэчы, пяць разоў станавіўся чэмпіёнам Беларусі ў складзе «Горадні-93». Зарабіў «Віталюр» і першы фол — ён на рахунку Эдуарда Прыймы, — і першы слэмданк (гэта калі мяч забіваюць у колца зьверху). Ён таксама на Прыймавым рахунку.

Першую чвэрць матчу «Горадня» не адпускала менчукоў болей чым на тры-чатыры пункты. Але потым «Віталюр» ірвануў наперад. Чуваць быў толькі скрып і шоргат красовак па паркеце. Пры ліку 17:13 за дваццаць сэкундаў да сканчэньня першай чвэрці трэнэр менскага клюбу Міхаіл Фэйман узяў таймаўт. Навошта? «Віталюр» правёў выніковую атаку і пайшоў на перапынак з жыцьцесьцьвярджальным адрывам у сем пунктаў — 20:13. У другой чвэрці «Віталюр» замацаваў сваю перамогу — 46:33. Здавалася, што ўсё: Горадня «паплыла». Але выхаванцы Сяргея Паграбнёва не раскісьлі, а, сьціснуўшы зубы, пачалі скарачаць адставаньне ў ліку. Гульня вэтэранаў клюбу Юр’я Качана ды Андрэя Васілеўкі, асабліва перахопы мяча пад сваім шчытом, ня раз сарвалі апладысмэнты менскай публікі. І ў сярэдзіне апошняй чвэрці гарадзенцы амаль дасталі «Віталюр» — 74:69. Але ж пару разоў страцілі мяч пад «варожым» шчытом, а менчукі такіх хібаў не даравалі. Фінальны лік — 78:69.

## Дзень другі

У суботу матч пачынаўся а 12-й, што было вельмі зручна: а 19-й у сталічных клюбах у жывым этэры паказвалі футбольны матч ангельскай прэм’ер-лігі паміж «Болтанам» і «Чэлсі», дзе клюб Рамана Абрамовіча аформіў чэмпіёнства. А 16-й на стадыёне «Трактар» пачынаўся адзін з галоўных матчаў футбольнага першынства: МТЗ-РІПА — «Шахцёр» (Салігорск). Заўзятар, што сядзеў побач са мной, нават пасьпеў на другі тайм матчу расейскай футбольнай прэм’ер-лігі між «Зэнітам» і «Лякаматывам», які пачаўся а 13-й па менскім часе.

У параўнаньні зь пятніцай гледачоў паменшала напалову. «Аншляг» 29 красавіка, відаць, быў абумоўлены канцом працоўнага дня. А ў суботу большасьць паспалітага люду трэслася ў транспарце, кіруючыся на Камароўку. Усё ж на наступны дзень быў праваслаўны Вялікадзень.

Першая палова матчу нарадзіла інтрыгу. Пасьля першай чвэрці «Горадня» вяла зь лікам 22:21. У другой чвэрці без барацьбы спачатку аддала дзесяць ачкоў менчукам, а потым кінулася наўздагон — 39:42. А вось трэці пэрыяд стаў фатальным для гадаванцаў Сяргея Паграбнёва: яны набралі толькі чатыры (!) ачкі і пайшлі на апошні перапынак, саступаючы дваццаць пунктаў — 43:63.

Частка гледачоў пакінула залю, астатнія сфакусаваліся на індывідуальным майстэрстве гульцоў. Аплядзіравалі «трохачковікам» «менчукоў» Уладзімера Шарка, Георгія Кандрусевіча і Дзяніса Коршука і «гарадзенца» Андрэя Васілеўкі, які набраў найбольшую колькасьць балаў у матчы — 18.

Апошні ў адзіночку зацята змагаўся за кожны мэтар пляцоўкі, покуль ягоная каманда адбывала нумар. Экс-гарадзенец, а сёньня капітан «Віталюру» Ўладзімер Шарко наагул патрапіў у колца мэтраў зь дзесяці, выклікаўшы авацыі.

Павесяліў хлопчык-сэрвісмэн. У трэцяй чвэрці пад колцам «Горадні» ў выніку барацьбы ўтварылася велічэзная мокрая пляма. Хлопчыка, як Сьнягурку, клікалі хвіліны дзьве. Зьявіўся малады чалавечак са швабрай вышэй за галаву і… урачыста аддаў яе «віталюраўцу» Кандрусевічу. Той зь веданьнем справы — усё ж дзесяць гадоў правёў у баскетболе — працёр пляцоўку. Шураваньне дало плён. Розыгрыш мяча — два ачкі ў «кошыку».

Фінальны сьвісток зафіксаваў канчатковы лік — 79:58. Я быў пасунуўся пасьля матчу па камэнтар да С.Паграбнёва (наконт прычын правалу ў другой палове гульні), але, убачыўшы ягоны страшэнна стомлены і спустошаны твар, схаваў дыктафон у сумку.

## Суцэльныя праблемы

Словазлучэньне «беларускі баскетбол» прымусіць заўзятара лішні раз уздыхнуць. Жаночы чэмпіянат краіны складаецца з чатырох клюбаў. У кастрычніку на старт мужчынскага першынства выйшлі восем камандаў, да фінішу дабраліся сем. «Барысаў» праз фінансавую нэндзу зьняўся з чэмпіянату.

Ва ўсім сьвеце баскетбол зьбірае па 10—15 тыс. гледачоў на трыбунах, на чым можна зьбіраць немалыя грошы. Баскетбол (перадусім заакіянскі і эўрапейскі) — відовішчная гульня. Тут не засьнеш, як на футболе, чакаючы 90 хвілін аднаго мяча. Падзеі зьмяняюцца вельмі хутка (на атаку — 24 сэкунды). Пры нармальным стаўленьні да баскетболу Беларусь магла б стаць моцным арэшкам у Эўропе, а не целяпацца на задворках. У 1994 г. на моладзевым чэмпіянаце Эўропы мы былі першымі. Дый генафонд наш блізкі да літоўскага. Але столькі страцілі за дзесяць гадоў.

Сыходзячы з суботняга паядынку, злавіў сябе на парадаксальнай думцы: вось яшчэ адзін аргумэнт галасаваць на выбарах-2006 за Мілінкевіча. Быў жа ён прэзыдэнтам клюбу «Горадня-93», прычым якраз у 1995/96 гг., калі гарадзенцы заваявалі сваё першае «золата». Няўжо, калі стане прэзыдэнтам, пакіне любімую гульню па-за ўвагай? Бо ў сёньняшняй сытуацыі спадзявацца на падтрымку баскетболу з боку ўладаў не выпадае. А вельмі хочацца відовішчаў і нармальнага стаўленьня да гледача.

СЬЦІСЛА

### Пакарэньне Эквадору

5 і 7 траўня беларуская альпінісцкая экспэдыцыя зьдзейсьніць узыходжаньне на адны з найвышэйшых вульканаў сьвету — Чымбараза і Катапаксі, што знаходзяцца ў Эквадоры (Паўднёвая Амэрыка). Беларусаў, якімі кіруе альпініст Сяргей Варывода, не палохае ні палітычны крызіс у Эквадоры, ні неспрыяльнае надвор’е, ні нават тое, што нядаўна вульканы прымусілі пахваляваца мясцовых жыхароў. З траўня альпіністы спусьціліся ў кратэр вулкану Кілятоа.

### Аўтамабіліст-пераможца

Чэмпіён Беларусі пінскі «Аўтамабіліст» стаў пераможцам міжнароднага турніру па матаболе, прысьвечаным 60-годзьдзю Перамогі. Турнір і праходзіў у Пінску. «Аўтамабіліст» перамог ва ўсіх сустрэчах, а ў фінале перамог францускую каманду «Вальрэас» (Францыя). Трэцяе месца заваявала каманда «Юна» з Лунінца.

### Посьпех Жаўнова

Клюб «Масква» ў міжсэзоньне зрабіў удалую пакупку — галкіпэра нацыянальнай футбольнай зборнай і барысаўскага БАТЭ Юр’я Жаўнова. Зь сямі тураў футбольнага расейскага першынства ён адстаяў «на нуль» у шасьці. «Масква» цяпер займае першае месца ў чэмпіянаце Расеі.

**AP, bbcrussian.com, belta.by**

ІНФАРМАТАР

## Пасольствы і прадстаўніцтвы замежных краінаў

**Азэрбайджан**
вул.Варвашэні, 17-504
288-25-77

**Армэнія**
вул.Кірава, 17
222-30-72, т/ф 227-51-53

**Баўгарыя**
пл.Свабоды, 11
206-65-58, ф. 206-65-59

**Ватыкан**
вул.Валадарскага, 6
289-15-84, ф. 289-15-17

**Вялікабрытанія**
вул.К.Маркса, 37
210-59-20, ф. 298-23-06

**Ізраіль**
Партызанскі пр., 6а
230–44–44, 230–42–98,
ф. 210–52–70

**Індыя**
вул.Кальцова, д. 4, корп. 5
262-99-70, 262-93-99,
ф. 288-47-99

**Італія**
вул.К.Маркса, 37
298-29-69, ф. 234-30-46,
298-20-01

**Іран**
вул.Суворава, д. 2
237-66-99, ф. 237-61-99

**Казахстан**
вул.Куйбышава, 12
288-10-26, 284-48-10,
ф. 234-96-50

**Кітай**
вул.Берасьцянская, 22
285-36-82, т/ф 285-36-82

**Куба**
вул.Чырваназорная, 13
284-76-36, ф. 200-23-45

**Кыргызстан**
вул.Старавіленская, 57
234-91-17, ф. 234-16-02

**Латвія**
вул.Дарашэвіча, 6а
284-93-93, 284-74-75, ф. 284-73-34

**Лібія**
вул.Няжданавай, 41
234-62-35, ф. 234-70-86

**Літва**
вул.Захарава, 68
285-24-48, ф. 285-33-37

**Малдова**
вул.Беларуская, 2
289-14-41, ф. 289-11-47

**Палестына**
вул.Алешава, 61
237-10-88, 237-10-87, т/ф 237-10-97

**Пэру**
вул.Прытыцкага, 34
216-91-15, т/ф 216-91-14

**Польшча**
вул.Румянцава, 6
288-23-13, ф. 236-49-92

**Расея**
вул.Старавіленская, 48
234-54-97, ф. 250-36-64

**Румынія**
зав.Масквіна, 4
203-77-26; ф. 210-40-85

**Славакія**
вул.Усходняя, 133/168
216-15-63, ф. 262-15-61

**ЗША**
вул.Старавіленская, 46
210-12-83, ф. 234-78-53

**Таджыкістан**
вул.Кірава, 17
222-37-98, т/ф 227 76 13

**Туркмэністан**
вул.Кірава, 17
222-34-27, т/ф 222-33-67

**Турцыя**
вул.Валадарскага, 6
227-13-83, ф. 227-27-46

**Украіна**
вул.Старавіленская, 51
283-19-90, ф. 283-19-80

**Францыя**
пл.Свабоды, 11
210-28-68, ф. 210-25-48

**ФРГ**
вул.Захарава, 26
217-59-00, ф. 236-85-52

**Чэхія**
зав.Музычны, 1/2
226-52-43, ф. 211-01-37

**Сэрбія і Чарнагорыя**
вул.Сурганава, 29А
239-39-90, ф. 232-51-54

**Японія**
пр.Машэрава, д.23, корп.1
203-60-37, ф. 210-41-80

**Банглядэш**
вул.Я.Купалы, 7-100
т/ф 227-68-15

**Нэпал**
пр.Машэрава, 45
289-30-88, ф. 211-28-73

**Нідэрлянды**
вул.Мележа, 3-402
262-53-23, ф. 262-40-52

**Уругвай**
вул.Няміга, 8
211-06-68, ф. 298-23-76

**Швайцарыя**
вул.Чырвонаармейская, 22А-20
227-18-42, ф. 217-84-62

**Швэцыя**
вул. Варвашэні, д. 73-401
т/ф 283-14-31

**Эстонія**
вул.Дарашэвіча, 6а
217-56-70, ф. 210-12-60

КАІСА

# Рэха ўнівэрсіяды

Імпрэза ў БНТУ завяршылася амаль месяц таму, але кругі ад яе разыходзяцца дагэтуль. Напрыклад, адзін зь лідэраў наваполацкіх шахматыстаў даслаў нам прыгожа выйграную і не бяз гумару пракамэнтаваную партыю. Цікава, што правіла, згодна зь якім студэнты лепш гуляюць на сваім полі, спрацавала за межамі Беларусі: ва ўкраінскай унівэрсіядзе, што праходзіла ў Львове пры канцы сакавіка, таксама перамаглі гаспадары. За львоўцаў на першай дошцы гуляў чэмпіён Украіны Андрэй Валакіцін. Напрошваецца тварыскі матч паміж найлепшымі камандамі дзвюх краін.

Надоечы беларускія шахматысты выехалі ў Харкаў — на т.зв. «Кубак рэктара». Але пра кубак іншым разам. Цяпер — абяцаны пэрл ад магістранта Полацкага дзяржунівэрсытэту, машынабудаўніка, безь пяці хвілін майстра спорту.

**ВР**

Як бы вы згулялі?



**А.Лукашок (ПДУ) — А.Голуб (БДЭУ). Менск, 2005.**

1. Kf3 Kf6 2. g3 g6 3. Cg2 Cg7 4. 0-0 0-0 5. c4 c6 6. d4 d5 7. b3 Cf5 8. Cb2 Ce4 9. Kbd2 Kbd7 10. Ke4 Ke4 11. Фc2 e6 12. e3 Фc7 13. Tac1 Tac8 14. Tfd1 f5 15. Ke1 Фb8 16. Kd3 Tfe8 17. a4 b6 18. Фe2 Фb7 19. Tc2 Cf8 20. Tdc1 a6 21. Kf4 Kpf7 22. Ke6?!? (Клічнік за ідэю, а два пытальнікі — за тое, што ідэя была няслушна рэалізаваная.) 22...Te6?? (Кожны разраднік, падумаўшы, адцеміць, што не турой трэ было біць адчайнага скакуна... Абодва супернікі «зяўнулі» ход, які «складана» было знайсьці, — відаць, знаходзіліся пад гіпнозам ад уражальнай ахвяры. Дарэчы, мне за партыяй здалося, што пасьля 22...Kpe6 23. cd+ чорныя павінны ўзяць пешку каралём, на што я прыкінуў у галаве парачку-другую пекных варыянтаў. Тыя ж варыянты, напэўна, разьлічыў і мой партнэр.) 23. cd Td6 24. f3 Kef6 25. e4?! (Мацней 25. dc Tdc6 26. Tc6 Tc6 27. Tc6 Фc6 28. Фa6 з пэрспэктыўнай пазыцыяй. 25...Kd5 (25...Ch6 вымушала да разьмен і стабілізацыі цэнтру, аднак і цяпер партнэры пасьпяхова выпусьцілі гэты працяг з поля зроку.) 26. ed c5 27. f4 Te8 (*гл. дыяграму*) 28. Фe6+ (Вось *Яно*, тое, дзеля чаго камэнтавалася гэта партыя. Проста, але густоўна...) 28...Tee6 29. de+ Kpe6 30. Cb7. 1-0. *(Заўвагі кандыдата ў майстры спорту А.Лукашка.)*

ПАРТЫЯ З ГРОСМАЙСТРАМ

Чытачы харобра прасунулі слана наперад: 16...Cf5-g4. «Грос» нечакана ўвёў каня з галоўнага поля дзеяньняў: 17. Kc3-a4. Праўда, у гульню ўступаюць дзьве фігуры: слон b2 і фэрзь b3. Дык біць або ня біць на f3? Чакаем адказаў да панядзелка, 19.00. nn@promedia.by («Каіса»), SMS: 754-04-53, byChess.narod.ru (партыя on-line).

**З. Лыбін – чытачы «НН». Ход чорных.**



ВАРТА ПАГЛЯДЗЕЦЬ

### Пятніца, 6 траўня

**СТВ, 9.20**

«Пэйзаж пасьля бітвы».
Польшча, 1970,
рэж.Анджэй Вайда.

Драма па аповесьці Тадэвуша Бароўскага.

У фільме «Пэйзаж пасьля бітвы» вайна скончылася, але бітва з самім сабой усё роўна працягваецца. Даніэль Альбрыхскі — альтэр-эга рэжысэра — іграе чалавека, якому цяжка вяртацца да былога жыцьця пасьля спустошанасьці й гвалту вайны.

Карціна была ўспрынятая як «восеньскае» пасьляслоўе аўтара да трагічных драм, пастаўленых ім у 1950-я гады.

Анджэй Вайда — тонкі й глыбокі рэжысэр, найлепшы рэжысэр Польшчы. Зьвярніце ўвагу, як нечакана выкарыстоўваецца клясычная музыка ў карціне — «Восень» Антоніё Вівальдзі з цыклу «Часы году».

**«Лад», 17.05**

«Знак бяды», другая серыя .
Беларусь, 1986,
рэж.Міхаіл Пташук.

Драма-трагедыя паводле аповесьці Васіля Быкава. Знаны твор Быкава доўга выклікаў насьцярогу камуністычных уладаў — і экранізавалі яго толькі на пачатку перабудовы. М.Пташук захаваў неабходныя быкаўскія рэтраспэкцыі — сцэны калектывізацыі й раскулачваньня — і паспрабаваў, наколькі для рэжысэра магчыма, наблізіцца да ўвасабленьня клясычнага твору.

Але позірк Пташука не такі аскетычны й засяроджаны, як у Быкава: рэжысэр дадае бытавыя ноткі, адыходзіць ад інтанацыі напружанага роздуму, зьмякчае трагедыйную прыпавесьцевасьць на карысьць вонкавых дзеяньняў-эмоцый.

Сьцепаніду грае Ніна Русланава («Ніка» за ролю) — і яе гераіня атрымалася занадта валявой, мэтанакіраванай, цьвёрдай, у адрозьненьне ад быкаўскага прататыпу. А вось Генадзь Гарбук у ролі Петрака — эталённае ўвасабленьне нацыянальнага характару: зь мяккімі вачыма, стрыманасьцю й глыбінным унутраным жыцьцём.

«Знак бяды» Пташука застаецца значным беларускім кінатворам.

### Субота, 7 траўня

**«Лад», 10.30**

«Вайна пад стрэхамі»,
фільм першы.
Беларусь, 1967,
рэж.Віктар Тураў.

Кінараман паводле аднайменнага раману Алеся Адамовіча, першай часткі дылёгіі «Партызаны».

Сям'я Ганны Корзун (Ніна Ургант) — яна, дзеці-падлеткі, брат Павал з жонкай і дзядуля — застаецца ў акупацыі. Перад героямі стаіць выбар: што рабіць? Ганна пачынае дапамагаць партызанам, але й адначасова спрабуе ўберагчы дзяцей. Але доўга хавацца не атрымаецца…

Сцэнар як да гэтай, так і да наступнай карціны Турава напісаў сам Алесь Адамовіч.

Тураў імкнецца да «дакумэнтальнасьці» і лірызму вайсковага кінатвору — і дзеля гэтага выкарыстоўвае чорна-белую плёнку, уважліва сочыць за дэталямі й чалавечымі эмоцыямі, выкарыстоўвае «мазаічную» кампазыцыю.

Карціна супрацьлеглая па эстэтыцы пампэзнафальшывым фільмам 1950-х гадоў, дзе Сталін падаецца галоўным героем, а астатнія людзі — нікчэмныя марыянэткі.

З улікам таго, што падобны ўрачысты стыль на Беларусь вярнуўся, дылёгія Турава выглядае надзвычай падрыўной. А калі дадаць, што гаворка ідзе пра падпольле і партызанаў, можна толькі зьдзіўляцца, чаму тураўскую дылёгію дасюль не забаранілі.

**«Лад», 18.40**

«Сыны ідуць у бой»,
фільм другі.
Беларусь, 1969,
рэж. Віктар Тураў.

Экранізацыя другой часткі дылёгіі «Партызаны».

У гэтай частцы дылёгіі сям'я Корзунаў знаходзіцца ўжо ў партызанскім атрадзе…

### Нядзеля, 8 траўня

**СТВ, 22.10**

«Ляцяць жураўлі».
Расея, 1957, рэж. Міхаіл Калатозаў.

Драма па п'есе Віктара Розава «Вечна жывыя».

Адзіны савецкі фільм, які атрымаў у Канах галоўную ўзнагароду. Шэдэўр, які амаль не старэе.

Гісторыя каханьня Барыса й Веранікі, якая здрадзіла свайму каханаму, які пайшоў на фронт, напоеная высокім трагізмам і непарадольнай, вечнай любоўю.

Рэжысэру Міхаілу Калатозаву й апэратару Сяргею Ўрусеўскаму ўдалося зрабіць немагчымае — увасобіць на экране трапяткую, пекную й імклівую чалавечую душу. Гэта ня сцэны перадсьмяротных сноў (якія выглядаюць крыху архаічнымі) — але ўзьлёты камэры над гераіняй, ціканьне гадзіньніка ў разбамбаваным доме — і клін жураўлёў над зямлёю.

Сьветлая, чалавечная й гуманная гісторыя.


KINOCLUB.BY.RU

**НТВ, 22.35**

«Якія гаворацць зь ветрам».
ЗША, 2002,
рэж. Джон Ву.

Ваенная драма.

Джон Ву, аўтар культавых баевікоў («Зламаная страла», «Бяз твару»), вырашыў зьвярнуцца да вайсковай тэматыкі.

Ваенныя распрацавалі шыфр на аснове мовы індзейцаў наваха. Пехацінец Эндэрс ахоўвае двух шыфравальшчыкаў і мае загад застрэліць іх, калі сытуацыя выйдзе з-пад кантролю.

У фільме здымаліся Нікалас Кейдж («Бяз твару», «8 мм»), Крысьціян Слейтэр («Сапраўднае каханьне»).

Фільм атрымаў узнагароды за найлепшую працу каскадэраў.

**Андрэй Расінскі**

### ПРЭЗЭНТАЦЫЯ



**Народзіны Манюшкі**

**5 траўня** ў Музэі тэатру і музыкі (Музычны завулак, 5 — за Палацам Рэспублікі) адбудзецца прэзэнтацыя альбому Станіслава Манюшкі на вершы Яна Чачота «Песьні з-над Нёмну й Дзьвіны», прысьвечанага дню нараджэньня кампазытара. Альбом выйшаў у сэрыі «Беларускі музычны архіў», заснавана «БМАgroup». Мэта сэрыі — вярнуць у музычную спадчыну краіны забытыя імёны.

У прэзэнтацыі бяруць удзел Віктар Скарабагатаў, Уладзімер Мархель, Галіна Каржанеўская і інш. Уваход вольны. Пачатак а 17-й. Даведкі па т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.

### ВЫСТАВЫ

**Кульмінацыя — конкурс зваршчыкаў**

**З 11 да 14 траўня** ў выставачным павільёне НВЦ «Белэкспа» на Машэрава, 14 пройдзе Беларускі прамысловы форум. У праграме: VII Міжнародная прамысловая выстава «Белпрамэкспа», VIII Міжнародная спэцыялізаваная выстава «Энэргаі рэсурсазахаваньне», V Міжнародная спэцыялізаваная выстаўка «Зварка і рэзка», а таксама VIII Міжнародны сымпозіюм «Тэхналёгіі — абсталяваньне — якасьць».

12 траўня на выставе адбудзецца конкурс зваршчыкаў (з 9-й да 16-й гадзіны).

**Пакажу ўсе вам чары**

Да **15 траўня** ў Літаратурным музэі Янкі Купалы працуе выстаўка твораў Беларускага саюзу майстроў народнай творчасьці «Пакажу ўсе вам чары — чары ўсе неба, зямлі...»: саломка, дрэва, выцінанка, кераміка...

**За сьцяной сну**

У мастацкай галерэі «Унівэрсытэт культуры» (Кастрычніцкая пл., 1) **да 18 траўня** працуе выстаўка «За сьцяной сну». Свае работы паказваюць пяць маладых мастакоў — Іван Русачак, Алена Шычко, Раман Сустаў, Алена Воўчак, Максім Трылецкі — і іх творчы кіраўнік, народны мастак Рэспублікі Беларусі Георгі Паплаўскі.

**Хата — мой сусьвет**

У музэі гісторыі беларускай літаратуры (вул. Багдановіча, 15) **да 1 чэрвеня** працуе выстаўка «Хата — мой сусьвет». Тамсама **да 3 чэрвеня** можна паглядзець выстаўку «Доўгія вёрсты вайны».

**Мага**

У галерэі «Вільнюс» (Калініўскага, 55) **да 22 траўня** працуе выстаўка жывапісу «Мага» Аляксея Марачкіна.

**Выстава Куліка**

У сядзібе Партыі БНФ (вул. Варвашэні, 8) працуе выстава выдатнага беларускага мастака Яўгена Куліка (1938—2002). Экспануюцца пад дваццаць графічных лістоў мастака.

**Культурная спадчына Беларусі**

**Да 1 чэрвеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (вул. Чырвонаармейская, 9, галоўны корпус, 3 паверх) працуе выстаўка «Культурная спадчына Беларусі». На выстаўцы прадстаўлена пад 100 дакумэнтаў, у тым ліку кнігі, паштоўкі, энцыкляпэдыі...

### СПАБОРНІЦТВЫ

**Настольны тэніс**

**8 траўня** ў Менску (вул. Сапёраў, 5) пройдзе супэрфінал камандага чэмпіянату Рэспублікі Беларусі па настольным тэнісе. 9 траўня ў Палацы тэнісу (пр. Машэрава, 63) адбудзецца пераходны турнір. Пачатак а 10-й.

### ІМПРЭЗЫ

**Вялікдзень і Юр’я**

**5 траўня** ў чытальнай залі Унівэрсытэту культуры (вул. Рабкораўская, 17) адбудзецца сустрэча, прысьвечаная беларускім сьвятам Вялікдзень і Юр’я. Выступіць беларускі нав укове ц, укладальніца энцыклапэдычнага слоўніка «Беларуская міталёгія» Лія Салавей і айцец Аляксандар Шрамко. Пачатак а 17-й гадзіне.

**Белдзяржфілярмонія**

Вялікая заля

**6** (пт), 19.00 — монаспэктакль паэтычнага тэатру «Зьніч» «Мой маленькі прынц».

Заля камэрнай музыкі

**6** (пт) — інструмэнтальная музыка XVII стагодзьдзя ў выкананьні саліста Сымфанічнага аркестру акадэмічнага Вялікага тэатру опэры і балету.

**7** (сб) — вечар камэрнай музыкі.

**Адлюстраваньне першатвору**

**16 траўня** а 19-й у Доме літаратара адбудзецца прэзэнтацыя новай кнігі пісьменьніка Пятра Васючэнкі «Адлюстраваньне першатвору». Чакаюцца выступы герояў літаратурнай крытыкі аўтара — пісьменьнікаў У. Арлова, З. Вішнёва, А. Глёбуса, Л. Дранько-Майсюка, Л. Рублеўскай, В. Трэнас, А. Федарэнкі, В. Шніпа, музычных гуртоў «Брама», «Джамбібум», «Жаба ў каляіне». Пятро Васючэнка будзе разважаць па літаратуру й жыцьцё, дзяліцца прагнозамі й прадказаньнямі, раскрываць літаратурныя таямніцы, апраўдвацца перад пакрыўджанымі аўтарамі, страшыць і сьмяшыць.

### ТЭАТРЫ

**Опэра**

**5** (чц) — «Чароўная флейта».
**6** (пт) — сьвяточны канцэрт «Памяць сэрца».
**14** (сб) — «Мадам Батэрфляй».
**15** (ндз) — «Сэвільскі цырульнік».

**Тэатар Янкі Купалы**

**5** (чц) — «Памінальная малітва».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**5** (чц) — «Містэр розыгрыш».
**6** (пт) — «Палёты з анёлам».
**7** (сб) — «Кабала сьвятош».
**8** (ндз) — «Трыбунал».
**11** (ср) — «Адвечная песьня».
**12** (чц) — «Нязваны госьць».
**13** (пт) — «Адэль».
**14** (сб) — «Валянціна».
**15** (ндз) — «Чорны квадрат».
**для дзяцей**
**15** (ндз) — «Воўк-мараплавец».

**Тэатар імя Горкага**

**5** (чц) — «Адзіны спадчыньнік».

**Новы драматычны тэатар**

**5** (чц) — «Ня бойся быць шчасьлівым».

**Тэатар-студыя кінаактора**

**5** (чц) — «Назаўсёды ў памяці».

### КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**X-Ray** (223-93-55)

**6** (пт), 22.00 — La Terraza*05: Jay Hannan (Underdog, UK): адкрыцьцё летняй тэрасы.
**7** (сб), 23.00 — dj-bar.

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)

**6** (пт), 22.30 — жывая музыка.
**8** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.

### КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Уцёкі»*** (прэм’ера): **6** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **7, 8** (сб, ндз) 13.50 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **6** (пт) 18.50, 21.10; **7** (сб) 14.00, 18.50, 21.10.
«Бой зь ценем»: **8** (ндз) 13.30, 16.00, 18.30, 20.50.
«Чырвонае неба» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **6, 7** (сб, ндз) 16.30.
«Неслужбовае заданьне» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **8** (ндз) 11.30.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Ад 180 і вышэй»: **6** (пт) 16.30 (іл), 18.50 (іл), 21.00; **7, 8** (сб, ндз) 16.30 (іл), 18.50, 21.00.
«Выбух на досьвітку» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **6** (пт) 12.00; **7** (сб) 14.00.
«У жніўні 44-га» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **8** (ндз) 14.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Змотвай вуды»***: **6** (пт) 18.30 (іл), 20.40; **7** (сб) 17.00 (іл), 19.10, 21.00.
«Сахара» (2с): **8** (ндз) 16.00 (іл), 18.20, 20.30.
«Мама, я жывы...» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **6** (пт) 15.00.
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Уцёкі»*** (прэм’ера): **6—8** (пт—ндз) 16.40, 21.00.
«Глыбокая плынь» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі; прэм’ера): **6—8** (пт—ндз) 14.50 (іл), 19.00.
**«Масква»** (203-14-48)
«Уцёкі»*** (прэм’ера): **6** (пт) 16.30, 18.50, 21.10; **7, 8** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.10.
**«Мір»** (288-22-33)
«Ад 180 і вышэй»: **6—8** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.10.
«Сахара» (2с): **6** (пт) 16.00, 18.20, 20.40; **7** (сб) 13.40 (іл), 16.00, 18.20, 20.40.
«Правілы здыманьня: Хітчаў мэтад»: **8** (ндз) 16.00, 18.20, 20.40.
«Вам — заданьне» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **8** (ндз) 13.00.
**«Перамога»** (203-77-66)
«Ад 180 і вышэй»: **6, 7** (пт, сб) 19.00, 21.00.
«Жаніх напракат»: **8** (ндз) 15.00, 21.00.
«Турэцкі гамбіт»: **8** (ндз) 18.50.
«Глыбокая плынь» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі; прэм’ера): **6, 7** (пт, сб) 15.00 (іл), 17.00; **8** (ндз) 17.00 (іл).
**«Піянер»** (227-64-87)
«Жаніх напракат»: **6** (пт) 18.40, 21.00; **7** (сб) 15.00, 19.00, 21.00.
«Давайце патанцуем»: **8** (ндз) 19.00.
«Летуценьнікі»***: **8** (ндз) 21.00.
«Вам — заданьне» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **6, 7** (пт, сб) 13.00.
«Гонар маю» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **8** (ндз) 15.00.
«Выбух на досьвітку» (да 60-годзьдзя Вялікай Перамогі): **8** (ндз) 17.00.
**«Цэнтральны»** (200-34-16)
«Сахара» (2с): **6** (пт) 11.00, 13.30, 15.50, 18.30, 21.00; **7, 8** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.




### КІНО ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**«Аўрора»**
«Шалёныя скачкі» (прэм’ера): **7, 8** (сб, ндз) 11.50.
**«Берасьце»**
«Гарфілд»: **7, 8** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Шчаўкунок»: **6** (пт) 12.00; **7** (сб) 11.00, 13.00.
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **8** (ндз) 11.00, 13.00.
**«Масква»**
«Я — расейскі салдат» («Выхадны — усёй сям’ёй!»): **8** (ндз) 12.00.
**«Мір»**
«Дзеці шпіёнаў-3D: гульня скончана»: **7, 8** (сб, ндз) 14.00.
«Шалёныя скачкі» (прэм’ера): **8** (15.00).
**«Перамога»**
«Супэрсямейка»: **7, 8** (сб, ндз) 12.30.
**«Піянер»**
«Алёша Паповіч і Тугарын Зьмей»: **6** (пт) 11.00; **7** (сб) 11.00, 17.00.
«Пінокіё-3000»: **8** (ндз) 11.00.
«Зачараваная Эла»: **8** (ндз) 13.00.

### КІНО НА DVD

MASTER RECORDS

**Цудоўны Ўілбі**

Трагікамэдыя, Канада, 2004, рэж. **Дэніэль Макайвэр**
У ролях: **Джэймз Эладзі, Рэбэка Джэнкінз**
На востраве Ўілбі ёсьць каханьне, разьбітыя сэрцы і нат свае дэтэктыўныя зловы...

**Шоў стагодзьдзя**

Сюррэалістычная камэдыя, ЗША, 2004, рэж. **Лары Чарлз**
У ролях: **Джэф Брыджэз, Пэнэлопа Крус, Боб Дылан, Джэсыка Ланг**
У краіне, зьнямоглай ад вайнаў, урад вырашае правесьці дабрачынны канцэрт. Справа за зоркамі... Фільм — сэнсацыя фэстываляў у Сандэнсе.
**Менск, Кісялёва, 12, т.: 643-21-08**

### КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

## Уцёкі «сынковага кіно»



«Уцёкі» («Побег»)
Расея, 2005,
каляровы і ч/б, 110 хв.
**Жанр:** баявік, трылер
**Адзнака:** 4 (з 10)

Толькі гультай не параўноўваў расейскага фільму «Ўцёкі» Ягора Міхалкова-Канчалоўскага (сына Андрэя Канчалоўскага) з амэрыканскім «Уцекачом»: у абодвух фільмах ёсьць лекар, ілжыва абвінавачаны ў забойстве жонкі (у Канчалоўскага — Яўген Міронаў, у амэрыканцаў — Харысан Форд), ёсьць уцёкі і прынцыповы перасьледнік (Аляксей Серабракоў як расейская інкарнацыя Томі Лі Джонса), ёсьць бойкі і выкрыцьцё злачынцы.

Калегі з аўтарытэтнага сайту www.kino-govno.com з радасьцю знайшлі ў карціне шмат цікавага, але лепей параўноўваць фільм не з галівудзкім арыгіналам, а з «татавым кіно».

«Татава кіно» (Андрэй Канчалоўскі, Мікіта Міхалкоў, Сяргей Бандарчук) — кіно аўтарскае, масавае, імпэрскае — і не бяз таленту. «Сынкова кіно», якое ўзышло ў часы перабудовы (Ягор Канчалоўскі, Фёдар Бандарчук, Дзяніс Еўсьцігнееў), — гэта манерныя намёкі на аўтарства, халоднае рамесьніцтва без душы і пляствікавая, «модная» імітацыя жанру.

«Уцёкі» Ягора Канчалоўскага ў параўнаньні зь ягонымі «Антыкілерамі» — сапраўдны крок наза д.

Аўтамабільныя пагоні й палёты машын — як у «Антыкілеры», камэра шморгае й дрыгаецца, мантажныя заіканьні паўтараюцца зноў і зноў — але не таму, што такая патрэба, а таму што мусіць быць модны прыём.

Глямурная карцінка апэратара Антона Антонава — як у рэкляме пракладак: сухая і чысьценькая, нябесная; але ў парушэньне стылю — чорна-белыя карцінкі трызьненьняў. У гэтых трызьненьнях герою зьяўляецца забітая жонка і з фразаю «Ты ведаеш» ласкава ўсьміхаецца.

Інтэр’еры ў фільме такія ж «правільныя», як і карцінка: усе героі жывуць надзвычай заможна і нават расейская мядсястра мае дома ноўтбук (!) з доступам у сеціва. Маёмасная «ўпакаванасьць» — абавязковае правіла шчасьлівага рэклямнага сьвету «сынкоў».

У такім стэрыльным асяродзьдзі стылістычна бездакорнымі выглядаюць толькі кемпавая бабулька з абрэзам і нафарбаваная прастытутка з заточкай.

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Лётас Мартынава



Дзейнасьць МЗСу нагадвае адну дзіцячую гульню, дзе кіндэрам прапануецца пабудаваць з асобных напісаных на картках словаў лягічны сказ. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Усе нашы абломы ад таго, што мы фармальна, калі не абыякава, ставімся да Ягоных геніяльных інструкцый. Так, днямі Ён канкрэтна прапісаў, што антыбеларускія мэсыджы лідэраў ГУУАМу трэба ўспрымаць па-філязофску.

Такое ўражаньне, што клеркі нашага МЗСу згаданага прагону ўвогуле ня чулі — ці то ў іх прыступ сэнсорнай афазіі, ці то падчас трансьляцыі ўсім міністэрствам пераключыліся з БТ на спадарожнікавы канал, дзе «Мілян» весела апускаў «Парму».

Прынамсі, мяркуючы па апошніх эмзээшных дакумэнтах, аніякіх зьмен у працы беларускага Ке д'Арсэ не назіраецца.

Дзейнасьць роднага МЗСу ўсе больш нагадвае адну дзіцячую гульню, дзе кіндэрам прапануецца пабудаваць з асобных напісаных на картках слоў лягічны сказ. Лічыцца, што падчас гульні ў дзяцей афігіцельна разьвіваецца ай-к'ю.

Падаецца, падобнай гульнёй забаўляюцца і ў канторы Мартынава, хіба што з той розьніцай, што словы ў картках амаль не мяняюцца.

Зранку дыпляматы прыходзяць на працу і складаюць ноты пратэсту шляхам ператасоўваньня адзінак свайго слоўнікавага гербарыю: «двайныя стандарты», «скажоныя лінзы», «тэндэнцыйны погляд», «мова ціску», «праплачаная праваакцыя».

Як прыклад — рэакцыя на заяву грузінскага прэзыдэнта і парляманту. Як вядома, каўказцы напярэдадні збору прэзыдэнтаў ГУУАМ заявілі: «Мы лічым, што беларускі народ мае права на свабоду выбару, свабоду выказваньняў, свабоду слова, свабоду весьці палітычную дзейнасьць». На гэта нашы дыпляматы хуценька склалі чарговую ноту пратэсту.

Чытаць яе гэтак жа сумна, як глядзець дваццатую частку «Сківіц». Усё хадульна і, галоўнае, прадказальна: акула пасьнедае ўсімі, акрамя галоўнага героя.

Дарагія беларускія Мэтэрніхі і Талейраны, каб не было крызісу жанру, трэба больш уважліва слухаць роднага прэзыдэнта. Калі б вы паставіліся да слоў грузінскага лідэра па-філясофску, усё выглядала б інакш.

Катэгорыя «мецъ», зь якой так носіцца Саакашвілі, — гэта звычайны маральны ўтылітарызм, які Эрых Фром выдатна разграміў у «Мець або існаваць».

Натуральна, адказ Мартынава павінен быць філязофскім опусам. Напрыклад:

«Шаноўны Саакашвілі. Нас вельмі зацікавіла прапанаваная Вамі канцэпцыя модусу быцьця, аднак яе ідыяматычныя аспэкты насьцярожваюць. А што калі паглядзець на праблему выбару ў кантэксьце ідэі экзыстэнцыяльнага і прац позьняга Тамаша Аквінскага? Чакаем адказу. Ваш МЗС РБ…» — і г.д.

Відавочна, атрымаўшы такое мыла, віцязь у тыгравай шкуры ў наступны раз яшчэ сто разоў падумае, ці зьвязвацца яму са славянскім волатам.

А яшчэ лепей адказваць у фармаце японскага хайку:

### Правы чалавека

Нават у жука ёсьць крылы
Месяц уначы як корак
Зь вітаньнем, беларускі МЗС




PHOTO.BYMEDIA.NET

**ХРЫСТОС УВАСКРОС, таварышы салдаты.** Велікодны стол у адной з вайсковых частак Барысава.

ЦЫТАТА


Государственное учреждение "Минское эксплуатационное управление Вооруженных Сил" проводит конкурс подрядных организаций на производство проектных и монтажных работ по установке приборов учета холодной войны.
Тел. 202-52-23, тел./факс 202-84-55.

Надрукавана ў «Белорусская военная газета» № 77 за 2005 г.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СПОНСАРЫ ДЛЯ СЬВЯТА ПАЭЗІІ

**Шукаю прыватных спонсараў** для забесьпячэньня мінімальных умоў правядзеньня Сьвята вольнай беларускай паэзіі «Ляўкі-2005» 9—10 ліпеня. Агулам патрэбна 150 у.а. Ананімнасьць гарантую. Пісаць на e-mail: lauki2005@yahoo.ie. Віктару

### КАНТАКТЫ

**«Малады фронт»** за Беларусь! Далучайся! www.mfront.net

**Сьвядомы беларус** здыме пакойчык у Менску. Аплата гарантуецца. Т.: 01777-576-69. Сяржук

**Хлопец-гей**, 25 гадоў, в/а, шукае бацьку і сябра ў адной асобе. А/с 86, 220079, Менск-79

### КНІГІ

**Шукаю «Прыгоды Швейка»** Я.Гашка па-беларуску. Т.: 757-40-63

**Буду ўдзячны таму,** хто прадасьць 4-ты том «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі». Т.: 288-14-52, 8-029-328-56-78. Аляксей

**Кнігу Югасі Каляды** «Галоўная памылка Афанасія» можна набыць, пазваніўшы на тэл.: 400-45-91, 643-57-33, у Гомелі — 430-96-98

**«Нацыяналізм** у XX стагодзьдзі» Э.Сьміта, «Курапаты», «Беларуска-расейская вайна» Зянона, музыка ды фільмы на CD, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (13.00—19.00). Т.: 8-029-707-40-01

**Прадам** слоўнікі В.Ластоўскага, Я.Станкевіча, М.Байкова-С.Некрашэвіча. Т.: 234-93-71, 707-70-01. Сяржук

**Прадам кнігі**: Ю.Туронак, «Беларусь пад нямецкай акупацыяй»; К.Акула, «Змагарныя дарогі»; Я.Чачот, «Наваградзкі замак»; «К.Каліноўскі» з сэрыі «Беларускі кнігазбор»; «Я.Карскі»; «Беларускі арнамэнт»; багаты выбар кніг па гісторыі, архітэктуры, мовазнаўстве, этнаграфіі. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі:** Я.Сямашка, «Армія Краёва»; А.Вініцкі, «Матэрыялы да гісторыі беларускай эміграцыі ў Нямеччыне»; В.Грыцкевіч, «Гісторыя і міты»; Я.Запруднік, «Беларусь на гістарычных скрыжаваньнях»; Л.Геніюш, «Ад родных ніў», факс. выд. 1942 г., Прага, ды інш. Т.: 753-70-05

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Канстанціну К. зь Віцебску.** Друкаваць ня будзем. Ня наша па жанры й стылі.

**Л.Крывейту зь Менску.** Ідэю перавыданьня «Мроі» перадалі выдаўцу музыкі В.Супрановічу.


**Запрашаем наведаць Камянец-Падольскі** і **Хацін** (Украіна)



з **13** да **16 траўня**.

Вас чакае экскурсія па гістарычнай частцы Камянца, наведваньне Катэдральнага сабору і Старой крэпасьці, а таксама вандроўка па Хацінскай фартэцыі. Вы атрымаеце магчымасьць ня толькі пазнаёміцца з унікальнымі помнікамі архітэктуры і гісторыі, але і пабачыць такую цікавую зьяву прыроды, як крыштылёвые пячоры, а таксама стаць удзельнікам фэсту паветраных шароў.

**Далучайцеся да нашых вандровак!**

Тэлефон для даведак: 222-46-51.

**Запрашаем у падарожжа**

**7—10 траўня**
**Львоў—Крэхіў—Жоўква—Карпаты.**
35 эўра.

**15 траўня**
**Менск—Смургоні—Залесьсе—Ашмяны—Жупраны—Гальшаны—Баруны—Крэва—Менск.**
35 эўра.

Т.: 279-05-85, 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 364-12-38, 776-24-35 (Павал)



**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько

нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар — Андрэй Чык
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**



© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.



12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3437. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 04.05.2005.
Замова № 2609.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а